Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я  Г А З Е Т А

17 МАЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 90
(26203)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У ДРУГІМ ПАЎГОДДЗІ!

**Ідзе падпіска на II паўгоддзе і III квартал 2008 года**

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы | на 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 9200 | 27600 | 55200 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8700 | 26100 | 52200 |
| 63858 (ведамасны) | 14700 | 44100 | 88200 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 13400 | 40200 | 80400 |

Прамая лінія

## КАЛІ Ў ВУШАХ ШУМІЦЬ І ЗВІНІЦЬ

Згодна са статыстыкай, ад 4 да 6 працэнтаў жыхароў нашай планеты пакутуюць ад тых ці іншых парушэнняў слыху. Якія асноўныя прычыны ўзнікнення захворванняў вуха? Ці можна папярэдзіць заўчаснае аслабленне слыху? Наколькі эфектыўныя сучасныя слыхавыя апараты? Што рабіць, калі ў вушах шуміць і звініць?

На гэтыя і іншыя пытанні падчас нашай чарговай «прамой лініі» адкажа **загадчыца дарослага сурдалагічнага аддзялення Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і мовы Ніна Юр'еўна КАСЦЮК.** ***«Прамая лінія» адбудзецца 20 мая, у аўторак, з 16.30 да 18.00 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах: 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).***

## ПЕРАМОЖАМ ЖАНОЧЫ РАК

На пытанні адкажуць **загадчыца аддзела анкагінекалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук Ірына Аляксандраўна КАСЭНКА і загадчык аддзела анкамамалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар Леанід Аляксеевіч ПУТЫРСКІ.**

***Свае пытанні вы можаце пакінуць у рэдакцыі газеты па нумары 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) да 17 мая.***

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## *«Вячоркі» за музейнымі кроснамі*

Наша даўняя падпісчыца — з 1951 года — з вёскі Лаўніца Барысаўскага раёна, кавалер ордэна Кастрычніцкай рэвалюцыі **Клаўдзія КАПЫЛЬСКАЯ** перадала свае кросны ў этнаграфічны музей пры вясковым цэнтры культуры. Але гэты экспанат... «жывы». Раз-пораз Клаўдзія Паўлаўна дэманструе (на фотаздымку) сваё майстэрства аднавяскоўцам і ўсім, хто цікавіцца народным мастацтвам.

*Працяг музейнай тэмы — на 6-й старонцы.*

БЕЛАРУСБАНК

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,**

*расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,*

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 22 МАЯ 2008 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

***1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.***

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 20 мая), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 22 мая) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней — до 20 мая 2008 года.**
**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 87 72.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 29.10.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

Сустрэчы

## «Не трэба плакаць, што мова гіне...»

**...На тым Дні падпісчыка ў сталічным паштамце нашых адданых чытачоў, сяброў, фанатаў было няшмат, таму, напэўна, запомніўся кожны. Хто чым. Лілія Мяфодзьеўна Пятрова — выкладчыца беларускай мовы з факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі БДПУ імя Максіма Танка, апроч іншага — сваёй прапановай сустрэцца яшчэ, у тым ліку — з будучымі студэнтамі.**

**Хто б быў супраць?.. Мы — ніколі...**

Люду (а ўжо маладога, прыгожага!) на сустрэчу са старэйшай беларускай газетай сышлося шмат. Слухалі ўважліва. Спачатку — саму Лілію Мяфодзьеўну, якая пра «Звязду», здавалася, можа гаварыць бясконца. Бо, па-першае, глыбока паважае яе за ўсё, што яна (за свае 90!) зрабіла для роднага краю, бо пастаянна знаходзіць на яе старонках інфармацыю, патрэбную не толькі для працы, але і для душы, для вядзення хатняй гаспадаркі, бо цудоўна ведае ўсе газетныя рубрыкі і — завочна — усіх журналістаў, бо аднойчы выйграла звяздоўскі веласіпед, які служыць сям'і дагэтуль...

***(Заканчэнне на 4-й стар.)***

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**ОАО «Автоторгсервис» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже административно-хозяйственного здания (2-этажное, кирпичное) об. пл. 362,0 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 96. Начальная цена с НДС – 1 346 186 858 белорусских рублей. Площадь земельного участка – 0,1000 га. Объект продается без условий. Задаток 5 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **17 июня 2008 г.** в 12.00 по адресу: г.Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16 июня 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Телефон (8017) 224 61 34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ:**

- имущества ОАО «Червенского молочного завода» (пл. зем. уч. 3,47 га), в т. ч.: корпус завода (2 431,4 кв.м), адм. здание (442,4 кв.м), склад казеина (121, 5 кв.м), мастерские (общ. пл. 269, 2 кв.м), склады (151,3 кв.м и 172,8 кв.м), гаражи (общ. пл. 301,8 кв.м) и др.;
- имущества по адресу: Солигорский р-н, г.п. Старобин, ул. Краснознаменная, 87 (пл. зем. уч. 1,3026 га), в т. ч.: площадка с навесом (843 кв.м), гараж (387,4 кв.м), здание пилорамы (258,8 кв.м), здание лесопильного цеха (245,3 кв.м), адм. здание (70,8 кв.м), кузница (48 кв.м), сушильная камера (13 кв.м), проходная (8 кв.м), забор железобетонный (484 п.м), и др.;
- здания магазина (общ. пл. 199 кв.м), г. Мядель, ул. Крупской, 8. Пл. зем. уч. 0,0760 га.;
- АБК (789,2 кв.м) по адресу: г. Любань, ул. Боровика, 50;
- здания конторы торговой базы (227,6 кв.м), г. Любань, ул. Кирова, 90;
- здания ателье № 5 (155,0 кв.м) по адресу: г. Слуцк, ул. Жукова, д. 21. Пл. зем. уч. 0,0595 га;
- здания столовой (686,9 кв.м), Воложинский район, д. Гончары.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

на право заключения договора аренды земельного участка общей площадью 10,0000 га сроком на 50 лет для строительства производственного объекта различного назначения, расположенного в районе д. Раков Воложинского района. Начальная цена предмета аукциона — 1 193 350 000 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.03.2008 г. **Аукцион состоится 27.05.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.05.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.** УНП 690324015

# БЕЛАРУСЬ ВА ЎЗАЕМААДНОСІНАХ З ЕЎРОПАЙ ПРАПАНУЕ ЗЫХОДЗІЦЬ З РЭАЛІЙ, А НЕ ДВАЙНЫХ СТАНДАРТАЎ

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Рэйтэр».**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Задушыць сёння краіну не атрымаецца, гэта немагчыма».

«У Беларусь з Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна масіравана ідуць інвестары, перш за ўсё Кітай. Мы ім адчыняем дзверы. Не хочаце вы — прыйдуць іншыя, калі гэта нам будзе патрэбна. Канкурэнцыя ў свеце каласальная, і «белых плямаў» на карце свету ў эканамічных адносінах быць не можа. Таму давайце будаваць нармальныя адносіны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Але мы павінны выходзіць не з двайных стандартаў, а бачыць свет у рэаліях і ў адпаведнасці з гэтым дзейнічаць, мы да гэтага гатовы, — адзначыў Прэзідэнт. — Вам што, патрэбны ў цэнтры Еўропы, нашага агульнага дома, ачаг напружання? Упэўнены, што не патрэбны, нават Вялікабрытаніі. І Еўропа ніколі не пойдзе на тое, каб дэстабілізаваць гэту краіну. Мы гэта цэнім, і гатовы ў гэтым напрамку адэкватна дзейнічаць. Калі вы гатовы, давайце з заўтрашняга дня пачынаць».

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ціснуць на Беларусь — контрпрадукцыйна.

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што ў нас «сёння няма ніводнага палітычнага зняволенага». «Што датычыцца тых, хто гаворыць аб быццам бы існуючай праблеме палітзняволеных, то гэта, вядома ж, не іх справа. Няхай разбяруцца са сваімі зняволенымі на базе ў Гуантанама. У Іраку, Афганістане колькі гіне людзей. Таму ў сябе няхай разбяруцца. З другога боку, нам не хацелася б з-за якіх-небудзь траіх, пяцярых, або шасцярых (іх было шасцёра, як яны называлі) ствараць праблемы для краіны. І правільна або няправільна, але мною было прынята рашэнне ў рамках Канстытуцыі вызваліць іх. Пяцёра выкарысталі гэта, шосты згадзіўся, потым адмовіўся. А нядаўна ён заявіў (і гэта інфармацыя ў нас на руках): чым больш я буду ў турме, тым вышэйшы будзе мой рэйтынг у народзе, — і да прэзідэнцкіх выбараў у мяне будзе рэйтынг у два разы вышэйшы, чым у дзеючага Прэзідэнта. Ну што ж, няхай расце ў яго рэйтынг, я ж яго за вушы цягнуць не буду адтуль. Таму паверце, гэта не пытанне. І не ў іх справа», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Калі б Беларусь мела вялізныя нафтавыя запасы, то вы так сябравалі б з намі, і ў нас была б такая дружба, як прыкладна ў амерыканцаў з Саўдаўскай Аравіяй і іншымі краінамі, дзе нафтавыя запасы і плюс яшчэ ў некаторых дзяржаў ёсць ядзерная зброя. Таму вы з усімі сябруеце, і вось гэта ваша дэмакратыя і стандарты, пра якія вы гаворыце. Цяжка сказаць, што гэта двайныя стандарты, гэта ўжо трайныя стандарты і, можа, больш. Мы гэта бачым і разумеем, і аб гэтым трэба шчыра гаварыць, калі вы прэтэндуеце на сумленнасць і прыстойнасць. Вы ад нас адгародзеецеся: мы вам віз не дадзім, у Еўропу не пусцім. А мы вам не будзем забараняць уезд у Беларусь — прыязджайце да нас, нам гэта выгадна. Вы Савецкі Саюз заўсёды крытыкавалі, што жалезную заслону выбудавалі вакол сябе. Ну, а вы цяпер чым займаецеся? Чым мы вас так напалохалі, што вы забараняеце ўезд у Вялікабрытанію, іншыя краіны Еўрапейскага саюза? Вы праводзіце абсурдную палітыку. Мы для вас робім усё для таго, каб не ствараць вам праблем, не павялічваць іх, у вас іх дастаткова. А вы праводзіце абсурдную палітыку ў адносінах да нашай краіны. І вы яшчэ гаворыце, што мы павінны зрабіць, каб нармалізаваць з вамі адносіны? Пытанне трэба не так ставіць. Трэба ставіць пытанне так: што вы, еўрапейцы, зробіце, каб нармалізаваць адносіны з беларусамі?» — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь развівае ўзаемавыгадныя эканамічныя адносіны са многімі дзяржавамі свету, дыверсіфікуючы свой экспарт. І ўжо відаць рэальныя вынікі гэтай работы.

Аляксандр Лукашэнка адзначае добрыя ўзаемаадносіны з новым прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым. Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў: «Да гэтага часу і, думаю, у будучым у нас будуць такія ж дружалюбныя і цёплыя адносіны з цяперашнім прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі Дзмітрыем Мядзведзевым. Сапраўды, колькі мы ні сустракаліся, не было ніякіх праблем. Мы сябры, і гэтым усё сказана. Што датычыцца звязкі «Пуцін — Мядзведзеў», гэта іх, расійскія праблемы. Упэўнены, што яны заўсёды знойдуць агульны пункт погляду, заўсёды будуць дзейнічаць у адзіным ключы».

«У Венесуэле, Іране і асабліва ў В'етнаме я бачыў кампаніі Вялікабрытаніі і іншых краін, а ў вас з імі не лепшыя дыпламатычныя адносіны. У нас з гэтымі дзяржавамі лепшыя кантакты, дык чаму мы не павінны гэта выкарыстоўваць? Нам выгадна супрацоўнічаць з імі. Гэта багацейшыя дзяржавы, якія сёння здабываюць вялізную колькасць вуглевадароднай сыравіны. Мы не так маштабна ідзём у Вялікабрытанію, таму што мы, напэўна, не вельмі патрэбны гэтай краіне. Ну, чаго нам ламіцца ў зачыненыя дзверы? Пры гэтым Вялікабрытанія займае першае месца па інвестыцыях у Беларусь, значыць, ёй тут выгадна і цікава, мы для вас адчыняем дзверы», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка не выключае магчымасці балаціравацца на чарговы прэзідэнцкі тэрмін. У інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Рэйтэр» Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў: «Калі сітуацыя будзе такая, як цяпер, і са мной асабіста, таму што мне давядзецца балаціравацца, і ў краіне, то, вядома, я буду балаціравацца Прэзідэнтам на чарговы тэрмін. Калі сітуацыя са мной асабіста зменіцца, і ў краіне яна, не давядзі Бог, зменіцца, то, вядома, сітуацыя будзе іншая, і рашэнне будзе іншае. Пакуль што я здаровы чалавек, быццам бы не так ужо вельмі мяне народ крытыкуе, і Захад пачынае разумець, таму гэта цалкам магчыма. Але да гэтага трэба дажыць, гэта я вам шчыра кажу».

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# АДКРЫЦЦЁ ЗАВОДА ГАЗЕТНАЙ ПАПЕРЫ Ў ШКЛОВЕ — РЭАЛЬНАЕ ВЫКАНАННЕ ДЗЯРЖПРАГРАМЫ РАЗВІЦЦЯ МАЛЫХ ГАРАДОЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання ААТ «Папяровая фабрыка «Спартак» у Шклове даручыў завяршыць рэканструкцыю гэтага прадпрыемства да мая 2010 года.**

Пачнецца тэхнераўзбраенне ў гэтым годзе. Інвестыцыйны кошт праекта ацэньваецца ў $34,1 млн. У прыватнасці, на фабрыцы будзе ўстаноўлена папераробная машына па выпуску канкурэнтаздольнай паперы санітарна-гігіенічнага прызначэння, а таксама сучасная машына па вытворчасці гафрыраванага кардону, абсталяванне па выпрабу скрынак з яго. Для рэалізацыі праекта плануецца прыцягненне крэдытных рэсурсаў у аб'ёме $15 млн на 4—5 гадоў. Усё гэта дасць магчымасць павялічыць рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі з цяперашніх 7 працэнтаў да 17—20 працэнтаў у перспектыве.

Работа завода газетнай паперы ў Шклове забяспечыць рацыянальнае выкарыстанне сыравінных рэсурсаў. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на адкрыцці РУП «Завод газетнай паперы» ў Шклове.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Мы раней балансавую драўніну вывозілі ў Калінінград, цяпер гэту драўніну будзем перапрацоўваць тут».

Паводле яго слоў, у Шклове створана прадпрыемства замкнёнага цыкла: шчэпкі ідуць на вытворчасць паперы, кара — на абагаванне тэрытэрыі. Таксама паралельна вырабляюцца зборныя драўляныя дамы і клееныя вырабы з драўніны. «Плануецца ў будучым годзе выпускаць 250 драўляных дамоў сядзібнага тыпу», — паведаміў Прэзідэнт. Палавіна лёгкай мелаванай паперы, што будзе вырабляцца на заводзе газетнай паперы ў Шклове, пойдзе на экспарт.

«Мы не толькі насыцім унутраны рынак гэтай прадукцыяй, але і плануем палавіну яе прадаваць на міжнародных рынках, і магчымасці для гэтага ёсць, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Сёння краіны СНД, Блізкага Усходу гатовы купляць шклоўскую паперу. Адпаведныя перагаворы вядуцца і з Іранам».

У перспектыве Прэзідэнт не выключае магчымасці продажу гэтага прадпрыемства замежнаму інвестару.

Адкрыццё завода газетнай паперы ў Шклове з'яўляецца рэальным выкананнем дзяржаўнай праграмы развіцця малых і сярэдніх гарадоў Беларусі, заявіў Прэзідэнт краіны.

Паводле яго слоў, сённяшняе мерапрыемства значнае для рэспублікі і сведчыць аб тым, што дзяржаўная праграма развіцця малых гарадоў і пасёлкаў рэалізуецца.

«Мы пабудавалі гэтыя вытворчасці, даручылі да канца будучага года поўнасцю рэканструяваць старую фабрыку («Спартак». — Заўвага БЕЛТА)», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, ён паведаміў, што ў бліжэйшы час у Шклове будзе пабудаваны новы малаказавод.

Пэўнае развіццё атрымала і сацыяльная сфера. У прыватнасці, для работнікаў завода газетнай паперы пабудавана два дамы (120 кватэр). Такім чынам, працаваць сюды могуць прыязджаць спецыялісты з іншых раёнаў рэспублікі, а таксама з-за мяжы.

У Беларусі ўжо рэанімаваны буйныя і сярэднія прадпрыемствы, і на працягу бліжэйшых 2-3 гадоў неабходна завяршыць гэты працэс у малых і сярэдніх гарадах.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Беларусь павінна максімальна выгадна выкарыстоўваць існуючыя прыродныя рэсурсы, перш за ўсё лес. Ён адзначыў, што завод газетнай паперы ў Шклове ўяўляе сабой вытворчасць сусветнага ўзроўню, прычым яна мае бесадходны цыкл работы. «Гэта валютны праект, зароблены грошы пойдуць на развіццё Шклоўскага раёна», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Раней на сотні мільёнаў долараў мы завозілі з-за мяжы тое, што маглі рабіць у сябе», — сказаў Прэзідэнт і растлумачыў, што ў Беларусі ёсць неабходныя лясныя рэсурсы для развіцця такой дрэвапрапрацоўчай вытворчасці. «Было прынята рашэнне аб тым, што наша багацце — лес — мы не будзем вывозіць за межы краіны, прадаваць за капейкі», — дадаў ён.

Завод газетнай паперы ў Шклове пабудаваны замест 5 гадоў за 2 гады. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, тэрміны будаўніцтва былі скарочаны, таму што ў іншым выпадку гэта вытворчасць абышлася б у некалькі разоў даражэй.

«Завод ёсць. Трэба пачынаць работу. Прадпрыемства не павінна спыняцца ні на суткі», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама падзякаваў праекціроўшчыкам, будаўнікам, усім, хто ўдзельнічаў у стварэнні новага прадпрыемства. Асаблівую ўдзячнасць ён выказаў прадстаўнікам замежных кампаній, якія ажыццяўлялі мантаж і наладку абсталявання.

Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным удзяліць прыярытэтную ўвагу развіццю будаўнічай галіны Беларусі. Як падкрэсліў Прэзідэнт, наведваючы аб'екты прамысловасці Шклова, цяпер у свеце назіраецца будаўнічы бум, і Беларусь павінна гэта выкарыстаць.

«У будаўнічую сферу неабходна ўкладаць сродкі ў прыярытэтным парадку», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што ў гэтай пяцігодцы неабходна дабудаваць усе аб'екты згодна з існуючымі планамі.

У час наведвання Шклова кіраўнік дзяржавы наведаў новую дрэваапрацоўчую вытворчасць, якая ўваходзіць у склад РУП «Завод газетнай паперы», дзе вырабляюцца драўляныя дамы і клееныя вырабы з драўніны па сучасных тэхналогіях. Яе вытворчая магутнасць складае 250 камплектаў дамоў, 15 тыс. куб.м шматслойнага клеенага бруса і бэлек, 23,65 тыс.куб.м струганага паганажу ў год. На аб'екце выкарыстоўвалася сучаснае еўрапейскае абсталяванне, у тым ліку з Францыі, Аўстрыі, Літвы.

Як быў праінфармаваны Прэзідэнт, вытворчасць драўляных дамоў з клеенага бруса — вельмі перспектыўны праект. Дом з драўніны — найбольш экалагічнае жыллё, таму што дрэва рэгулюе вільготнасць памяшкання і мае антысептычныя і антытаксічныя ўласцівасці. Для вырабу брусавых дамоў прымяняецца як цэльная, так і клееная драўніна хвойных парод.

Паводле слоў спецыялістаў, існуючае на вытворчасці праграмнае забеспячэнне дае магчымасць распрацаваць індывідуальныя праекты дамоў, якія прапануюцца для будаўніцтва. Як чакаецца, завод выйдзе на поўную магутнасць вытворчасці газетнай паперы — 40 тыс. тон — у 2010 годзе.

Ну і ну!

# ТРАЛЕЙБУС БЕЗ КІРОЎЦЫ

Учора восем адзінак транспарту сутыкнуліся на адной з самых ажыўленых вуліц Брэста — праспекце Машэрава каля васьмі раніцы. Відавочца аварыі брастаўчанін Адам Таболіч праводзіў сына ў музычную школу. «На прыпынку МОПРа, — расказаў Адам Канстанцінавіч, — мы з Лёшам былі ў 7.50. Я хацеў падсадзіць сына ў тралейбус, але заўважыў, што салон машыны пусты. У наступны момант мы звярнулі ўвагу на тое, што вадзіцель тралейбуса папраўляе токапрыёмныя штангі. І раптам гэты тралейбус загудзеў і рвануў з месца. Вадзіцель пабег за машынай, але дзе ж яе дагоніш! Усе на прыпынку так і застылі ў назіранні карціны, як некіруемы тралейбус нёсся на ўсёй хуткасці, сутыкаўся з рознымі машынамі, ад адной пры гэтым нават адляцела кола. Тралейбус ударыўся ў смеццевоз, другі тралейбус, выскачыў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з 50-м аўтобусам. Ад удару тралейбус развярнуўся амаль на 180 градусаў і літаральна заскочыў на тратуар прыпынку з процілеглага боку вуліцы».

Словы відавочцы поўнасцю пацвердзіў камандзір батальёна ДПС абласнога ДАІ Мікалай Коршун, які адразу ж прыбыў на месца здарэння пасля паступлення сігналу. Мікалай Аркадзьевіч у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» прычынай здарэння назваў тое, што вадзіцель тралейбуса не забяспечыў усе меры перасцярогі — не паставіў машыну на ручны тормаз. А на бяду, як вядома, зусім мала трэба. Але, на вялікае шчасце, ніхто з пасажыраў і двух кіроўцаў легкавых машын, «Газелі», смеццявоза ЖКГ, другога тралейбуса не пацярпеў. Цялесныя пашкоджанні атрымалі двое пасажыраў аўтобуса 50-га маршрута, які прыняў удар на сябе. Мужчына дастаўлены ў бальніцу, а жанчына пасля аказання дапамогі адпушчана дадому.

Фота БЕЛТА.

На вялікую ўдачу, своечасова адрэагавалі людзі і паспелі разбегчыся з прыпынку. Якія маглі б быць наступствы, каб некіруемая машына адразу ўрэзалася ў натоўп народу на прыпынку, лепей не гаварыць...

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КОЛЬКАСЦЬ ЗАГІНУЛЫХ У ВЫНІКУ ЗЕМЛЕТРАСЕННЯ Ў КІТАІ ПЕРАВЫСІЛА 22 ТЫСЯЧЫ

**Колькасць афіцыйна пацверджаных ахвяраў землетрасення ў Кітаі дасягнула 22 069 чалавек. Без прытулку засталося больш за 4,8 мільёна чалавек. Афіцыйны Пекін выказаў меркаванне, што агульны лік загінулых можа дасягнуць 50 тысяч чалавек.**

### ВЫСТАЎЛЕНА НА ПРОДАЖ САМАЯ ДАРАГАЯ КВАТЭРА ЛАТВІІ

**У Рызе выстаўлена на продаж кватэра коштам каля пяці мільёнаў еўра. У цяперашні час гэта самая дарагая кватэра ў Латвіі, паведамляе партал «BizNews.lv».**

Кватэра плошчай 600 квадратных метраў знаходзіцца ў ціхім цэнтры Рыгі, на вуліцы Стрэлніеку. Эксклюзіўная 14-пакаёвая кватэра прадаецца не проста пад ключ, а нават з мэбляй, выкрабленай па адмысловым заказе ў адным экзэмпляры. Падлога ў кватэры аздоблена дубовым паркетам, прычым у кожным пакоі — свой арнамент. У ванных пакоях і туалетах падлога з падагрэвам. Акрамя таго, кватэра абсталяваная сучаснай аўдыё- і відэа-тэхнікай, падключаная да Інтэрнэту. Паверх, на якім размешчаная кватэра, абсталяваны аўтаномнай сістэмай падачы вады, сістэмамі вентыляцыі і кандыцыянавання, газавым ацяпленнем.

### КОЛЬКАСЦЬ ЖЫВЁЛ І РАСЛІН СКАРАЦІЛАСЯ НА ТРЭЦЬ ЗА 35 ГАДОЎ

**За перыяд з 1970 па 2005 год колькасць жывёл і раслін на нашай планеце скарацілася больш як на трэць, піша The Daily.**

Паводле атрыманых даных, колькасць папуляцый наземных відаў зменшылася на 25 працэнтаў, марскіх — на 28 працэнтаў і відаў, якія насяляюць прэсныя вадаёмы, — на 29 працэнтаў. Тэмпы вымірання жывёл і раслін не дазволяць краінам Еўрасаюза выканаць узятыя ў 2002 годзе абавязкі прадухіліць змяншэнне біяразнастайнасці на планеце да 2010 года. Галоўнымі фактарамі, якія ўплываюць на колькасць жывых істот, з'яўляюцца змена клімату і дзейнасць чалавека.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.05.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 137,00 |
| 1 еўра | 3 311,17 |
| 1 латвійскі лат | 4 744,67 |
| 1 літоўскі літ | 959,13 |
| 1 чэшская крона | 132,26 |
| 1 польскі злоты | 976,62 |
| 1 расійскі рубель | 89,64 |
| 1 украінская грыўня | 444,98 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 23,8391 |
| 10 UAH | 48,3611 |
| 1000 BYR | 11,1476 |
| EUR | 36,9053 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 16.05.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## Уведзеныя ЗША абмежавальныя меры накіраваны супраць радавых беларускіх грамадзян

ЗША прадэманстравалі, што меры, якія яны прымаюць, накіраваны супраць радавых беларускіх грамадзян і закранаюць інтарэсы работнікаў прадпрыемстваў, што ўключаюцца ў абмежавальны спіс. Такі пункт гледжання выказаў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў, каментуючы па просьбе карэспандэнта БЕЛТА ўвядзенне Мінфінам ЗША абмежавальных мераў супраць шэрагу беларускіх прадпрыемстваў.

Паводле слоў Андрэя Папова, варта ўвагі іншае: «Цяпер ужо ўсім, нават неспецыялістам, зразумела, што на самай справе стаіць за заявамі ЗША. Асабліва кідаецца ў вочы, што гэты крок зроблены амерыканскім бокам адразу ўслед за недвухсэнсава заяўленай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь адкрытай і сумленнай пазіцыяй на карысць раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага дыялога ў мэтах нармалізацыі беларуска-амерыканскіх адносінаў. Сітуацыя ясна паказвае, хто працуе на пазітыў, а хто — на негатыў».

Эканамічныя санкцыі ЗША адносна нафтахімічных прадпрыемстваў Беларусі істотна не адаб'юцца на іх рабоце. Аб гэтым заявіў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка. ЗША 15 мая аб'явілі аб эканамічных санкцыях супраць трох беларускіх прадпрыемстваў — «Лакафарба» (Ліда), «Шкловалакно» (Полацк) і «Беларускі нафтавы гандлёвы дом» (Мінск).

«Вядома, праблемы ўзнікнуць. Гэтым прадпрыемствам трэба будзе ў большай ступені дыверсіфікаваць свае рынкі», — сказаў ён, растлумачыўшы пры гэтым, што гэтыя прадпрыемствы пастаўляюць сваю прадукцыю не толькі ў ЗША, яна запатрабавана на сусветных рынках. Паводле слоў Уладзіміра Сямашкі, у краіне прыняты ўжо пэўныя прэвентыўныя меры для таго, каб гэтыя арганізацыі працавалі нармальна, выконвалі даведзеныя да іх паказчыкі эканамічнага развіцця. Найбольшыя аб'ёмы паставак прадукцыі на амерыканскі рынак прыпадалі на полацкае «Шкловалакно», прадукцыя якога таксама шырока запатрабавана на сусветных рынках.

## «ЧАЎНАКІ» ЎЗЯЛІ ТАЙМ-АЎТ

*Пасля ўвядзення абмежаванняў на ўвоз тавараў для асабістага карыстання зніклі чэргі на мяжы Беларусі з Літвой і Польшчай*

Прадстаўнікоў гэтак званага «чаўночнага бізнэсу», відаць, не на жарты напалохалі дадатковыя меры кіраўніцтва Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК) аб узмацненні кантролю за перамяшчэннем праз мяжу рэчаў для асабістага карыстання. Нагадаю, што з 15 мая на шляху памянёных катэгорый грамадзян была створана «лімітная заслона». Для тых, хто пастаянна, у мэтах асабістага абагачэння ездзіць у блізкае замежжа, вызначаны строгія нормы ўвозу адзення, бытавой тэхнікі і іншых рэчаў. У прыватнасці, калі чалавек ездзіць за мяжу часцей чым 1 раз у тыдзень, то яму дазволена бесперашкодна, а, дакладней, без выплаты пошліны, увезці толькі адно найменне тавару для асабістага карыстання. Раз у тыдзень можна захапіць не больш за тры найменні тавараў, раз у месяц — не больш за 5 найменняў, раз у 2 месяцы — не больш за 10 найменняў. Штомесяц і раз у 2 месяцы дазволена імпартаваць для асабістага карыстання па адной адзінцы бытавой тэхнікі і прадметаў доўгатэрміновага карыстання: верхняга адзення, абутку. Ахвотнікаў праверыць пільнасць айчынных мытнікаў у першыя дні дзеяння гэтых нормаў індывідуальнага імпарту не знайшлося. «Чаўнакі» вырашылі не рызыкаваць.

Як адзначыў падчас сустрэчы з журналістамі намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Сяргей Барысюк, у сувязі з тайм-аўтам «чаўнакоў» фактычна зніклі чэргі на мяжы Беларусі з Літвой і Польшчай. Напрыклад, у пункце пропуску «Бабруйнікі — Берасцвіца», што на беларуска-польскай мяжы, плынь фізічных асобаў зменшылася ў 2,5 раза. Сяргей Барысюк паведаміў, што ніякіх спрэчных сітуацый паміж мытнікамі і грамадзянамі, якія перавозяць тавары праз мяжу, пакуль не было. На яго думку, людзі былі добра праінфармаваныя аб тым, якую колькасць тавараў можна імпартаваць.

*Адказваючы на пытанне «Звязды», ці не рыхтуюцца беларускія мытнікі да магчымай пераарыентацыі айчынных «чаўнакоў» на «шэры імпарт» тавараў з Расіі, Сяргей Барысюк запэўніў, што як толькі такая праблема ўзнікне, то будуць прыняты адэкватныя меры. Якія гэта будуць меры, прадстаўнік ДМК не ўдакладніў. Ён толькі адзначыў, што пытанне аб стварэнні беларускіх мытных пастоў на мяжы з Расіяй не разглядаецца.*

Затое ў найбліжэйшых планах кіраўніцтва ДМК — павышэнне заробку шараговым інспектарам. Паляпшэнне дабрабыту мытнікаў павінна зменшыць шанцы дробных хабарадаўцаў спакусіць вартавых эканамічных інтарэсаў нашай краіны.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

З нагоды

# БЯСПЕКУ ГАРАНТУЮЦЬ... ПРЭМІІ

*За «моцныя» напоі на працоўных месцах летась скасавана больш за 7 тысяч кантрактаў*

**Той факт, што ад бяспекі працы залежыць не толькі дэмаграфія, але і эканоміка, сёння прызнаецца ўсімі — паводле ацэнак Міжнароднай арганізацыі працы няшчасныя выпадкі на вытворчасці вядуць да страты, прынамсі, 4 працэнтаў сусветнага ВУП. Прычым «нулявога паказчыка» інцыдэнтаў не мае ніводная краіна ў свеце. Між тым, наколькі актуальная праблема вытворчай бяспекі для Беларусі, якія прафесіі з'яўляюцца найбольш «рызыкоўнымі», што часцей за ўсё становіцца прычынай траўмаў і, уласна кажучы, як можна зменшыць колькасць «надзвычайных сітуацый»? Аб усім гэтым і іншым мы вырашылі пагутарыць з дырэктарам Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Анатолем Пятровічам Садаўнічым. Тым больш, што для сустрэчы ўзнікла нагода — днямі айчыннай інспекцыі працы спаўняецца 90 гадоў.**

**— Як складваецца сітуацыя з вытворчым траўматызмам у Беларусі? І як у гэтым плане выглядае наша краіна ў параўнанні з дзяржавамі СНД і Еўрасаюза?**

— Змяншэнне паказчыкаў вытворчага траўматызму адбываецца па сутнасці штогод, і сам па сабе гэта — факт прыемны. Як сведчыць статыстыка, летась на кожныя 100 тысяч работнікаў у Беларусі прыпадала па 5,7 выпадка траўматызму са смяротным зыходам, тады як, да прыкладу, ва Украіне такі паказчык быў у 1,9, а ў Расіі — у 2 разы большым. Прычым ужо за студзень—красавік сёлета ў параўнанні з аналагічным перыядам летась узровень вытворчага траўматызму ў нас зноў знізіўся — на 35 працэнтных пунктаў.

Сапраўды, такі малюнак атрымаўся не на роўным месцы, ён стаў вынікам стварэння банка даных арганізацый з высокім узроўнем прафесійнай рызыкі, арганізацыі навучання тэхніцы бяспекі, увядзення службаў аховы працы ў арганізацыях, правядзення месячнікаў бяспекі ў асобных галінах і, у рэшце рэшт, штрафных санкцый. Разам з тым асабіста мне не хацелася б залішне ідэалізаваць сітуацыю. Сёння ў нас ужо трэба арыентавацца не на СНД, а на Еўропу. Тады як сярэдні паказчык вытворчага траўматызму ў краінах Еўрасаюза складае 4—4,5 выпадка на кожныя 100 тысяч работнікаў. Словам, арыенцір тут ёсць, і да яго трэба ісці.

**— Адрасу ўзнікае пытанне — якім чынам?**

— Напэўна, не трэба «вынаходзіць веласіпед». Больш нізкія паказчыкі вытворчага траўматызму ў Еўропе не ў апошнюю чаргу тлумачацца ўкараненнем сістэм кіравання аховай працы, іншымі словамі, папярэдняй ацэнкай патэнцыяльнай рызыкі на кожным працоўным месцы і ўкладаннем сродкаў у змяншэнне гэтай рызыкі. Адметна, што тут мы ўжо зрабілі першыя крокі. Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны сумесна з Дзяржстандартам распрацаваны і зацверджаны дзяржаўны стандарт СТБ 18001-2005 «Сістэмы кіравання аховай працы». Сам па сабе стандарт з'яўляецца ўніверсальным — ён падыходзіць для арганізацый з колькасцю як 10—15, так і 10 тысяч работнікаў. Стаіць задача, каб новы стандарт дзейнічаў у кожнай арганізацыі Беларусі, пры гэтым на сёння сістэмы кіравання аховай працы маюць больш за 2 тысячы суб'ектаў гаспадарання нашай краіны, ідзе іх і сертыфікацыя. Прычым укараненне новага стандарту, работа па ахове працы вядуць не толькі да змяншэння колькасці выпадкаў вытворчага траўматызму, але і «працуюць» на імідж саміх арганізацый. Скажу нават больш: наяўнасць сертыфіката на Захадзе — пацвярджэнне надзейнасці партнёра, сведчанне таго, што з ім можна заключаць дзелавыя дагаворы.

**— Ахова працы — гэта заўсёды грошы. Наколькі выгадна ўкладваць сродкі ў бяспеку?**

— Увогуле, адзін рубель, што ўкладваецца ў бяспеку працы, «вяртаецца» ўтрая. Здаровыя ўмовы на працоўных месцах і адсутнасць надзвычайных здарэнняў — гэта не толькі меншая колькасць «бальнічных», але і магчымасць эканоміі на адлічэннях па страхаванні ад няшчасных выпадкаў і прафесійных захворванняў. Нагадаю, цяпер для арганізацый, дзе выпадкаў вытворчага траўматызму становіцца больш, базавы страхавы тарыф можа павялічыцца да 40 працэнтаў. А для арганізацый, дзе назіраецца паляпшэнне, базавы тарыф можа наадварот змяншацца — да тых жа 40 працэнтаў.

Прычым сістэма скідак і надбавак на самай справе працуе. У цэлым летась па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў і прафзахворванняў прадстаўлены надбаўкі да тарыфаў 3801, а скідкі — 59 759 арганізацыям. Такім чынам, калі ў 2004 годзе мінімальны страхавы тарыф складаў 0,1 працэнта ад фонду аплаты працы, то летась — 0,07 працэнта. Адпаведна, сярэднегаліновы тарыф зменшыўся з 0,785 да 0,56, а максімальны тарыф — з 3,2 да 2,8 працэнта.

**— Хто, як правіла, атрымлівае вытворчыя траўмы ў Беларусі? Ці існуе своеасаблівы «рэйтынг» найбольш небяспечных галін і прафесій? І што з'яўляецца асноўнымі прычынамі надзвычайных здарэнняў?**

— Аналіз паказвае, што найбольш небяспечнымі з'яўляюцца прафесіі вадзіцеля аўтамабіля (сярод іх за мінулы год адзначана 27 выпадкаў вытворчага траўматызму са смяротным заходам), трактарыста-машыніста ў сельгасарганізацыях (13 чалавек), дапаможнага рабочага (10), цесляра (9), слесара-рамонтніка (8), вартаўніка (7), мантажніка тэхналагічнага абсталявання і звязаных з ім сістэм (6), бетоншчыка і электрагаззваршчыка (па 5), жывёлавода, мантажніка і слесара па рамонце аўтамабіляў (па 4).

Што да галоўных прычын, то летась 20,9 працэнта няшчасных выпадкаў тлумачылася невыкананнем кіраўнікамі і спецыялістамі абавязкаў па ахове працы, 19,5 працэнта — парушэннямі працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны самімі пацярпелымі, 8,1 працэнта — алкагольным, наркатычным ці таксічным ап'яненнем, 7,2 працэнта — эксплуатацыяй няспраўнай тэхнікі, 6,7 працэнта — недахопамі ў навучанні, 5,6 працэнта — парушэнне патрабаванняў бяспекі іншымі работнікамі.

Пры гэтым, на жаль, мы вымушаныя канстатаваць як факт — застаецца па-ранейшаму актуальнай тэма п'янства на працоўных месцах. Летась з 229 работнікаў, якія загінулі на вытворчасці, 81 чалавек (або 35,4 працэнта) знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. Так, у 2003 годзе гэты паказчык складаў 44,2 працэнта. Аднак асабіста я перакананы: значнага зніжэння не адбылося, істотна сітуацыя не змянілася. Прынамсі, летась знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення ўсе 100 працэнтаў работнікаў, якія загінулі ў арганізацыях лёгкай і харчовай прамысловасці, гандлю, спажывецкай кааперацыі. Высокім гэты паказчык быў таксама ў арганізацыях сельскай гаспадаркі (75 працэнтаў), будаўніцтва, прамысловасці, лясной гаспадарцы (па 33,3 працэнта).

**— Нягледзячы на верагоднасць скасавання кантрактаў?**

— Летась з-за ўжывання «моцных» напояў на працоўных месцах у Беларусі было скасавана 7160 кантрактаў. Але разам з тым на сныненне працоўных адносінаў з парушальнікамі кіраўнікі ішлі далёка не заўсёды, і асабліва — кіраўнікі сярэдняга звяна. А адсюль вынік: за незабеспячэнне працоўнай дысцыпліны падначаленых і ўтойванне фактаў парушэння імі працоўнай і выцворчай дысцыпліны былі скасаваныя кантракты з 13 кіраўнікамі і 13 службовымі асобамі. Так, я разумею, што звальняць спецыяліста заўсёды шкада. Аднак шкадаванне тут не да месца — у рэшце рэшт, гаворка ідзе аб жыцці і здароўі самога парушальніка.

**— Не сакрэт, што адным з напрамкаў прафілактыкі з'яўляюцца строгія санкцыі да наймальнікаў. І ці спрацоўваюць гэтыя меры?**

— Калі ў 2006 годзе на традыцыйна праблемных прадпрыемствах камунальнай уласнасці было выяўлена 128,8 тыс. парушэнняў працоўнага заканадаўства, то летась — 98,2 тысячы. А па прыватных арганізацыях — адпаведна з 88,5 тыс. да 84,9 тысячы. Прычым не ў апошнюю чаргу гэта стала вынікам тых самых жорсткіх мераў — штрафы ў дачыненні да кіраўнікоў і адказных асобаў спрацоўваюць. Аднак яны вырашаюць не ўсё. Бо непакоіць ужо іншае: калі раней вытворчыя інцыдэнты перш-наперш адбываліся ў выніку недагляду кіраўнікоў ці выкарыстання няспраўнай тэхнікі, то сёння самай вострай стала праблема адносінаў да ўласнай бяспекі самі работнікаў.

**— У чым тут справа?**

— На наш погляд, адна з галоўных прычын тут — матэрыяльная незацікаўленасць. Так, за грэбаванне тэхнікай бяспекі работнік можа пазбавіцца прэміі. Але гэта толькі адна з матывацый і не заўсёды самая эфектыўная. Таму сёння Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны прапрацоўваюцца прапановы па новых метадах матэрыяльнага стымулявання, прэміравання работнікаў за выкананне інструкцый па ахове працы, папярэджанне няшчасных выпадкаў сярод сваіх калег. Бо сітуацыя даходзіць да абсурду: пры парушэнні тэхнікі бяспекі ніхто не зробіць нават заўвагі свайму таварышу і ўжо тым больш не скажа аб тым кіраўніцтву. Чамусьці ў нас гэта называецца «закласці». Тым часам як на Захадзе, на які мы спрабуем арыентавацца, гэта — крок да ўратавання здароўя ці нават жыцця.

**— Між тым, яшчэ адзін і не менш важкі стымул працоўнай дысцыпліны — заробкі. Ці стабілізавалася сітуацыя з іх выплатай?**

— Калі ў 2006 годзе доля арганізацый, у якіх падчас праверак былі знойдзены факты парушэнняў тэрмінаў выплаты зарплаты, склала 14,5, то летась — 11,9 працэнта. Прычым колькасць арганізацый, у якіх праблемы са своечасовымі разлікамі зацягваліся больш чым на тры месяцы, наблізілася да нуля.

Падобную акалічнасць можна патлумачыць як паляпшэннем агульнага эканамічнага стану, так і больш сумленным стаўленнем найманікаў да сваіх абавязкаў. І, да слова, гэта ж прывяло да скарачэння колькасці суб'ектаў гаспадарання, якія плацілі сваім работнікам зарплату ў памеры менш за «мінімалку»: у 2006 годзе падобныя парушэнні былі выяўлены ў 0,8, а летась — у 0,7 працэнта ад агульнай колькасці праверэных арганізацый.

**Гутарыў Сяргей ГРЫБ.**

## Чэрыкаўскія аўтаўладальнікі зэканомяць час і грошы

У Чэрыкаве адкрылася станцыя дыягностыкі аўтамабіляў. Цяпер тут праходзяць дзяржаўны тэхнічны агляд аўтамабілі ўсіх марак, легкавыя і велікагрузныя. Раней чэрыкаўскім аўтаўладальнікам (а іх зараз каля 4 тысяч) даводзілася ездзіць на тэхагляд за 30 кіламетраў у Крычаў. Цяпер праблем няма: ад пачатку мая штодня на станцыі дыягностыкі абслугоўваецца 20—25 машын. Гэта не толькі чэрыкаўскія аўтамабілі: на тэхагляд прыязджаюць з суседніх Краснапольскага і Слаўгарадскага раёнаў. Кіраўніцтва Чэрыкаўскага аўтапарка № 20 выдаткавала на стварэнне станцыі дыягностыкі 180 мільёнаў рублёў уласных сродкаў. Тут разлічваюць, што правядзенне тэхагляду ў райцэнтры будзе зручна людзям і дасць аўтапарку дадатковыя сродкі для працы і развіцця.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Абзац

■ **Кукшынаўская пляцоўка можа стаць месцам размяшчэння беларускай АЭС, сказаў у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіл Мясніковіч. Камісія па выбары АЭС завяршыла аналіз патэнцыйных пляцовак і адправіла матэрыялы ў Савет Міністраў краіны. Камісія прыйшла да высновы, што Кукшынаўская пляцоўка лепш за ўсё адпавядае патрабаванням па будаўніцтве АЭС. На другім месцы — Астравецкая і на трэцім — Краснапалянская, адзначыў М. Мясніковіч.**

■ Мінскія паліклінікі з 16 мая перайшлі на летні рэжым працы. У будні графік застаецца ранейшым, а па суботах участковыя тэрапеўты і вузкія спецыялісты будуць прымаць па зменным графіку з 9 да 15 гадзін. Выконваць назначэнні дома медсёстры будуць да 18 гадзін. У дзіцячых паліклініках дзяжурныя ўчастковыя педыятры прымаюць да 16, вузкія спецыялісты — на гадзіну менш. У нядзелю ва ўсіх выхадны.

■ **У Беларусі за першы квартал сёлета зарэгістравана 13 тыс. 366 шлюбаў і 8 тыс. 830 разводаў. У параўнанні з адпаведным леташнім колькасць шлюбаў павялічылася на 7,4 працэнта, колькасць разводаў знізілася на 1,5 працэнта.**

■ У пятніцу раніцай у Пензенскай вобласці 9 чалавек, якія заставаліся пад зямлёй, былі выведзеныя з пячоры. Перад гэтым былі эксгумаваныя целы дзвюх затворніц, якія, як мяркуецца, памерлі пад зямлёй. Бекаўскі суд прызнаў грамадзян Беларусі вінаватымі ў парушэнні рэжыму знаходжання ў РФ і пастанавіў дэпартаваць іх з краіны. Суд пастанавіў таксама спагнаць штраф па 2,5 тыс. рублёў з кожнага з чатырох дарослых грамадзян.

■ **Чэрыкаўскі РАУС узбудзіў крымінальную справу па факце знішчэння прыватнай пчалінай пасекі. Справа ўзбуджана па заяве 50-гадовага работніка Чэрыкаўскага гаргазу, у якога на дачным участку ў вёсцы Галоўчыцы знішчана 21 пчаліная сям'я шляхам прымянення хімсродку. Урон ацэньваецца больш чым у Br8 млн. Пры экспертызе спецыялісты абласной ветлабараторыі ў паморы пчол выявілі рэчыва, падобнае на дыхлафос. Вядзецца следства.**

■ У Індыі кандуктар выкінуў з аўтобуса, які рухаўся, мужчыну і яго 4-гадовую дачку, што прывяло да іх гібелі. Прычынай стала тое, што ў 40-гадовага мужчыны не хапіла 10 рупій (0,23 долара) для аплаты праезду. Раз'юшаныя дзеяннямі кантралёра пасажыры спалілі аўтобус. Кандуктару пагражае да 10 гадоў турмы.

■ **У Екацярынбургу адчынілася спецыяльная аўтамыйка, прызначаная выключна для вадзіцеляў жаночага полу. Яе галоўная асаблівасць — у тым, што яна аб'яднаная з салонам прыгажосці. Мыццё і сушка кузава аўтамабіля займае звычайна 40 хвілін, за гэты час жанчына паспее прыняць сеанс у салоны або абнавіць макіяж, зрабіць лёгкі класічны манікюр, укладку. Аўтамыйкі для жанчын ёсць і ў Галандыі, там машыну мыюць напалову голыя мужчыны.**

■ Намеснік дырэктара расійскага Інстытута крышталаграфіі Святлана Жолудзева шпіталізаваная ў стане комы пасля таго, як ускрыла пакет з невядомым парашком белага колеру. Пакет прыйшоў па пошце з інстытута крышталаграфіі Новасібірска. Папярэдні дыягназ, пастаўлены ў бальніцы, — вірусны гепатыт В. Канверт з парашком адпраўлены на экспертызу.

■ **Дызайнер Мікаэль Генберг звіў у шведскім парку Васапаркен сапраўднае гняздо. Гэта — гатэль Woodpecker («Дзяцел»), а трапіць сюды можна толькі пры дапамозе трывалай лесвіцы з вяроўкі. Вашымі адзінымі суседзямі тут будуць салаўі, шпакі і берасцянкі, што жывуць у парку. У гатэлі-гняздзечку ёсць усе выгоды — туалет, кухня, печка, пуховая коўдра і нават бібліятэка. П'ючы ранішнюю каву на ўтульнай верандзе, можна любавацца цудоўнымі відамі на парк і возера Маларэн.**

## Поўны абзац

■ У горадзе Камсамольску Палтаўскай вобласці ўстановяць помнік п'янай свінні. Як патлумачыў журналістам аўтар будучага помніка, той будзе сімвалізаваць людзей, якія празмерна напіваюцца. Помнік паставяць каля кафэ "Ласун". Свіння будзе ляжаць на жываце з раскінутымі ў бакі капытамі, а яе рыла — у карыце.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

Асоба

Эдуард МАЛАФЕЕЎ:

# «ЛЮДЗІ ПАВІННЫ ПЕРАДАВАЦЬ АДЗІН АДНАМУ ТОЛЬКІ ДОБРЫЯ ІМПУЛЬСЫ ПАДТРЫМКІ»

**З нагоды Дня работнікаў фізічнай культуры і спорту, які адзначаецца 17 мая, мы сустрэліся з чалавекам, які мае непасрэднае дачыненне да гэтага свята. Ды і прадстаўляць яго асабліва нікому не трэба. Можна назваць толькі першыя літары яго імя, імя па бацьку і прозвішча — ЭВМ — і адразу стане зразумела, хто наш суразмоўца.**


Фота Вольгі ЛАСКІ.

Напэўна, я нешта не тое зрабіў і мне давялося ісці, куды паклічуць. Працаваць жа трэба: дзеткі ж ёсць, і іх карміць трэба. Вось тут і паняволі трэнеру даводзіцца мяняць каманду. А калі ёсць магчымасць быць у адным клубе, як Фергюсан ужо ў «Манчэстар Юнайтэд» гадоў 20 працуе ці болей, то чаму б не?

Эдуард Васільевіч Малафееў — гэта цэлая эпоха савецкага і беларускага футбола. У адрозненне ад большасці ігракоў, якія дасягаюць вяршынь ці то як футбалісты, ці то як трэнеры, Эдуард Васільевіч вызначыўся і як ігрок, і як футбольны настаўнік — прычым і на клубным узроўні, і ў зборнай. Малафеева можна назваць шчаслівым трэнерам: не кожнаму настаўніку ўдаецца ўзначаліць галоўную каманду краіны, а тым болей стаяць ля руля зборнай СССР. Акрамя таго, разам з мінскім «Дынама» Эдуард Васільевіч выйграў чэмпіянат СССР. Не дзіва, што ў такога паспяховага спецыяліста хапала «добразычліўцаў». Хоць у кар'еры трэнера былі не толькі ўздымы, але і падзенні, Малафееў ніколі не здаваўся і заўжды знаходзіў сабе месца пад сонцам. І ў свае 65 гадоў ён працягвае дапамагаць развіццю гульні № 1: зараз працуе кіраўніком аддзела дзіцяча-юнацкага футбола Беларускай федэрацыі футбола. Аб юных талентах мы яшчэ пагаворым. А вось тэму трэнерскай прафесіі мы абмінуць увагай не змаглі. Усё ж Дзень работнікаў фізкультуры і спорту! Гутарку ж мы пачалі з актуальных падзей у сучасным футболе.

### *Як Машэраў паставіў «медзведзяня» на месца*

**— Неўзабаве стартуе Еўра-2008. Якія ў вас прадчуванні, хто можа стаць чэмпіёнам кантынента?**

— Дык справа ж у тым, што я — вернік, таму па-хрысціянску мне гэтага рабіць нельга. Як кажуць, я не вяшчун, я — просты чалавек. Падчас чэмпіянату Еўропы я толькі жыву тым, што сачу за рознымі зборнымі, трэнерскімі канцэпцыямі і перажываю за футбол вельмі моцна. Бо развіццё ж футбола не стаіць на месцы. І для таго каб націснуць на адну са струн павышэння ўзроўню футбола, трэба назіраць за ім, за іншымі відамі спорту і чалавечай дзейнасці, за самім жыццём.

**— Тады хоць скажыце, за каго «хварэць» будзеце?**

— Вядома ж, за расіян! Я за іх хварэю як балельшчык, а вось як трэнеру, футбол мне больш падабаецца англійскі. З тых часоў, калі ў англійскім футболе было мала іншаземцаў — у 60-я гады. Калі напярэдадні чэмпіянату свету 1966 года мы былі месяц у Англіі, я глядзеў англійскі футбол рознага ўзроўню — вышэйшая ліга, чацвёртая — якая заўгодна гульня — у футболе я там не бачыў фальшу, а толькі поўную самааддачу. Я нават такое слова, як шчыры футбол, у дачыненне да англійскага далучыў, г. зн. футбол да самазабыцця. Калі чалавек цалкам аддаецца сваёй справе і заахвочвае іншых людзей суперажываць, дастаўляе сваёй гульнёй задавальненне іншым людзям, тады гэта сапраўдны спартсмен.

У мяне таксама ўзнікалі сітуацыі, калі мне было соромна. Іншая справа, што я заўжды каяўся і як мага хутчэй уставаў з кален у любым узросце.

**— Англічане прапускаюць Еўра, затое ў фінале Лігі чэмпіёнаў сустрэнуцца ажно два прадстаўнікі прэм'ер-лігі...**

— Я вельмі рады гэтаму. А хварэць буду за «Манчэстар Юнайтэд». Проста мне па стылі ён больш імпануе, хоць і «Чэлсі» — вельмі нядрэнная каманда, ды і ў ёй наш суайчыннік працуе — Абрамовіч. Аднак, як кажуць, душы не загадаеш. «Манчэстар» жа мне запаў у душу.

**— Каб завяршыць тэму англійскага футбола, хачу даведацца, якое ў вас меркаванне на магчымы пераход Аляксандра Глеба з «Арсенала» ў «Інтар». Ва ўсякім разе, такія чуткі даўно ходзяць. Ці адаптуецца, павашаму, беларус у італьянскім чэмпіянаце? Вось Андрэй Шаўчэнка перабраўся з «Мілана» ў «Чэлсі» і ...**

— Безумоўна, англійскі футбол больш жорсткі і «шчыльны» ў параўнанні з італьянскім (у кожнай краіне ён мае свае адрозненні па нейкіх кампанентах). І ўсё ж я вам хачу сказаць, што да гэтых пераходаў ігракоў я стаўлюся не пахвальна. Калі я перайшоў з маскоўскага «Спартака», дзе не часта гуляў за асноўны склад, у мінскае «Дынама», то мая кар'ера наладзілася. Праз паўгода мяне ўзялі ў зборную Савецкага Саюза, а потым сталі клікаць і маскоўскія каманды, і «Дынама» (Кіеў) і «Шахцёр» і «Тбілісі». І калі б я не сустрэў Пятра Міронавіча Машэрава!.. Ён мне сказаў (выклікаў да сябе, калі даведаўся аб маім магчымым пераходзе): «Медзведзяня (ён мяне так называў), ты разумееш, у чым справа. Я табе хачу сказаць не як кіраўнік, а як твой старэйшы таварыш, а можа, і бацька, які прайшоў пэўны ўчастак жыцця і мае дастатковы вопыт. Я лічу, што там, дзе ты загуляў, і павінна быць твая каманда. Зараз у цябе цэльная душа, а калі ты пакінеш «Дынама», то станеш непрыкметным, цябе будзе вабіць ці матэрыяльны рэсурс, ці нешта яшчэ». Вось ён мне так вобразна ўсё намаляваў, што я зразумеў, што не трэба рваць сэрца і душу. Я ўдзячны «Дынама», што там мяне так добра прынялі, і людзям, якія мяне туды прывялі. Таму ва ўсіх інтэрв'ю кажу, што мая другая радзіма — Беларусь.

**— А ці можа не здраджваць свайму клубу трэнер? Вось Ігар Крыушэнка выйграў і чэмпіянат, і Кубак Беларусі з БАТЭ, а затым перабраўся ў сталічнае «Дынама»...**

— Тут іншая сітуацыя. Трэнеру даводзіцца мяняць каманду не па сваёй волі. Вось у мяне як атрымалася? Я спачатку працаваў у «Дынама» ў Брэсце, потым пайшоў на павышэнне ў Мінск. Зразумела, хацелася дасягнуць поспеху. І калі я зрабіў мінскіх дынамаўцаў чэмпіёнамі, мяне запрасілі ў алімпійскую зборную СССР, потым — у першую. А пасля, напэўна, я нешта не тое зрабіў і мне давялося ісці, куды паклічуць. Працаваць жа трэба: дзеткі ж ёсць, і іх карміць трэба. Вось тут і паняволі трэнеру даводзіцца мяняць каманду. А калі ёсць магчымасць быць у адным клубе, як Фергюсан ужо ў «Манчэстар Юнайтэд» гадоў 20 працуе ці болей, то чаму б не? Праўда, не ва ўсіх так атрымліваецца. Узнікаюць жа і канфліктныя сітуацыі з ігракамі і кіраўніцтвам каманды.

**— Вы не абмінулі іх у сваёй практыцы. Вы ўжо даравалі тым, хто калісьці пакрыўдзіў вас, здрадзіў?**

— Бывалі такія выпадкі, але я хрысціянін, таму не трымаю на людзей зла. Бо я лічу, што адна з найгалоўнейшых якасцяў чалавека — незлапамятнасць. Безумоўна, наогул не пакрыўдзіцца нельга, бо мы ж людзі. Але ж старайся ўсімі фібрамі душы, хоць цябе гэта ўсё раз'ядае, памяншаць узровень трывожнасці. Зрабі так, каб табе палягчэла. Тады, упэўнены, і іншым людзям ты не зробіш дрэннага. Абавязкова.

Патрэбна даваць адзін другому свае добрыя імпульсы падтрымкі, каб людзі былі ўпэўненыя ў сваіх сілах. Няўпэўнены чалавек, ігрок ці трэнер, любы чалавек — значыць, злы. Ён пачынае зайздросціць, а так нельга. А ў трэнерскай прафесіі асабліва. Бо табе ж заплацілі і матэрыяльна, і духоўна.

### *«Я ўставаў з кален у любым узросце»*

**— Каго вы вызначыце ў сучасным беларускім футболе сярод ігракоў і трэнераў?**

— Таленавітыя ёсць, але я ніколі не выдзяляю кагосьці. Я лічу гэта няправільным.

**— Вам не абыякавае «Дынама», і МТЗ-РІПА, дзе вы таксама працавалі. А ці суперажываеце ў час матчаў беларускага чэмпіянату за іх аднолькава?**

— Ёсць такі выраз: «Я не болею за «Спартак». Что делать, если это так? Я не болею за «Торпедо», но все же я рад, когда победа той команды, в которой работаю я». У дадзеным выпадку я хварэю за зборныя Расіі і Беларусі, бо зараз працую ў Федэрацыі футбола. Больш за тое! Я гатовы дапамагчы зборнай і словам, і справай, калі гэта патрэбна.

**— Ці думалі вы, калі ўзначальвалі зборную Беларусі, што калісьці камандай будзе кіраваць нямецкі настаўнік! На вашу думку, Бернду Штанге складана зразумець менталітэт беларусаў?**

— Я думаю, што, несумненна, патрэбна ведаць больш дэталёва футбол і краіну, дзе ты працуеш. А для гэтага патрэбна тут дастаткова пажыць. Аднак я перакананы, што гэта — каштоўны спецыяліст. Яму не так проста ў працы, бо зараз будзе і змена пакаленняў, і група ў нас няпростая (адборачная група да чэмпіянату свету-2010. — **Аўт.**). Вось чаму я і сказаў, што гатовы дапамагчы, калі спатрэбіцца. Яшчэ патрэбна, каб усе былі настроены ў адзіным парыве на найвышэйшае дасягненне. І я, і вы — давайце разам пажадаем Штанге, каб у яго ўсё атрымалася, каб яму спадарожнічала ўдача. У нас з ім, дарэчы, склаліся вельмі добразычлівыя адносіны. Мы ж часта бачымся ў федэрацыі.

**— Нямецкія трэнеры патрабуюць жорсткую дысцыпліну ў камандзе, некаторыя ж беларускія настаўнікі занадта мяккія да сваіх падначаленых. Павашаму, якім павінен быць для футбалістаў трэнер — другім бацькам, сябрам ці тыранам?**

— Ёсць і аўтакраты, і дэмакраты, і людзі, якія больш прымяняюць псіхалагічны метад у рабоце. Дыстанцыя ў адносінах паміж трэнерам і ігракам павінна існаваць, але яе не трэба ствараць спецыяльна. Дыстанцыя сама з'яўляецца, калі ў цябе хапае ведаў. Галоўнае — цвёрда стаяць на нагах і валодаць пэўнай граматнасцю. Нагул стаць трэнерам няцяжка. Калі ты добры футбаліст і хочаш стаць трэнерам, і ў цябе для гэтага ёсць патрэбныя якасці, то, безумоўна, — гэта для цябе вялікая падмога. Калі ж ты не футбаліст, то таксама можаш стаць трэнерам. У любым выпадку патрэбна мець пэўны багаж ведаў — па футболе, фізіялогіі, біяхіміі, фізвыхаванні, псіхалогіі.

**— Які спосаб вы б параілі маладым трэнерам, каб забыцца аб няўдачах, без якіх ніяк не абысціся ў прафесіі настаўніка?**

— У мяне таксама ўзнікалі сітуацыі, калі мне было соромна. Іншая справа, што я заўжды каяўся і як мага хутчэй уставаў з кален у любым узросце. Сказана ж: «Какое горе мелких неудач, какая бы беда ни подступала, руками стисни горло и не плачь, садись за дело (или выходи на футбольное поле), начинай сначала». Спосаб забыцца на няўдачы ў мяне адзіны — гэта духоўнае аднаўленне. Першым духоўным пачаткам у чалавека з'яўляецца сумленне. Калі зможаш да яго дастукацца, то ўсё ў парадку. Кожны раз патрэбна звяртацца да свайго сумлення: ці правільна я сябе вяду, што я раблю не так?

### *Быць факелам і запальваць іншых*

**— Вы цытуеце многа вершаў. А самі іх пісаць спрабавалі?**

— Сапраўдныя вершы я ніколі не пісаў, так толькі спрабаваў. У мяне душа ж паэтычная. Я вельмі люблю вершы — Пушкіна, Блока, Ясеніна, Лермантава, Някрасава і іншых. Я ўдзячны, што яны такія выдатныя рэчы напісалі. Вершы ж супакойваюць. Настрой становіцца прыемным. Больш нічога і не трэба. І зноў ляціш. Паэзія — гэта мой надзённы хлеб. Я таксама ведаю шмат малітваў.

**— Вы рэалізавалі сябе ў футболе і як ігрок, і як трэнер. А па-чалавечы можаце назваць сябе шчаслівым?**

— Было б блюзнерствам казаць, раз Гасподзь даў мне жыццё, што я

# Краіна здароўя

Выпуск № 24 (80)

## Як пазбавіць медустановы ад хранічнага кадравага дэфіцыту?

На працягу шэрагу апошніх гадоў для Беларусі працягвае заставацца актуальнай праблема ўкамплектаванасці ўстаноў і арганізацый аховы здароўя кадрамі з вышэйшай медыцынскай і фармацэўтычнай адукацыяй. Так, на пачатак гэтага года ўкамплектаванасць штатных урачэбных пасад склала па краіне 94,6 працэнта. Самы нізкі паказчык укамплектаванасці кадрамі (92,6 працэнта) — па горадзе Мінску, а самы высокі — у Магілёўскай вобласці (98,9 працэнта). Аб гэтым на сустрэчы з журналістамі паведаміў **начальнік управлення кадравай палітыкі, устаноў адукацыі і знешніх сувязяў Міністэрства аховы здароўя Сяргей СЫЧЫК.**

Больш як 6 тысяч урачоў знаходзяцца ўжо ў пенсійным узросце. З 52 тысяч пасад урачоў фізічнымі асобамі ўкамплектаваныя толькі 80 працэнтаў. Розніца паміж колькасцю штатных пасад і колькасцю фізічных асобаў складае 17 тысяч — для ўрачоў і больш як 19 тысяч — для сярэдняга медыцынскага персаналу. Каэфіцыент сумяшчальніцтва ва ўрачоў склаў летась 1,39 і 1,15 — у сярэдняга медыцынскага персаналу. На пачатак гэтага года вакантнымі заставаліся каля 3 тысяч урачэбных пасад.

На жаль, але закрыць кадравую брэш толькі за кошт выпускнікоў медыцынскіх ВНУ ў бліжэйшыя гады наўрад ці атрымаецца. Так, сёлета заяўкі арганізацый аховы здароўя пры размеркаванні выпускнікоў удалося выканаць толькі на 35 працэнтаў. У многім гэта звязана са змяншэннем набору студэнтаў у медыцынскія ВНУ, якое адбывалася напрыканцы 90-х гадоў. Таму сёння ўзяты курс па паступовае павелічэнне набору. Так, у гэтым годзе прыём студэнтаў у медыцынскія ВНУ будзе павялічаны за кошт бюджэту на 200 чалавек — да 2100 першакурснікаў. Павялічыцца таксама і набор на навучанне на ўмовах аплаты (у межах ліцэнзійных магчымасцяў ВНУ).

У наступным годзе медыцынскія ВНУ выпусцяць 1873 маладыя спецыялісты, а праз шэсць гадоў — 2735 чалавек.

— Аднак толькі павелічэннем набору ў медыцынскія ВНУ кадравую праблему вырашыць немагчыма, — лічыць Сяргей Сычык. — Яе трэба вырашаць у комплексе: я маю на ўвазе меры для замацавання маладых спецыялістаў на месцах, забеспячэнне іх жыллём, матэрыяльнае стымуляванне, стварэнне ўмоў для прафесійнага росту. Заўважана, напрыклад, што да 30 працэнтаў выпускнікоў пасля адпрацоўкі двух гадоў па размеркаванні змяняюць сваё месца працы.

Трэба ствараць і сваю, адметную ад іншых сфераў, сістэму аплаты працы, якая адлюстроўвала б спецыфіку працы медыцынскіх работнікаў, аб'ёмы, складанасць і якасць медыцынскай дапамогі, якая аказваецца насельніцтву. У 2007 годзе сярэднямесячная заработная плата работнікаў сістэмы аховы здароўя склала па краіне 596 тысяч рублёў: 1 млн 6 тысяч рублёў — ва ўрачоў і 584,9 тысячы рублёў — у сярэдняга медыцынскага персаналу. Але варта ўлічваць пры гэтым вельмі высокі каэфіцыент сумяшчальніцтва ва ўрачоў... Кошт адной гадзіны працы медыцынскага работніка складае ўсяго 3,5 тысячы рублёў, у той час як у народнай гаспадарцы адна гадзіна «каштуе» 4,4 тысячы рублёў, а ў прамысловасці — 5,1 тысячу. Між іншым, па колькасці адпрацаваных гадзін медыкі саступаюць толькі работнікам сельскай гаспадаркі.

На працягу некалькіх апошніх гадоў ухіл пры размеркаванні маладых спецыялістаў рабіўся на ўрачоў агульнага профілю і камплектацыю першаснага звяна. Летась, напрыклад, з 1798 выпускнікоў 80 працэнтаў былі размеркаваныя менавіта ў амбулаторна-поліклінічныя ўстановы. Таму неяк непрыкметна ў арганізацыях аховы здароўя ўтварыўся дэфіцыт «вузкіх» спецыялістаў. Вось чаму сёлета, да прыкладу, многія выпускнікі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта размяркоўваліся дэрматавенеролагамі, неўролагамі, афтальмолагамі і нават прамянёвымі дыягностамі.

Па словах Сяргея Сычыка, у найбліжэйшы час заробкі так званых «вузкіх» спецыялістаў павінны павялічыцца — праект адпаведнага дакумента зараз знаходзіцца на ўзгадненні ў зацікаўленых ведамствах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### Доктар адкажа

На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

**19 мая** — вядучы спецыяліст аддзела медыцынскай аховы пры надзвычайных сітуацыях Алег Мікалаевіч ЛАПО.

**20 мая** — намеснік дырэктара Цэнтра экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя Уладзімір Вячаслававіч ЗЯНЬКЕВІЧ.

**21 мая** — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Алена Леанідаўна БОГДАН.

**22 мая** — намеснік дырэктара НДІ пульманалогіі і фтызіятрыі Алена Міхайлаўна СКРАГІНА.

## Сямейны псіхолаг Святлана Анішчанкава

# ХАНДРЫЦЕ НА ЗДАРОЎЕ!

Цяжка дажываўся сыры красавік, капрызны май надакучыў сюрпрызамі. Але колькасць сонечных цёплых дзён грэе надзеяй на тое, што лета ўсё-такі прыйдзе. Кавярная вясна робіць «падарункі», але да іх усё ж прывыкаеш. А вось да «падарункаў» уласнага арганізма прывыкнуць складаней. Нібы ўцягнуўся ў зададзены рытм жыцця з яго паўсядзённымі клопатамі, але з часам пачынаеш заўважаць, што ўстаеш раніцай з адной і той жа думкай: «...зноў работа, зноў справы, і так кожны дзень да самай старасці...»

Радасць непрыкметна марнуецца на дробныя звадкі, плёткі і пустыя турботы, узамен — толькі адчуванне шчымлівай нуды і назойлівае жаданне ўцячы. Ну прыйшоў дадому як заўсёды стомлены, сарваў сваё раздражненне на блізкіх. Ну схадзіў з сябрамі расслабіцца на адзін вечар... Раніцай зноў нуда і трэба далей жыць — працаваць, рабіць выгляд, што ўсё добра.

Сёння часта падобныя настроі называюць модным словам — дэпрэсія. Чалавек стаміўся, прыхварэў або па іншай прычыне адчувае негатыўныя эмоцыі і адразу чуе: «У цябе што — веснавая дэпрэсія?»

Вядома ж, нельга не пагадзіцца: канец зімы і пачатак вясны — не лепшы час на нашай геаграфічнай паласе. Надакучылі холад, інфекцыі, і ўвогуле летам — весялей. Але не трэба блытаць дэпрэсію з хандрой.

Дэпрэсія — агрэсіўная хвароба, непрывабная для навакольных свайміі наступствамі. Чалавек у стане дэпрэсіі ходзіць па замкнутым кругзе сваіх сумненняў, невыноснай віны, яму патрэбна прафесійнае лячэнне.

Як правіла, схільны з дзяцінства да дэпрэсіі чалавек большую частку жыцця адчувае трывогу і не ў стане адэкватна ўзаемадзейнічаць з іншымі людзьмі. Чакаючы асуджэння загадзя, ён заўсёды гатовы да бою з «ценямі свайго мінулага» і пастаянна адчувае сябе «зацкаваным зверам». Атрымаўшы ў спадчыну ад бацькоў такую форму ўспрыняцця навакольнага свету, дэпрэсіўны чалавек ідзе па жыцці з цэлым «чамаданам» неўрозаў, хваробаў і назойлівых ідэй. Такіх людзей нямала сярод нас. Мы, абараняючы сваё «Я», стараемся адмежавацца ад іх. Але, адгароджваючыся ад людзей, мы добраахвотна паглыбляемся ў халодную пустэчу эгаізму і самі апынаемся ў падобным стане. Вось невясёлая і непрыветная жанчына-саслужывец, вось мужчына-сусед, які співаецца на вачах... Мы паціскаем плячыма ім услед, асуджаем за спінай і стараемся не ўнікаць у іх праблемы, не перасякацца ў жыцці... Мы прыкрываемся раўнадушшам. І тым самым у першую чаргу асуджаем на душэўную, гнятучую пустату сябе самі. Ніхто не ведае, што нас чакае на гэтай цудоўнай, але цяжкай дарозе, назва якой — жыццё. Упарадзе гады выпрабаванняў, і каб справіцца з імі дастойна, патрэбны сілы.

Спачуванне, дабрата — лечаць, умацоўваюць; раўнадушша, злосць, нянавісць — разбураюць. Вакол нас жывуць, радуюцца і пакутуюць людзі, і бывае дастаткова добрых слоў або нават добрых адносінаў да іх, каб золкі майскі дзень ператварыць у буйства прамытага дажджом маладога лісця.

А што да хандры — дык гэта часам нават карысна. Дазволіць сабе слабасць, нежаданне працаваць, прыпынак у кругавароце дзён. Прытармазіць і расслабіцца ў знясільваючай гонцы бывае проста неабходна. У такія дні, калі «ўвесь свет нямілы», па-іншаму ўспрымаючы сябе і навакольных, правяраеш на трывалась свае сувязі, набываеш бясцэнны жыццёвы вопыт. Хто падтрымае — заслужыць прыз, удзячнасць перарасце ў больш цесныя сяброўскія адносіны.

Арганізм вясной супраціўляецца зададзенаму рытму, яму трэба набрацца сілаў. Тое ж адбываецца і з прыродай. Ідзе перабудова на цёплы сезон. Фізіялагічная адаптацыя да актыўнага сонечнага святла, большага светлавога дня. Уяўнае знясіленне — гэта натуральная рэакцыя здаровага арганізма, які жыве ў гармоніі з навакольным светам.

**P. S. Задавайце свае пытанні сямейнаму псіхолагу па тэл. 287 18 69, пішыце на адрас рэдакцыі альбо e-mail:svetlana-psikholog@yandex.ru**

Вясной арганізм не хоча аддаваць усе свае рэсурсы на бясконцыя справы. Ён аднаўляе баланс і прытарможвае псіхафізіялагічную актыўнасць. Таму што ведае: «вечных рухавікоў» не існуе. Адсюль — веснавая, здаровая хандра. Хандрыце з задавальненнем. Глядзіце на сябе адкрытымі вачыма.

Дазвольце сабе пакінуць нявырашанымі дробныя праблемы. Шкадуйце сябе і сваіх блізкіх. З разуменнем пастаўцеся да сваіх недахопаў, яны — ваша важная частка. Дазвольце сабе пабыць нейкі час «няправільным». Дазвольце сабе не выканаць свой дзённы план, а замест гэтага пайсці ў тэатр або на футбол... Парушаючы звыклы ход дзён, безумоўна, сустракаеш супраціўленне наладжанага навакольля, але гэта вартае слоў: «Я люблю жыццё, люблю цябе, люблю сябе!»

Вясной усё абуджаецца і становіцца прыгожым, прыгажэйце разам з дрэвамі, удыхайце непаўторны пах бэзу, спявайце песні гучным голасам, танцуйце дома і на працы, купіце кветкі ў бабульскі, з'ешце каробку цукерак, скажыце «дзякуй» прыбіральшчыцы, падарыце ўсмешку пажылому чалавеку, расцалуйце сваё дзіця, падкарміце бяздомную жывёліну, скажыце «сумую» бацькам і... хандрыце сабе на здароўе!

### КНІГА ПАД ПАДУШКАЙ ПЕРАД ЭКЗАМЕНАМ САПРАЎДЫ ДАПАМАГАЕ

**Такую думку выказала вядучы псіхолаг аддзела прыкладной псіхалогіі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусі Наталля САКОВІЧ.**

Паводле яе слоў, «выратавальныя рытуалы» — гэта адзін са старадаўніх, шырока распаўсюджаных спосабаў пераадолення цяжкасцяў у псіхалогіі — пераносе адказнасці на іншага. Гэтым «іншым» могуць быць і татэмныя прадметы. «Нават калі ідэя з кнігай пад падушкай сама па сабе здаецца прымітыўнай, насамрэч яна вельмі здорава можа дапамагчы ў сітуацыі трывогі. Калі той рытуал, які чалавек даўно практыкуе, яму дапамагае, трэба працягваць яго выкарыстоўваць», — адзначыла псіхолаг БелАПА.

Яна дадала, што карысна таксама пісаць шпаргалкі, нават калі імі не карыстацца. З аднаго боку, сітуацыя стрэсу — гэта дрэнна, але з іншага, па шматлікіх даследаваннях, чалавек у падобнай сітуацыі запамінае больш і хутчэй, ён больш уважлівы да глыбіннай, складанай інфармацыі. Усё таму, што яму трэба пераадолець стрэс. «Калі мы пішам шпаргалкі, мы штучна ствараем сітуацыю экзамену і становімся гатовымі да яго псіхалагічна, супакойваемся», — лічыць Наталля Саковіч.

**Вольга ШАЛЯГОВІЧ, БЕЛТА.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Стадыён у Давыд-Гарадку пасля рэканструкцыі карыстаецца папулярнасцю.

Год здароўя

# ДОБРА СПЛАНАВАНАЕ САМАЗАБОЙСТВА?

**Сучасная медыцына лічыць табакакурэнне хранічным атручэннем, якое носіць масавы характар. І медыкі зусім не схільныя разглядаць гэту шкодную звычку як асабістую справу кожнага чалавека, паколькі курцы заўсёды знаходзяцца побач з членамі сваёй сям'і, калегамі, суседзямі па лесвічнай пляцоўцы і г.д. Больш за тое, у Міжнароднай класіфікацыі захворванняў тытунёвая залежнасць, разам з алкагольнай і наркатычнай залежнасцю, была аднесена да катэгорыі «разумовыя і паводзінскія расстройствы, абумоўленыя выкарыстаннем псіхаактыўных спалучэнняў».**

— Па даных Мінскага гарадскога кардыялагічнага дыспансэра, 35,5 працэнта пацыентаў, якія перанеслі інфаркт міякарда, не змаглі развітацца з цыгарэтай нават пасля смяротнай небяспечнай хваробы, — расказвае **загадчык арг-метададдзела дыспансэра Алёна ФІЛІПАВА**. — Прычым асабліва «небаязлівыя» прызнаюцца, што знаходзілі магчымасць зрабіць некалькі зацяжак нават у вострым перыядзе захворвання, знаходзячыся яшчэ ў стацыянары і ігнаруючы забароны ўрачоў. Акрамя таго, ад 27 да 32 працэнтаў хворых, якія перанеслі інфаркт міякарда і адмовіліся ад курэння ў першыя месяцы пасля захворвання, паступова забываюць аб перанесенай хваробе і зноў цягнуцца за цыгарэтай ужо на працы першага года або пазней.

Кожны год 31 мая на планеце праводзіцца Сусветны дзень некурэння. У Беларусі сёлета яму будзе папярэднічаць двухтыднёвая антытытунёвая акцыя пад лозунгам «Калі хочаш доўга жыць, павінен кінуць ты курыць», якая стартавала 15 мая. Беларускія медыкі даўно б'юць трывогу: узроставы парог курэння ў нашай краіне пастаянна знікаецца. Так, пры праведзеным нядаўна анкетаванні 10-класнікаў сталічных школ 86 працэнтаў апытаных паведамілі, што сярод іх равеснікаў ёсць курцы. Упершыню паспрабавалі курыць у 10 гадоў 21 працэнт падлеткаў. 85 працэнтаў прызналіся, што дастаць цыгарэты для іх не з'яўляецца ніякай праблемай. На момант правядзення апытання не спрабавалі курыць толькі 45 працэнтаў апытаных, для задавальнення курылі 20 працэнтаў, для зняцця стрэсу — 6 працэнтаў, для таго, каб трапіць у кампанію — 8 працэнтаў.

Праведзенае сярод трэцякласнікаў сацыялагічнае апытанне паказала, што 62 працэнты апытаных выхоўваюцца ў сем'ях, дзе адзін ці два бацькі курыць. 17 працэнтаў ужо самі спрабавалі курыць, больш за тое 7 працэнтаў упэўнены, што калі яны стануць дарослымі, то будуць курыць. На гэтым фоне, напэўна, слабым суцяшэннем стане вынік апытання, праведзенага сярод навучэнцаў 8—11 класаў мінскіх школ, падчас якога высветлілася, што ***цыгарэты сярод падлеткаў усё ж менш папулярныя, чым піва: так, калі курыць ад 4 да 21 працэнта рэспандэнтаў, то піва спажываюць ад 41 да 62 працэнтаў апытаных***.

Па словах галоўнага ўрача Мінскага гарадскога цэнтра здароўя Івана Тарашкевіча, краіны Заходняй Еўропы змяніліапошнім часам сваю тактыку ў барацьбе з табакакурэннем і перайшлі ад масавых асветніцкіх акцый, якія не прыносяць чаканага эфекту, да задзейнічання адміністрацыйнага рэсурсу.

У Беларусі таксама створана магутная прававая база, якая павінна абараняць некурцоў ад людзей з цыгарэтай. Яшчэ шэсць гадоў таму быў падпісаны Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўным рэгуляванні вытворчасці, абароту, рэкламы і спажывання тытунёвай сыравіны і тытунёвых вырабаў», згодна з якім забараняецца курыць ва ўстановах аховы здароўя, адукацыі, культуры, спорту, на аб'ектах гандлю і бытавога абслугоўвання насельніцтва, аб'ектах грамадскага харчавання, у памяшканнях органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых органаў улады і г.д., за выключэннем месцаў, спецыяльна прыстасаваных для гэтых мэтаў. Ёсць таксама пастановы і загады МНС, міністэрстваў аховы здароўя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і г.д. Але ці выконваюцца ўсе гэтыя дакументы?

— На маю думку проста заба-раняць курцам курыць — не зусім правільна, — дзеліцца сваімі думкамі Іван Тарашкевіч, — паколькі любыя забароны вяртаюцца бумерангам. Трэба выдзяляць для курцоў асобныя, абсталяваныя для гэтых мэтаў месцы. Да нас часта звяртаюцца са скаргамі на суседзяў-курцоў. Між іншым, існуе Загад Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ад 1999 года № 177, згодна з якім не дапускаецца курэнне ў падсобных памяшканнях кватэры, дзе пражываюць некалькі наймальнікаў ці ўласнікаў, а таксама ў дапаможных памяшканнях (вестыбюлях, калідорах, галерэях, лесвічных маршах і пляцоўках, ліфтавых холах). На парушальнікаў-курцоў можна накласці штраф у памеры трох базавых велічынь, а зрабіць гэта могуць галоўны інжынер ці начальнік ЖЭСа. Але ці чулі вы аб падобных пакараннях?

Да таго ж па сёння невядома, ці можна курыць на прыпынках транспарту: прыпынак — гэта грамадскае месца ці не. Яснасць у гэтым пытанні пакуль адсутнічае. У цягніках далёкага накіравання таксама няма вагонаў для курцоў, таму дымам вымушаны дыхаць усе: і старыя, і немаўляты.

Між іншым, у адрозненне ад курцоў людзі, якія яго акружаюць, вымушаны ўдыхаць дым, які ўтрымлівае ў 50 разоў больш канцэрагенаў і аміяку, у пяць разоў больш вокісу вугляроду і ўдвая больш смолаў і нікаціну. Пры гэтым рызыка развіцця раку лёгкіх пры пасіўным курэнні ў членаў сям'і курца ў 3,5 раза вышэйшая, чым у сем'ях, дзе ніхто не курыць.

На думку Івана Тарашкевіча, некурцоў трэба неяк заахвочваць: **«Я прапанаваў бы пры паступленні на медыцынскія, педагагічныя спецыяльнасці і журналістыку ўлічваць, ці курыць абітурыент, і пры іншых роўных умовах аддаваць перавагу людзям без гэтай шкоднай звычкі.** Ні для каго не сакрэт, што сёння вельмі многія медыкі, якія лепш за іншых інфармаваныя аб наступствах курэння, таксама не могуць пазбавіцца ад сваёй залежнасці...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## МІКРАХВАЛЁЎКА: ПАМОЧНІК ЦІ ХАТНІ АГРЭСАР?

**Спецыялісты сцвярджаюць, што даброты цывілізацыі, якія нас акружаюць, — чайнікі, пральныя машыны, прасы, настольныя лямпы, халадзільнікі, плэеры, тэлевізары, камп'ютары, — з'яўляюцца крыніцай электрамагнітных выпраменьванняў. І найбольш інтэнсіўнымі з іх могуць быць мікрахвалевыя печы. Наколькі небяспечнае іх выпраменьванне для здароўя чалавека?**

Як зазначае **вядучы інжынер лабараторыі фізічных фактараў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Мікалай БАБЕЛЬ**, аснова кожнай печы — гэта магнетрон, які генерыруе электрамагнітныя хвалі на частаце 2450 МГц. У прынцыпе гэта звычайныя радыёхвалі, толькі вельмі кароткія, з даўжынёй хвалі 12 см. Мікрахвалевы дыяпазон — найбольш біялагічна актыўны. Калі ўзровень выпраменьвання перавышае дапушчальныя нормы, гэта можа негатыўна паўплываць на здароўе, асабліва дзяцей і жанчын.

У сучасных мікрахвалевых печах крыніца выпраменьвання надзейна схавана ўнутры і добра экраніравана. ЗВЧ-печы ў працэсе выпрацоўкі праходзяць строгі кантроль з вымярэннем узроўню выпраменьвання вакол уключанай печы і ў продаж паступаюць з гігіенічным заключэннем аб іх бяспецы.

Асноўная задача пры іх выкарыстанні, такім чынам, заключаецца ў тым, каб не даць «джыну» вырвацца на паверхню. На працягу першых двух-трох гадоў печы, як правіла, захоўваюць сваю герметычнасць, аднак у працэсе эксплуатацыі іх канструкцыя можа быць пашкоджаная. Самым слабым месцам печы з'яўляюцца дзверцы. У іх механізме задзейнічаны два засцерагальнікі, якія адключаюць магнетрон, як толькі дзверцы адкрываюцца. Але калі дзверцы прылягаюць няшчыльна, мікрахвалевая энергія можа пранікаць скрозь шчыліны.

Таму майце на ўвазе, што пракладка паміж дзверцамі і корпусам павінна быць абсалютна чыстай. Нельга дапускаць накаплення на ёй тлушчавых плямаў, крошак або кавалачкаў ежы. Нават маленькая ячная шкарлупіна, якая прылілпа да пракладкі, можа разбавіць вашу печ герметычнасці. Пры перавышэнні нарматыву — 10 мікрават на квадратны сантыметр пры адлегласці 50 см ад крыніцы — печ неабходна аддаць у рамонт або замяніць.

Адзінае супрацьпаказанне пры карыстанні гэтымі прыладамі адносіцца да людзей з ужыўленымі сардэчнымі стымулятарамі. Паколькі такія стымулятары электрычныя, знешнія крыніцы выпраменьвання могуць стварацьперашкоды ў іх працы. Цяпер многія фірмы-вытворцы ўказваюць у дакументацыі на гэту небяспеку.

Нават калі вы абсалютна здаровыя, усё ж не варта ўстанаўліваць мікрахвалёўку непасрэдна побач з абедзенным сталом або плітой, вельмі доўга стаяць або сядзець каля яе пры ўключаным рэжыме. Не забывайцеся, што ў такіх печах нельга прымяняць металічны посуд або рашоткі, нельга пакідаць унутры металічныя прадметы — нажы, відэльцы. Выкарыстоўвайце толькі шкляны або керамічны посуд і сачыце, каб ён не награваўся ўнутры печы.

Майце на ўвазе, што большасць печаў маюць рэжым слабага падагрэву страў, бо электрамагнітныя хвалі пранікаюць неглыбока. Таму зручней за ўсё выкарыстоўваць ЗВЧ-печы галоўным чынам для падагрэву ежы. Не варта гатаваць у іх прадукты, якія доўга захоўваліся ў халадзільніку і недастаткова размарозіліся.

Кароткі працэс прыгатавання ежы дае несумненную перавагу мікрахвалёўкам, бо ўсе харчовыя рэчывы ў прадуктах разбураюцца значна менш, чым пры звычайным смажанні. Агародніну можна гатаваць без вады, поўнасцю захаваўшы ў ёй вітаміны. ЗВЧ-печ дазваляе абыходзіцца мінімальнай колькасцю тлушчаў або наогул без іх.

Калі карыстацца ЗВЧ-печчу грамотна, па інструкцыі, правільна яе размясціць і старанна яе даглядаць, а пры куплі пацікавіцца найўнасцю гігіенічнага заключэння, то ніякай пагрозы для здароўя яна не выклікае.

**Наталля КУХАРЭНКА.**

Ешце на здароўе!

## Чарнасліў абароніць зубы і дзясны

**Мексіканскі вучоны запэўнівае, што адкрыў просты, але вельмі эфектыўны сродак барацьбы з карыесам і запаленнем дзясноў. Усё, што трэба рабіць — дык гэта рэгулярна есці чарнасліў. Але тут галоўнае не перастарацца, бо ён валодае паслабляльным эфектам. Калі ж ведаць меру, то можна замарудзіць і нават знішчыць бактэрыі, якія жывуць у поласці роту.**

Да пачатку даследаванняў вучонага падштурхнулі старадаўнія кулінарныя рэцэпты, у якіх чарнасліў раілі прымяняць, калі неабходна было як мага больш працяглы час захаваць мяса свежым, а магчымасці трымаць яго ў холадзе не было. Вучоны змог вылучыць хімічны кампанент, які і надае чарнаслівуякія цудоўныя антыбактэрыяльныя якасці. Гэта рэчыва эфектыўна таксама і супраць бактэрый, якія прыводзяць да ўзнікнення зубнога каменю.

Акрамя таго, чарнасліў у два разы больш эфектыўна чым іншыя натуральныя сродкі змагаецца з захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы. Яго рэкамендуецца ўжываць пры гіпертанічнай хваробе і захворваннях жоўцевага пухіра, бо пектынавыя рэчывы, якія ў ім утрымліваюцца, спрыяюць вывядзенню халестэрыну з арганізма. Чарнасліў карысны і пры захворваннях нырак, бо солі калію, на якія ён багаты, спрыяюць вывядзенню з арганізма лішку вады і кухоннай солі. Солі калію робяць чарнасліў карысным пры лячэнні ўсіх сардэчна-сасудзістых захворванняў. Невыпадкова альтэрнатыўная медыцына часта назначае гіпертонікам «чарнаслівавую» дыету.

**ПЮРЭ З ЧАРНАСЛІВУ З УЗБІТЫМІ ВЯРШКАМІ**

*Чарнасліў — 0,5 кг, цукар — 0,25 кг, вяршкі — 0,25 л, цукровая пудра — 50 г, ванілін на кончыку нажа.*

Чарнасліў прапусціць праз мясарубку, усыпаць цукар і хвілін пяць паварыць пюрэ на слабым агні, дадаць ванілін. Перамяшаць і астудзіць. Узбіць вяршкі з цукровай пудрай, разлажыць у вазачкі і пакласці зверху ўзбітыя вяршкі.

**СУФЛЕ З ЧАРНАСЛІВУ**

*0,5 кг чарнасліву, 6 ст. лыжак цукру, 12 яечных бялкоў, 1 ч. лыжка размякчанага сметанковага масла, 2,5 шклянкі малака ці вяршкоў, 1 ст. лыжка цукровай пудры.*

Чарнасліў прамыць, заліць халоднай вадой, закрыць каструлю і варыць пры слабым кіпенні да мяккасці. Потым ваду зліць, а чарнасліў працерці праз сіта ці прапусціць праз мясарубку. У атрыманае пюрэ ўсыпаць цукар, і, памешваючы драўлянай лапатачкай, варыць да той пары, пакуль маса не загусцее.

Узбіць у пышную пену яечныя бялкі і, хутка памешваючы, порцыямі ўвесці гарачае пюрэ з чарнаслівуМасу выкласці горкай у змазаную сметанковым маслам глыбокую форму, каб суфле займала адну трэцюю частку аб'ёму посуду, паставіць у нагрэтую духоўку і выпякаць 10—15 хвілін пры 200—250 градусаў. Гатовае суфле выкласці на блюда і адразу ж падаць на стол.

**ЧАРНАСЛІЎ ФАРШЫРАВАНЫ**

*Чарнасліў, сыр цвёрды — 150 г, арэхі грэцкія — 100 г, маянэз.*

Чарнасліў прамыйце, адварыце ці замачыце ў халоднай вадзе на суткі. Надзярыце сыр і перамяшайце з паўнормай здробненых арэхаў і невялікай колькасцю маянэзу. Напоўніце чарнаслівупригатаваным фаршам. Упрыгожце чарнаслівуарэхамі, якія засталіся. Раскладзіце на блюда, якое заслана лістамі зялёнай салаты.

Смачна есці!

**Падрыхтавала Ірына ПЯТРОВІЧ.**

## СТРАХУЮЦЬ ПАМЫЛКІ. УРАЧЭБНЫЯ

У Мінску практыку страхавання персаналу ад урачэбных памылак выкарыстоўваюць 25 устаноў аховы здароўя. Паслугамі страхоўшчыкаў найчасцей карыстаюцца стаматолагі, гінеколагі, хірургі, рэаніматолагі, анестэзіёлагі, трансплантолагі. У апошніх — самы высокі кошт страхоўкі. Мінімальная сума складае не менш як 100 базавых велічынь (каля $1,7 тыс. у эквіваленце).

## БЕЛАРУСЫ — СПАРТЫЎНАЯ НАЦЫЯ

**Сістэматычна спартыўныя залы наведваюць 1 мільён 400 тысяч беларусаў. Такія даныя прывёў напярэдадні Дня работнікаў фізкультуры і спорту Павел Няпрахін, начальнік управлення фізічнай культуры Міністэрства спорту і турызму.**

«У мінулым годзе наша краіна забяспечыла насельніцтва фізкультурна-спартыўнымі паслугамі на суму ў памеры 69 мільярдаў рублёў», — заўважыў ён.

У Беларусі дзейнічае 26 рэспубліканскіх галіновых спартыўных клубаў. Для тых жа, хто па розных прычынах хоча займацца спортам у хатніх умовах, у наступным годзе ў продажы з'явяцца праграмы па аэробіцы, шэйпінгу, аздараўленчай гімнастыцы, якія распрацавалі ў нашай краіне супрацоўнікі навукова-даследчага інстытута.

Сёлета пройдзе 40 галіновых спартакіяд, агульнарэспубліканскія эстафеты, у прыватнасці велаэстафета, якая стартуе ва ўсіх раёнах, а фінішуе — на Кастрычніцкай плошчы Мінска. Таксама ў сталіцы адбудзецца Міжнародны марафон.

**Ірына ПРЫМАК.**

## А ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ УСПОМНІЛА

У міліцыю звярнулася пенсіянерка, якая пражывае па вул. Фабрычнай у Баранавічах, і заявіла, што ў яе ўкралі грошы — больш за мільён.

Да састарэлай заходзілі толькі суседзі, і сышчыкі найперш узяліся за іх. Злодзеяне не знайшлі, бо праз тыдзень знайшліся грошы. Пенсіянерка ўспомніла, дзе іх хавала.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


**ОАО «Универсам «Северный»**

**извещает своих акционеров, что 29 мая 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3, состоится внеочередное общее собрание акционеров.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об изменении размера уставного фонда ОАО «Универсам «Северный».
2. О внесении и утверждении изменений и дополнений в Устав ОАО «Универсам «Северный».
3. О сделках Общества.

**Акционеры при себе должны иметь удостоверение личности.**

**Начало регистрации — 10.30.**

**Телефон для справок — 2 61 13 61.**

УНН 100356386 **Совет директоров Общества.**


## Майскія грымоты

Фота Васіля ЗЯНЬКО.

Сустрэчы

# «Не трэба плакаць, што мова гіне...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Што мо цікава — атрымліваць яго прыязджала разам з сынам, прычым — у дзень сваёй атэстацыі. Але ўражанняў ад сустрэчы ў рэдакцыі было столькі, што тут жа стала дзяліцца імі з калегамі. Яны, як высветлілася, газету таксама чытаюць і ведаюць...

За размовамі пра яе неяк забыліся, што... трэба хвалявацца. І таму, напэўна, атэстацыю прайшлі ўсе. І, як кажуць, лёгка.

Па-настаўніцку грунтоўна падрыхтаваны расказ Ліліі Мяфодзьеўны журналістам заставалася хіба што дапоўніць — звесткамі пра калектыў, газетную кухню, асабістыя планы, адказаць на досыць нечаканыя пытанні будучай каляжанкі ды правесці традыцыйную звяздоўскую віктарыну. «Якой узнагароды быў удастоены рэдактар «Звязды», які аднавіў яе выпуск у гады Вялікай Айчыннай?», «На чым падчас вайны друкаваліся асобныя нумары, калі не было газетнай паперы?», «Куды ходзіць аднайменны фірменны цягнік?», «Колькі на тэрыторыі Беларусі помнікаў нашаму выданню?»...

Хтось з будучых студэнтаў (хочацца ж верыць, што ўсе паступяць...), за правільны адказ быў «узнагароджаны» фірменным звяздоўскім блакнотам і асадкай, хтось — кепачкай ці майкай, хтось — кнігай Валянціны Доўнар «Праз каханне»... Галоўнае ж, будучыя інтэлегенты, дасць Бог, запомнілі, што ў краіне з 1917 года выдаецца тая самая «родная газета на роднай мове», пра якую ў зале прагучаў цэлы трактат. Даслоўна:

1. Не трэба плакаць, што мова гіне.

2. Трэба ствараць на ёй шэдэўры.

3. І тады — мова зробіцца фактам.

Так сваю ролю ў захаванні найгалоўнейшай спадчыны вызначыў пісьменнік Анатоль Кірвель.

Перафразуючы яго радкі, можна, відаць, размеркаваць і ролі іншыя, бо яно мо і насамрэч — не трэба плакаць... Трэба — нам — журналістам, выпускаць цікавую беларускую газету, усімі сродкамі шукаць ёй новых адданых чытачоў. І ўжо ім — па магчымасці — не здраджаваць сваёй «Звяздзе», сваёй роднай мове, — прапагандаваць, падтрымліваць. Як рабілі гэта прадзеды і дзяды, як рабілі бацькі. І (хочацца верыць) будуць рабіць дзеці.

**Валянціна ДОЎНАР, Вікторыя ЦЕЛЯШУК, Марына БЕГУНКОВА (фота).**

## ЗЛОДЗЕЯ СПЫНІЛА... ДРЭВА

**Пасажыр, якога з Мінска ў пасёлак Бальшавік падвозіў вадзіцель прыватнага ўнітарнага прадпрыемства, па дарозе напаў на кіроўцу, схапіў яго за шыю і, заламаўшы руку, выпіхнуў з аўто і знік.**

Праз паўтары гадзіны ўгоншчыка ўдалося «запеленгаваць» паблізу пасёлка Бальшавік: злачынца паспрабаваў на аўтамабілі ўцячы ад супрацоўнікаў міліцыі. Аднак не справіўся з кіраваннем, і аўтамабіль урэзаўся ў дрэва. Затрыманы, як высветлілася, 22-гадовы непрацуючы жыхар вёскі Дубаўляны, раней судзімы за разбой, крадзяжы, угоны і хуліганства.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## РАСКРЫТА ЗАКАЗНОЕ ЗАБОЙСТВА

Праз 6 гадоў пасля ўчынення злачынства высветлілася, што жанчына ўбрала жыхарку сталіцы па заказе...

Крымінальнае здарэнне было зафіксавана 4 снежня 2002 года: тады ў дзве гадзіны дня 36-гадовая непрацуючая, якая знаходзілася ў кватэры 47-гадовай жанчыны на вуліцы Пляханава, утапіла гаспадыню ў ванне. Як меркавалася, прычынай забойства стала спрэчка. Аднак у ходзе расследавання гэтай справы праваахоўнікам удалося ўстанавіць, што забойства за тры тысячы долараў ЗША арганізавала жанчына, якая з 2002 года пражывае за мяжой. Апошняя пайшла на злачынства, каб завалодаць кватэрай няшчаснай ахвяры. Узбуджана крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Адказ на крытычную заўвагу

# ПАТРЭБНЫ СРОДКІ. І БУДЗЕ НОВЫ ВОДАПРАВОД

**15 красавіка ў газеце быў змешчаны матэрыял «На заўвагу адносна дэбюракратызацыі адказалі... са спазненнем». Гаворка ў ім вялася пра сітуацыю вакол водаправода ў вёсцы Данілавічы Дзятлаўскага раёна: яшчэ ў канцы лютага жыхарамі былі выказаны нараканні, што для яго рамонту нічога не робіцца, а раённыя ўлады адрэагавалі на скаргу вяскоўцаў толькі ў канцы першай дэкады красавіка. Прычым, даволі коратка, маўляў, так, водаправод выйшаў са строю, будзе пракладзены новы. Вось мы і задалі пытанне: ці варта было (асабліва калі прыгадаць дэбюракратызацыю) рыхтаваць такі адказ амаль паўтара месяца? Кіраўніцтва Дзятлаўскага райвыканкама палічыла неабходным выказацца з гэтай нагоды.**

Нам паведамілі, што пытанне разглядалася камісійна з выездам на месца. Водаправод у вёсцы Данілавічы знаходзіцца на балансе СВК «Граніт-Агра» і напачатку выпраўленне недахопаў даручалася гаспадарцы. Аднак, улічваючы яго вялікую працягласць і, адпаведна, значныя выдаткі на рамонт, што патрабаваліся, была зроблена выснова: з-за адсутнасці сродкаў СВК яго не асіліць.

Каб вырашыць пытанне, што ўзнікла, 19 красавіка была створана камісія (выходзіць, пасля крытыкі ў «Звяздзе». — **С. Р.**). Пры правядзенні земляных работ (а першапачаткова адрамантаваць водаправод планавалася да 25 лютага) яна прыйшла да высновы: рамонт немэтазгодны ў сувязі з поўным фізічным зносам водапровада.

«Таму было прынята рашэнне пракласці новую сетку водаправода ад вёскі Круцілавічы сіламі раённага ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Тэрмін 1 кастрычніка 2008 года ўстаноўлены ў сувязі з тым, што для пракладкі сеткі водаправода неабходна вырабіць праектна-каштарысную дакументацыю і знайсці грашовыя сродкі на набыццё матэрыялаў і правядзенне работ, паколькі гэты водаправод не быў уключаны ў тытульны спіс аб'ектаў капітальнага будаўніцтва на 2008 год».

Думаецца, такі адказ задаволіць жыхароў вёскі Данілавічы больш, чым папярэдні. Безумоўна, давядзецца пацярпець нязручнасці пэўны час, але ж перспектыва мець новы водаправод вартая таго. Самае галоўнае, каб патрэбныя сродкі былі знойдзены. Толькі ў гэтым выпадку пакуты вясковых жыхароў могуць быць апраўданымі, ці не так?..

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Погляд

# Спешка з прыняццем Закона можа сыграць супраць спажыўцоў?

**Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў» Ганна Суша лічыць заўчасным слуханне ў другім чытанні на веснавой сесіі беларускага парламента законапраекта «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў».**

— На думку спажывецкай грамадскасці, дадзены дакумент патрабуе дапрацоўкі, бо ў адваротным выпадку правы спажыўцоў могуць істотна пацярпець, — патлумачыла Ганна Суша. — Так, напрыклад, у законапраекце знікла норма з артыкула «Судовая абарона правоў спажыўца», якая прадастаўляла права кампенсацыі спажыўцам судовых выдаткаў, звязаных з разглядам іх справы. Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў», які дзейнічае сёння, — гэта закон прамога дзеяння і ў ім няма адсылачных артыкулаў, а ў падрыхтаваным законапраекце такія адсылачныя артыкулы з'явіліся, што вельмі непажадана. Да таго ж з Закона знікла права на бяспечнасць у самастойным выглядзе. У падрыхтаваным законапраекце права на бяспечнасць стала складовай часткай права на якасць, хоць забеспячэнне права на якасць і забеспячэнне права на бяспечнасць патрабуюць рознага дзяржаўнага рэгулявання і з'яўляюцца самастойнымі паняццямі.

Паводле слоў старшыні Беларускага таварыства абароны спажыўцоў, за апошняе паўгоддзе ў Беларусі было прынята некалькі важных дакументаў, у тым ліку рашэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь «Да пытання аб правамоцнасці адмовы спажыўцам у кампенсацыі выдаткаў, панесеных імі для аднаўлення парушаных правоў». І цяпер асобныя нормы законапраекта трэба дапрацоўваць з улікам гэтых дакументаў. Такім чынам, Беларускае таварыства абароны спажыўцоў прапануе ўнесці ў новую рэдакцыю закона асобным пунктам права спажыўцоў на бяспечнасць тавараў і паслуг, занатаваць вызваленне спажыўцоў ад выплаты дзяржаўнай пошліны пры падачы касацыйных і наглядных скаргаў у суды і органы пракуратуры і пашырыць правы грамадскіх аб'яднанняў, якія займаюцца абаронай спажыўцоў.

На сёння Беларускае таварыства абароны спажыўцоў з'яўляецца моцнай грамадскай арганізацыяй і мае 48 арганізацыйных структур у гарадах, абласных і раённых цэнтрах Беларусі. За мінулы год у Беларускае таварыства абароны спажыўцоў і яго арганізацыйныя структуры звярнуліся за дапамогай 29,3 тысячы чалавек. Абарона ў дасудовым і судовым парадку ажыццяўлялася ў 3,5 тысячы выпадках. Таварыствам і яго арганізацыйнымі структурамі былі заяўлены 1762 прэтэнзіі і 97 іскаў. Спажыўцам было кампенсавана матэрыяльнай шкоды на суму 1 114 304 843 рублі і маральнай шкоды на суму 98 285 000 рублёў.

Асноўная задача, якая стаяла перад распрацоўшчыкамі законапраекта, — зрабіць узаемадносіны ўсіх суб'ектаў рынку больш карэктнымі і забяспечыць дадатковую абарону правоў спажыўцоў. Таму, на думку Ганны Сушы, самым разумным было б перанесці слуханне дапрацаванага законапраекта на восеньскую сесію парламента.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**ОАО «Минский приборостроительный завод»**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже недвижимости, расположенной в г. Минске по пр. Независимости, 58: комплекса зданий корпусов №№ 19, 19а, 40 общей площадью 7 045,3 кв. м.

Начальная цена продажи — **23 398 800 000** рублей РБ с НДС.

Задаток в размере 2 % от начальной цены объекта перечисляется на расчетный счет ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012000620011 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНП 100363840.

Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.

**Аукцион состоится 28 мая 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58.** Заявления и необходимые документы принимаются до 17.00 27 мая 2008 г. по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58, ком. 603.

**Справки по тел. 8 017 293 94 40, факс 8 017 331 41 97.**

# КОДЭКС ПРАЦОЎНЫ, КОДЭКС ЖЫЛЛЁВЫ: ШТО, ДЛЯ КАГО І ЯКІЯ ЎМОВЫ?

**На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць *загадчык юрыдычнай кансультацыі галоўнага прававога ўпраўлення апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімір Іванавіч ШЭЛКОВІЧ* і *намеснік загадчыка юркансультацыі Васіль Мікалаевіч КОРСУК***

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 15 мая.)*

***☎ — У нашай арганізацыі афіцыйны працоўны дзень 8 гадзін, але на самай справе ён можа працягвацца 9—10. Як даказаць перапрацоўкі? І якім павінен быць перапынак на абед?***

**Аляксандра Касціцына,** *г. Мінск*

— Увогуле дакладны ўлік працоўнага часу — прамы абавязак наймальніка. І любыя звышурочныя дапушчальныя толькі па прапанове самога работніка або са згоды таго ж работніка ў выпадку прапановы наймальніка. Прычым фіксаванне «стандартных» 8 гадзін пры больш працяглай рабоце з'яўляецца парушэннем заканадаўства, і гэту сітуацыю спачатку лепш за ўсё абмеркаваць з удзелам прафсаюза з кіраўніцтвам арганізацыі. А калі гэта не прынясе выніку — можна звярнуцца ў прававую інспекцыю прафсаюзаў ці дзяржаўную інспекцыю працы. Што ж да перапынку на абед, то, паводле Працоўнага кодэкса, яго працягласць павінна складаць не менш за 20 хвілін.

***☎ — Колькі бальнічных можна браць на працягу года? І як разлічваецца аплата бальнічных — выходзячы з заробкаў з улікам або без уліку прэмій?***

**Аксана Леанідаўна Сушко,** *Слонімскі раён*

— На працягу года аплаце падлягаюць не больш за 120 дзён знаходжання на «бальнічным" запар або не больш за 150 дзён знаходжання на «бальнічным» з перапынкамі. А ў выпадку захворвання на туберкулёз гэтыя нормы складаюць адпаведна 180 і 240 дзён.

Прычым у выпадку неабходнасці больш працяглага лячэння і адпаведнага заключэння медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі, аплаце можа падлягаць і большая колькасць дзён. Што ж да памераў «бальнічных», то іх разлік робіцца выходзячы не толькі з акладу, а з усіх выплат, на якія робіцца налічэнне ўзносаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання.

***☎— Працую настаўнікам пачатковай школы і па сумяшчальніцтву — прыёмнай маці. Ці павінны заключыць са мной як з прыёмнай маці кантракт? З улікам таго, што апроч прыёмнага дзіця-першакласніка ў мяне ёсць сваё 9-гадовае дзіця, ці магу я працаваць і ў школе, і прыёмнай маці на дзве поўныя стаўкі? Чаму ў разліковым лісту ку як прыёмнай маці мне ставяць 21 дзён адпрацоўкі — фактычна я даглядаю прыёмнае дзіця ўсе 30 дзён у месяц? Ці павінны мне як прыёмнай маці плаціць кампенсацыю за нявыкарыстаны адпачынак? Бо плаціць кампенсацыю мне адмаўляюцца і кажуць, каб я скарысталася водпускам і на гэты час аддала дзіця ў прытулак. Ці павінны пры налічэнні зарплаты ў школе прымаць пад увагу адукацыю, педстаж і катэгорыю?***

**Валянціна Іванаўна,** *Лельчыцкі раён*

— Варта заўважыць, што дзейнасць у якасці прыёмных бацькоў — гэта таксама працоўная дзейнасць. І ўпраўленне ці аддзел адукацыі павінны заключыць з прыёмнымі бацькамі працоўны дагавор — па двухбаковай дамоўленасці, гэта можа быць як працоўны дагавор на няпэўны тэрмін, так і кантракт. Паколькі дзейнасць у якасці прыёмных бацькоў з'яўляецца зноў-такі працоўнай, яна залічваецца ў працоўны стаж і рэгулюецца Працоўным кодэксам. Працоўны кодэкс вызначае, што работа па сумяшчальніцтве можа выконвацца не больш чым на палову стаўкі. Адпаведна, вы можаце працаваць на 1 стаўку ў школе і на 0,5 стаўкі прыёмнай маці або на поўную стаўку прыёмнай маці і на 0,5 стаўкі — у школе. Любая работа выконваецца па пэўных нормах. Таму прыёмным бацькам ставіцца тая ж норма гадзін, што і іншым работнікам, а адсюль — і запіс аб 21 дні адпрацоўкі ў месяц.

Прыёмным бацькам працоўны водпуск прадастаўляецца згодна з графікам, які складае ўпраўленне ці аддзел адукацыі. І, дарэчы, паводле Палажэння аб прыёмных бацьках ад 28 кастрычніка 1999 года, на час працоўнага водпуску органы апекі і папячыцельства павінны наладзіць летні адпачынак прыёмных дзяцей. Водпуск можна замяніць і грашовай кампенсацыяй. Але толькі па пагадненні з найманым, да таго ж заканадаўства дазваляе замяніць кампенсацыяй толькі частку водпуску — як мінімум 21 каляндарны дзень адводзіцца менавіта на адпачынак.

Настаўнікі з сярэдняй спецыяльнай і з вышэйшай адукацыяй тарыфікуюцца па-рознаму. У залежнасці ад педагагічнага стажу настаўніку прысвойваецца катэгорыя. А чым вышэйшая катэгорыя — тым вышэйшая і аплата працы.

***☎ — Адкажыце, калі ласка, колькі гадзін павінны працаваць у школе настаўнікі падчас летніх канікулаў, калі ўжо няма заняткаў?***

**Людміла Барысаўна Сергуч,** *г. Брэст*

— З улікам таго, што падчас летніх канікулаў заняткаў няма, тут павінна дзейнічаць агульная, вызначаная для ўсіх работнікаў норма працоўных гадзін у месяц.

***☎— Завуць мяне Ірына, я з Мінска. Заява на рэгістрацыю маці, якая пражывае разам з намі ў двухпакаёвай кватэры, была пададзена 28 снежня мінулага года. Аднак сама рэгістрацыя адбылася 2 студзеня сёлета. У сувязі з гэтым узнікае пытанне: ці павінны былі ўключыць маці ў склад сям'і пры пастаноўцы ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў?***

— Цяпер паставіць на ўлік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, могуць толькі ў выпадку не менш чым 5-гадовай рэгістрацыі ў сталіцы. Падобная норма датычыцца і вас — дата рэгістрацыі вызначаецца менавіта па адзнацы ў пашпарце.

***☎ — Зараз мне 30, а жонцы 29 гадоў. Стаім у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў як маладая сям'я. На якія льготы мы можам разлічваць падчас будаўніцтва?***

**Дзмітрый**, *г. Мінск*

— Ніякіх пераваг непасрэдна па «руху» чаргі для маладых сем'яў няма. Аднак калі чарга падыдзе, адна вельмі істотная льгота з'явіцца — маладая сям'я мае права выкарыстаць як ільготны крэдыт, так і жыллёвую субсідыю адначасова.

***☎ — Чула, што ў бліжэйшы час павінна змяніцца норма, якая не дазваляе ўключаць у жыллёва-будаўнічыя кааператывы райцэнтраў жыхароў вёсак. Ці так гэта? І калі тут трэба чакаць змяненняў?***

**Людміла Мікалаеўна Прыёмка,** *Уздзенскі раён*

— Жыллёва-будаўнічыя кааператывы адносяцца да арганізацый забудоўшчыкаў. А парадак і ўмовы ўключэння грамадзян у арганізацыі забудоўшчыкаў рэгулююцца Палажэннем, якое зацверджана ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 года № 43. Згодна з Палажэннем, грамадзяне, якія будуюцца з дзяржаўнай падтрымкай, уключаюцца ў арганізацыю забудоўшчыкаў рэгулююцца Палажэннем, якое зацверджана ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 года № 43. Згодна з Палажэннем, грамадзяне, якія будуюцца з дзяржаўнай падтрымкай, уключаюцца ў арганізацыю забудоўшчыкаў на месцы знаходжання на ўліку. Тады як грамадзянам, якія будуюцца без дзяржаўнай падтрымкі за кошт уласных сродкаў, знаходзіцца на ўліку не абавязкова. Такім чынам, прэтэндаваць на будаўніцтва ў райцэнтры вы можаце — аднак без прадастаўлення дзяржпадтрымкі. Гэта Палажэнне было прынятае нядаўна, і, напэўна, нам вядома, ніякіх змяненняў у ім у бліжэйшы час не прадугледжваецца.

***☎— Ці зможа мой родны брат прыватызаваць кватэру за чэкі «Жыллё», якія я яму падару?***

**Зянон Леанардавіч Таўпак,** *Астравецкі раён*

— Цяпер для прыватызацыі можна выкарыстоўваць як уласныя чэкі «Жыллё», так і падараныя мужам, жонкай, бацькамі, дзецьмі, усынаўляльнікамі, усыноўленымі асобамі, роднымі братамі і сёстрамі, бабулямі і дзядулямі, унукамі, а таксама чэкі, якія былі атрыманы ў спадчыну ці па рашэнні суда. Паколькі ж родныя брат ці сястра з'яўляюцца блізкімі сваякамі, ніякіх перашкод тут узнікнуць не павінна. Адно, што пры гэтым самі чэкі «Жыллё» павінны быць перарэгістраванымі.

***☎ — У нашым старым дзяржаўным доме без выгодаў, дзе прапісаныя маці, бацька, брат і я з дзіцем, плануюць зрабіць рэканструкцыю. У сувязі з гэтым ці магу я прэтэндаваць на новае жыллё? І ці будуць тут у мяне якія-небудзь ільготы па чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў?***

**Алеся,** *г. Вілейка*

— Калі рэканструкцыя пройдзе без высялення, то на час работ прадастаўляць новае жыллё вам не будуць. Не будзе ў такім выпадку і ніякіх ільгот па чарзе.

***☎ — Мы будуем кааператыў, пры гэтым для вылічэння памеру льготнага крэдыту ў складзе сям'і ўлічылі мяне, мужа і траіх дзяцей, а вось маці мужа, якая жыве з намі, чамусьці не. Гэта правільна?***

**Ірына Пятроўна Хацько,** *Лунінецкі раён*

— Калі маці мужа зарэгістраваная і пражывае разам з вамі, то на падставе артыкула 29 Жыллёвага кодэкса яна з'яўляецца членам сям'і. І, адпаведна, гэты факт павінен улічвацца пры вызначэнні як жыллоплошчы, так і памеру льготнага крэдыту. Прычым, калі падчас пастаноўкі на чаргу маці мужа з вамі не пражывала, трэба пайсці ў райвыканкам і напісаць заяву аб яе ўключэнні ў склад вашай сям'і.

***☎ — Чаму ў нас такі высокі кошт квадратнага метра жылля і якім чынам гэты кошт фарміруецца?***

**Людміла Васільеўна,** *Бялыніцкі раён*

— На жаль, кошт квадратнага метра на самай справе высокі. Аднак гэтыя лічбы фарміруюцца з улікам многіх акалічнасцяў — кошту будматэрыялаў, праектавання, інфраструктуры, работ і г.д.

***☎ — Як мне падаецца, нашы аграгарадкі стаяць пустымі толькі таму, што жыць у пабудаваным «прэзідэнцкім» доміку можна толькі падчас работы ў сельгаспрадпрыемстве. А калі ты па тых ці іншых прычынах звольніўся ці выйшаў на пенсію, то атрымліваецца, што застаўся без жылля. Чаму з'явіліся такія законы? Ці можна нейкім чынам перавесці льготны крэдыт на будаўніцтва доміка непасрэдна на таго, хто ў ім жыве — з тым, каб жыллё засталося ў прыватнай уласнасці? Куды тут трэба звяртацца, якія збіраць дакументы і ці можна пагасіць крэдыт чэкамі «Жыллё»?***

**Таццяна Аляксандраўна Малькоўская,** *Глыбоцкі раён*

***(аналагічнае пытанне аб магчымасцях пераводу крэдыту — ад Наталлі Міхайлаўны Гуц са Смалявіцкага раёна)***

— Для пачатку варта нагадаць адзін момант. Паводле артыкула 96 Жыллёвага кодэкса, цяпер выселіць са службовых жылых памяшканняў без прадастаўлення іншага жылога памяшкання немагчыма інвалідаў I і II груп, пенсіянераў, асобаў, якія былі звольненыя ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі або па скарачэнні штатаў; асобаў, якія перанеслі прамянёвую хваробу ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС; інвалідаў, якім «звязалі» групу з чарнобыльскімі наступствамі; інвалідаў вайны і інвалідаў з ліку ваеннаслужачых, якія страцілі здароўе ў выніку ранення, кантузіі ці знявечання падчас абароны былога СССР, Рэспублікі Беларусь ці пры выкананні іншых абавязкаў вайсковай службы; удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія знаходзіліся ў складзе дзеючай арміі; воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія бралі ўдзел у баявых дзеяннях; сем'і ваеннаслужачых і партызан, якія загінулі або прапалі без вестак пры абароне былога СССР, Рэспублікі Беларусь ці пры выкананні іншых абавязкаў вайсковай службы, а таксама грамадзян, якія адпрацавалі ў арганізацыі больш за 10 гадоў.

Што ж да пераводу крэдыту, то такая магчымасць прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 19 студзеня 2006 года № 59. Аднак пры адной вельмі істотнай умове — згодзе непасрэдна сельгасарганізацыі. Такім чынам, для пачатку трэба звярнуцца ў гаспадарку. Пры гэтым, у выпадку станоўчага рашэння, магчымасць скарыстацца перарэгістраванымі чэкамі «Жыллё» тут будзе.

***☎ — Мы хацелі б знесці старую драўляную веранду і зрабіць новую, прычым, паколькі дом не мае камунальных выгодаў, — з ацяпленнем, водаправодам і каналізацыяй. Ці можна ўзяць на гэтыя мэты льготны крэдыт з улікам таго, што ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў я не стаю? І, калі так, то ці можна пагасіць ільготны крэдыт на рэканструкцыю чэкамі «Жыллё»?***

**Галіна Анатольеўна Сабалеўская,** *Валожынскі раён*

— Для атрымання льготнага крэдыту вы можаце звярнуцца ў райвыканкам на падставе ўказа Прэзідэнта ад 7 лютага 2006 года № 75 «Аб прадастаўленні грамадзянам, якія пастаянна пражываюць і працуюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч чалавек, ільготных крэдытаў на капітальны рамонт і рэканструкцыю жылых памяшканняў, будаўніцтва інжынерных сетак, узвядзенне гаспадарчых памяшканняў і пабудоў». Такі крэдыт прадастаўляецца па зацверджаных спісах працаздольным грамадзянам, у якіх штомесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і не перавышае 2 мінімальных спажывецкіх бюджэтаў. Сам памер крэдыту вызначаны ў 90 працэнтаў кошту выдаткаў на гэтыя мэты, але не больш чым ў 300 базавых велічынь. Крэдыт выдаецца тэрмінам на 10 гадоў пад 3 працэнты гадавых. Пры гэтым у дадзеным выпадку не мае значэння, знаходзіцеся вы ці не ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. А вось што да пагашэння крэдыту перарэгістраванымі чэкамі «Жыллё», якраз тут знаходжанне ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў — акалічнасць абавязковая.

***☎ — Сёлета скарыстаўся правам на пагашэнне часткі камерцыйнага крэдыту на будаўніцтва аднапакаёвай кватэры ў сувязі з нараджэннем непаўнагадовага дзіцяці. Цяпер зноў стаю ў чарзе на пашырэнне, а пытанне такое: ці можна будзе скарыстацца правам на пагашэнне няльготнага крэдыту на будаўніцтва і другой кватэры ў выпадку, калі ў нас з'явіцца другое дзіця?***

**Міхаіл Сакарэнка,** *г. Гомель*

— Можна, прынамсі, магчымасць паўторнага звароту на фінансавую падтрымку ў такой сітуацыі прадастаўляе ўказ кіраўніка дзяржавы ад 22 лістапада мінулага года № 585.

***☎— Пабудавалі двухпакаёвую кватэру долевым спосабам, пасля чаго атрымалі тэхпашпарт і пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў БРТІ. Ці лічыцца, што кватэра ўжо знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, або, магчыма, патрэбна афармляць яшчэ якія-небудзь дакументы?***

**Анастасія Іванаўна Бругель,** *г. Гомель*

— Афармляць якія-небудзь дадатковыя дакументы вам ужо не трэба. Калі вы будаваліся долевым спосабам, для пацвярджэння ўласнасці дастаткова тэхпашпарта і пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў БРТІ.

**Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Валянцінкай*

# Смага — нішто. Імідж...

За што купіў, як кажуць...

Адзін з тутэйшых мужыкоў, як ні цяжка было, мовы замежныя вывучыў, паехаў у Парыж. Асвойтаўся там, — у кавярню зайшоў. Заказаў (ну зразумела ж, па-французску!) нейкіх «вустрыц», кубачак кавы, сярод людзей з задавальненнем пасядзеў, падсілкаваўся. Потым, як і належыць, разлічваца стаў, дзякаваць... А афіцыянт яму (па-руску): ды, калі ласка, маўляў, прыходзьце яшчэ.

Мужык насцярожыўся, пытае, а як гэта вы здагадаліся, адкуль я? Ды проста, адказвае той: усе вашы ў кубачку лыжку трымаюць, калі каву п'юць.

Ага, думае мужык, трэба выправіцца. Праз гадзінку-другую зноў у кавярню пайшоў, зноў каўкі папрасіў. Зноў разлічыўся-падзякаваў. А яму... зноў па-руску: ды, калі ласка...

Той думае-пытае, што такое — лыжку ж з кубка я выняў!?

Выняць-вынялі, — усміхаецца абслуговец-француз — а палец — ўсё роўна зверху ляжаў, на кубачку, быццам яе трымаючы...

І гэта мужык на вус наматаў. Бліжэй да вечара ў трэцюю кавярню пайшоў: задавальнення, можна сказаць, не атрымаў ніякага, бо «пасвіў» сябе, як толькі мог. Гэта значыць, цукар цікенька памяшаў, лыжачку на талерку паклаў, усе пальцы на ручачцы кубка неяк змясціў... Ад напругі ў беднага аж спіна ўзмакрэла, — каву ледзьве дапіў.

Але ж самае крыўднае, што стаў, сыходзячы, дзякаваць — яму зноў па-руску!

Не вытрываў, «у бутырку» палез — закрычаў, а цяпер вы як здагадаліся?.. Проста, кажа афіцыянт: лыжку з кубачка вы дасталі... А вока — усё роўна прыжмурвалі, каб ёй не ўпароць...

Гэта, як вы здагадаліся, анекдот быў. Зараз — чыстая праўда. Нашы, тутэйшыя мужыкі ў тую ж Францыю падаліся, з аэрапорта ў гатэль прыехалі. Толькі на парог, там — адміністратарка, маленькая, увішная, адразу ж ім насустрач і давай лапатаць штось... Па-свойму. Госці насцярожыліся, няўцямна глядзяць... Тады яна па-англійску давай: ну, што ўдзячная ім за выбар, што рада вітаць і спадзяецца, што ім у іх спадабаецца...

Але ж разумець гэта — нашы разумеюць, а вось што адказваць трэба?.. Калі нічога падобнага ніколі не чуў, бо ў нас жа, у гасцініцах, гасцей ніколі не сустракалі... Звычайнык, прынамсі, сваіх, нічым такім не вядомых...

Разгубіліся мужчыны, зноўку маўчаць. Дзеўка ж — давай ім панямецку шпрэхаць...

Абарвалі: самы сталы з нашых зверху на яе паглядзеў са шкадобаю і стомлена так спытаў:

— Что ты лапочешь? Не видишь? Русские...

(За асобную нацыю мы ж і дома сябе не лічым... Але гэта ўжо так, да слова. — ***Аўт.***).

Дзеўка адразу на папятную пайшла — другую перакладчыцу паклікала. Карацей — паразумеліся неяк, засяліліся.

І пакуль там жылі — сярод французаў, сярод іх шматлікіх гасцей — міжволі, можна сказаць, замежныя мовы ўспомніліся: адзін у школе-інстытуце англійскую на пяцёркі вучыў, двое — нямецкую, што-кольвечы з французскай схапілі. Карацей, у іх — ніякіх пытанняў-праблем! Там... А па дарозе дамоў — «дагнала», адна. Як на першы погляд, дык смешная, дробная...

У самалёце сцюардэса стала напоі развозіць, прапаноўваць усім. Да нашых чарга дайшла. Адзін (піць дужа хацелася) вазьмі і скажы (па магчымасці гучна, бо паводдаль сядзеў):

— Ва-ан ці*...

— Во-о-дки?! — здагадалася французанка і, усміхнуўшыся на ўсе 32, тут жа працягнула шкалік.

Адмаўляцца, паўтараць сваю просьбу яшчэ раз (наш чалавек!) неяк няёмка было. Узяў тую гарэлку, выпіў. Смагу, зразумела ж, не прагнаў. Але справа, як вы разумееце, зусім не ў ёй: яна, як казалі ў тым абрыдлым рэкламным ролiку, і насамрэч нішто. За імідж крыўдна. Да таго ж, згадзіцеся, не тое, каб свой...

Свой, за далёкімі межамі краю, нам яшчэ стварэць і стварэць...

Але ж для таго, каб гэта рабіць там, трэба спачатку тут усвядоміць сябе беларусамі. А для нас (як мне, прынамсі, здаецца) гэта будзе куды складаней, чым вывучыць добрыя манеры і замежныя мовы, чым зарабіць грошы. На ўсё, што патрэбна. У тым ліку і на падарожжы.

**Валянціна ДОЎНАР.**

**Адзін чай (англ.).*

Прамая лінія

# СЕМ РАЗОЎ ПАДУМАЙ — АДЗІН РАЗ ЗРАБІ

**На пытанні адказваюць загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат філалагічных навук Янка КРУК і старшы выкладчык гэтай жа кафедры Аксана КАТОВІЧ.**

**(Працяг. Пачатак у нумарах за 8, 13,14, 15 мая).**

***☎ — Іна Мікалаеўна з Мінска. Калі я выходзіла замуж, пасля ЗАГСа нас сустракала свякроў, якая не была замужам — яна выхоўвала сына адна. Вянок напрыканцы вяселля здымала родная цётка мужа, якая таксама не была замужам. У жыцці ў мяне шмат праблем... Як можна выправіць сітуацыю?***

— Усё жывое існуе толькі ў пары, таму ўдовы або тыя, хто скасаваў шлюб, не могуць быць ключавымі фігурамі на вяселлі, у тым ліку сустракаць маладых і знімаць вэлюм. Вяселле шмат у чым праграмуе жыццё маладых. Вашы праблемы створаны рукамі самых блізкіх людзей.

***☎ — Непакояць з Брэсцкага раёна, Валянціна Іванаўна. Майму ўнуку — 1,3 года. Нарадзіўся ён на трох нулях — 10 студзеня 2007 года. Калі нам лепей пахрысціць дзіця? Мы б хацелі 5 чэрвеня — на Узнясенне.***

— Цудоўна. Хрысціце, і няхай дзіця расце і ўзвышаецца.

***☎ — Ірына Уладзіміраўна, Валожынскі раён. У мяне такі клубок. Па-першае, дачка першай ахрысціла дзяўчынку. Па-другое, у выканкаме праводзіўся агляд выканання абраду. Дачка выконвала ролю нявесты...***

— І цалкам была апранута нявестай?

***— Так. І распісваліся, і прысцёнкі надзявалі. Зараз маёй дачцэ 22 гады, але ў яе няма каханага.***

— Па-першае, 22 гады — гэта не крытычны ўзрост у сэнсе кахання і стварэння сям'і. З другога боку, думаю, што праблема завязалася. У такім выпадку кажуць, што той хлопец, які браў удзел у інсцэніроўцы, будзе «пераходзіць дарогу» кожны раз, як хтосьці ў вашай дачкі будзе з'яўляцца на «гарызонце». Значыць, несапраўднага «мужа» трэба нейкім чынам адвесці. Выйсце адно: калі хтосьці сур'ёзны з'явіцца на паразе, можна зрабіць нескладаны абрад: як толькі чалавек пойдзе з хаты, трэба падмесці яго «сляды» ад парога шчоткай на шуфлік, пасля чаго пакінуць шчотку з шуфлікам у вядры да раніцы. «Смецце» пераначуе ў хаце, а тады раніцай выкінуце яго. Хлопец застанецца ў хаце.

***☎ — Яніна Іванаўна з Мастоўскага раёна. У мяне ёсць дачка, не замужам. Цётка — родная сястра мужа падарыла пярс

Рыштаванні Бацькаўшчыны

# КАПЛІЦА АЖЭШКАЎ У ЗАКОЗЕЛІ БУДЗЕ АДНОЎЛЕНА

**Сёння гаворка пойдзе пра яшчэ адзін адметны куток краіны, дзе больш за стагоддзе жыццё ладзілася вакол сядзібы аднаго са старадаўніх шляхецкіх родаў Беларусі — Ажэшкаў. Закозельскі маёнтак, як і многія фальваркі тагачаснага беларускага краю, цесна звязаны з гісторыяй паўстання 1863—64 гадоў, а таксама з жыццём і творчасцю знакамітай пісьменніцы Элізы Ажэшкі.**

Закозельскімі землямі ў другой палове XIX стагоддзя валодалі Юзэф, Нікадзім, іншыя прадстаўнікі роду Ажэшкаў. Памесце ўключала ў сябе шэсць фальваркаў — Валавель, Белін, Дзятлавічы, Вавулічы, Карлавічы і Дошнік. Закозель быў галоўнай рэзідэнцыяй. Выгляд сядзібнага дома дайшоў да нас найбольш дакладна ў выглядзе акварэлі Напалеона Орды. Шмат разоў рэканструяваны, перароблены, удасканалены новымі гаспадарамі, дом быў спалены ў 1939 годзе. Да нашых дзён захаваліся будынак бровара, некалькі гаспадарчых памяшканняў ды сцены капліцы-пахавальні роду Ажэшкаў — галоўнай славутасці гэтых мясцін.

Сядзіба адрознівалася арыгінальнымі паркамі, алеямі, незвычайнай воднай сістэмай. Галоўную ліпавую алею, якая вяла да сядзібнага дома, а цяпер стала вясковай вуліцай, акалялі з двух бакоў каналы шырынёй па чатыры метры. Дрэвы высаджвалі на адлегласці ў шэсць метраў адно ад аднаго і яны не закрывалі краявід паўнаводных каналаў, уздоўж вонкавых берагоў якіх узвышаліся дубы. З тых волатаў-дубоў засталося ўсяго некалькі. На тэрыторыі сядзібы было пяць вадаёмаў. У іх упадалі каналы-збіральнікі вады за межамі сядзібы. Вадаёмы злучаліся паміж сабой пратокамі і напаўнялі вадой цэнтральныя каналы, якія з'яўляліся галоўнымі элементамі сядзібнай планіроўкі. Складаней, вельмі своеасаблівай назваў водную сістэму Закозеля ў сваім творы «Старадаўнія сядзібы Берасцейшчыны» Анатоль Федарук. Сапраўды, дзівосны малюнак вадаёмаў з каналамі надаваў ўсяму памесцю і асабліва парку непаўторны каларыт. Дык вось у рагу парку ў 1839 годзе паводле праекта архітэктара Францішка Яшчалда была ўзведзена капліца-пахавальня ў стылі неаготыкі. На будаўніцтва такога аб'екта патрабаваўся нават дазвол віленскага епіскапа. У Анатоля Федарука чытаем: «Капліца — рэдкае па кампазіцыі, гармоніі і якасці выкананя, ляпным дэкоры, дэкаратыўным ліцці збудаванне і не толькі ў Беларусі. Пабудавана яна са светла-чырвонай цэглы. У плане цэнтрычны квадратны будынак са спічастымі двухскатнымі дахамі, пакрытымі меднымі лістамі, у перакрыжаванні якіх уздымаецца ўгору чатырохгранная сігнатурка з вострым шпілем і чыгунным крыжам на канцы...»

У скляпеннях гэтай прыгожай капліцы была крыпта, дзе хавалі прадстаўнікоў роду. Дарэчы, графіня Бабрынская, якая пазней купіла маёнтак на аўкцыёне, прыняла ўмовы былых гаспадароў у адносінах да капліцы. Храм нельга было выкарыстоўваць у якіх-небудзь іншых мэтах, разбураць яго або перабудоўваць. І хоць сядзіба ў Ажэшкаў была канфіскавана, фармальна ім пакінулі права хаваць членаў сям'і ў капліцы. Гэтым правам хацела скарыстацца Эмілія Ажэшка, сын якой памёр у Парыжы на пачатку мінулага стагоддзя, ды атрымала адмову ад расійскіх уладаў. На сваё шчасце. Але пра тое крыху пазней.

Дык вось жыхаркай гэтых маляўнічых мясцін паўтара стагоддзя таму стала маладая Эліза Паўлоўская, якая паспела ўжо стаць Ажэшкай. 16-гадовая будучая

Аграгурыстычная сядзіба ў Селішчах.

пісьменніца, выпускніца Варшаўскага пансіёна, сустрэлася ў Гродне з Пятром Ажэшкам і неўзабаве звязала з ім лёс. Пасля вяселля яны прыехалі з мужам у яго радавы маёнтак Людвінава, што зусім побач з Закозелем. А ў Закозелі гаспадаром быў малодшы брат Пятра — Фларыян, выпускнік Санкт-Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі. У Фларыяна часта бывалі сябры-аднадумцы, у іх размовах і дыскусіях патыхала атмасферай паўстання. Іх ідэямі загарэлася і маладая Эліза. Яна спачувала бедным, гаротным, хворым. Дапамагала мясцовым сялянам, адкрыла ў 1861 годзе для вясковых дзяцей школу. Паўстанне 1863—64 гг., паводле яе слоў, стала для яе ўніверсітэтам: «Усё гэта зрабіў са мной і ўва мне год 1863. Калі б не яго молат і разец, мой лёс быў бы іншым, і, відаць, я не была б пісьменніцай».

Той год перамалоў лёс не адной толькі Элізы. На сход у Новую Папіну да пана Жука прыехалі ўсе памешчыкі акругі. На парадку дня было адно пытанне: падтрымліваць паўстанцаў ці займаць нейтральную пазіцыю. Доўгая дыскусія нічога не дала. Меркаванні раздзяліліся. Тады было прынята рашэнне правесці тайнае галасаванне (вось узровень местачковага калектывізму і дэмакратыі! — **С. Я**.). Калі падлічылі галасы, то высветлілася, што гаспадары палескага краю паўстанне падтрымаюць. Праўда, зброю ў рукі яны амаль не бралі, а дапамагалі змагарам за волю хлебам, коньмі, зброяй, грашыма, адзеннем, медыкаментамі. Не меней важнай была і маральная падтрымка. Напрыклад, калі адзін з кіраўнікоў паўстанцкага войска Рамуальд Траўгут быў паранены, ён некаторы час знаходзіўся ў доме Элізы і Пятра Ажэшкаў. А калі мяцежнага генерала пачалі шукаць, паводле падання, Эліза хавала яго колькі дзён у патайным пакоі капліцы. Пазней дапамагла выехаць Траўгуту ў Варшаву.

Потым, калі паўстанне пацярпела паражэнне і яго кіраўнікі былі пакараны смерцю, паступова сталі арыштоўваць суседзяў. Прыйшлі і па Ажэшкаў. Пётр атрымаў меншы тэрмін, а Фларыян быў асуджаны надоўга. 13 месяцаў ён ішоў пешшу па этапу да сібірскага Томска. Лёс асуджанага падзяліла яго нявеста. У ссыльцы нарадзіліся іх дзеці. А вязень стаў знакамітым на ўсю акругу ўрачом. Элізе спачатку мела намер пайсці за мужам, але потым намер памяняла. Іх сямейны саюз і да гэтага займеў трэшчыну, таму яны вырашылі ўзяць развод. Эліза вярнулася ў Гродна, на радзіму.

А радавыя маёнткі Ажэшкаў за ўдзел у паўстанні былі канфіскаваныя і выстаўленыя на аўкцыёны. Закозель купіла графіня Надзея Аляксандраўна Бабрынская. Цікавая дэталь: муж графіні быў унукам пазашлюбнага сына Кацярыны II і графа Арлова. Сядзібай кіравалі павераныя графіні, і варта зазначыць, удала. Гаспадарчая дзейнасць вялася прыбыткова, будаваліся новыя прадпрыемствы. Напачатку XX стагоддзя ў Закозелі ўзвялі дрожджававінакурны завод, які захаваўся да нашых дзён. Бровар мае сваю цікавую гісторыю, відаць, з-за сваёй «стратэгічнай» прадукцыі. Два разы, напрыклад, яго адбівалі партызаны ў немцаў падчас акупацыі. Што цікава, пасля гэтага не праводзіліся звычайныя для фашыстаў рэпрэсіі. Акупанты латалі дзіркі ў ёмістасцях і запускалі прадпрыемства наноў. Завод быў закрыты канчаткова адносна нядаўна. Відаць, аджыў бровар свой век у прамым сэнсе.

Гісторыю закозельскіх славутасцяў на адным дыханні як лекцыю можа прачытаць дырэктар мясцовай гаспадаркі доктар сельскагаспадарчых навук Мікалай Якоўчык. З яго ўласна і пачалося адраджэнне памяці тутэйшых мясцін. Мікалай Сцяпанавіч узначаліў цяперашні племзавод «Закозельскі» ў жніўні 1991 года. Гаспадарка была ў цяжкім эканамічным становішчы, пра культурна-гістарычныя каштоўнасці ніхто не дбаў, мякка кажучы... А на справе гэта выглядала так: капліца працягвала развальвацца. Яе нават не было відно за хмызняком і бур'яном. Рэшткі парку зараслі дзікім кустоўем, кругом буялі крапіва і лопух, валяліся гурбы смецця. Усё гэта расчысцілі, прывялі ў парадак. А калі Якоўчык падняў даведнікі, энцыклапедыі, дакументы, даведаўся, якой славутай, цікавай, неардынарнай была гісторыя Закозеля і навакольных вёсак, то літаральна «захварэў» гэтай тэмай. Дырэктар саўгаса некаторы час нават факультатыў у школе вёў па гісторыі свайго краю. Кажа, «абурэнне ўзяло, што дзеці старанна вучаць мінулае старажытнай Грэцыі і Рыма, а што было ў ваколіцах Закозеля, і блізка не ўяўляюць».

***Дырэктар саўгаса Мікалай ЯКОЎЧЫК некаторы час нават факультатыў у школе вёў па гісторыі свайго краю. Кажа, «абурэнне ўзяло, што дзеці старанна вучаць мінулае старажытнай Грэцыі і Рыма, а што было ў ваколіцах Закозеля, і блізка не ўяўляюць».***


Капліца Ажэшкаў.

Зараз у Мікалая Сцяпанавіча сабраны добры архіў па гісторыі роду Ажэшкаў. Знайшлася адна з нашчадкаў. Унучка Фларыяна Ажэшкі жыве ў Парыжы. Сазваніўся з ёй, збіраўся ехаць мінулай восенню. Пажылая жанчына паабяцала аддаць для будучага музея шэраг матэрыялаў. Ужо і віза была адкрыта, ды пасяўная зацягнулася, паездку давялося адкласці. На некаторы час.

Адначасова з паступовым уздымам гаспадаркі ўздымалі літаральна з зямлі і попелу памяць. Тады яшчэ саўгас за свой кошт адрэстаўраваў спіртзавод — былы панскі бровар, за што дырэктар нажыў вялікія непрыемнасці. Аказалася, не ўзгадніў рэстаўрацыю з усімі патрэбнымі ўстановамі. Вядомая справа, калі бур'яном зарастае і валіцца, нікога да адказнасці не прыцягнуць, а вось калі зрабіў добрую справу без адной паперы, прыцягнуць нагода ёсць. Але нічога, гэта ў Закозелі перажылі. І спадзяюцца, што вёску яшчэ больш знакамітай зробіць яе гісторыя.

Такое спадзяванне выказаў адзін са сталых жыхароў Закозеля Уладзімір Георгіевіч Хілько. Ён жыве тут з 1955 года, але ад суседзяў-старажылаў шмат ведае пра лёс тутэйшых славутасцяў. Расказаў, што капліцу пачалі рабаваць немцы яшчэ ў Першую сусветную вайну, яны знялі меднае пакрыццё, і будынак некалькі гадоў прастаяў без даху. Потым новы ўладальнік маёнтка ў 20-х гадах яе адрамантаваў. А вось пасля Другой сусветнай вайны яна была разбураная і апаганеная. Скляпенні раскопвалі, косці валяліся побач з будынкам. А адночы Уладзімір Хілько, тады ён працаваў намеснікам старшыні калгаса, разам са старшынёй позна вярталіся з калгаснага сходу. І на цёмнай вуліцы сутыкнуліся з муміяй-шкілетам. Нехта так «пажартаваў», паставіў чалавечыя астанкі вертыкальна прама на дарозе. Ранкам кіраўнікі гаспадаркі папрасілі дырэктара спіртзавода, каб ён камандзіраваў рабочага. Апошняму ў якасці авансу была выдадзена бутэлька спірту, ён і закапаў усе косці, якія валяліся, побач з капліцай.

* * *

На сёння пытанне пра аднаўленне капліцы вырашанае. Праведзеныя даследчыя работы. Аляксандр Башкоў, спецыяліст «Брэстрэстаўрацыяпраект» і дацэнт Брэсцкага ўніверсітэта імя Пушкіна расказаў карэспандэнту «Звязды», што падчас раскопак яны знайшлі астанкі чатырох чалавек, прадстаўнікоў роду Ажэшкаў. Знойдзена шмат прадметаў побыту, фрагменты адзення, нават кавалак слуцкага пояса.

Аблвыканкамам прафінансаваны на гэты год выраб праектна-каштарыснай дакументацыі. Сродкі на рэканструкцыю чакаюцца ў наступных гадах. Патрэбна 600—700 мільёнаў рублёў. Ёсць задумка стварыць у будынку музей шляхецкіх родаў Палесся. А чакаюць яе ўвасаблення ў Закозелі, так бы мовіць, актыўна. За свае сродкі гаспадарка ўзялася рэканструяваць вадаём і дарожкі вакол капліцы. А ў суседняй вёсцы, таксама з цікавай гісторыяй — Селішча пабудавалі невялікую турыстычную базу. Правільней сказаць, перарабілі пад сядзібу будынак старога прычала на маляўнічым беразе Днепра-Бугскага канала побач з самым высокім пунктам Брэсцкай вобласці. Турыстаў трэба ж недзе сустракаць, размясціць. А яны паедуць у Закозель. У гэтым тут упэўнены.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Драгічынскі раён.*

## Баранавіцкі піяніст заваяваў Парыж

**Баранавіцкі студэнт музычнага вучылішча Яўген Цымбаліст атрымаў дыплом лаўрэата першай ступені Міжнароднага музычнага конкурсу піяністаў, які нядаўна прайшоў у Францыі.**

Дыплом Яўгену ўручыла заснавальнік і прэзідэнт конкурсу Жынет Габэр. Паводле слоў самога пераможцы, намінацыя «Канцэртны дыплом», якая і прынесла яму перамогу, — самая складаная сярод сольных выступленняў як па ўзроўні твораў, так і па аб'ёме праграмы і па часе выканання.

Праўда, для Яўгена сорак пяць хвілін выступлення ў зале французскай кансерваторыі праляцелі як адно імгненне. Усяго ў музычным злёце ўзялі ўдзел каля 2 тысяч чалавек. Паездка ў Парыж для нашага ўдзельніка стала магчымай дзякуючы спонсарскай падтрымцы ААТ «ААБ Беларусбанк».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Ну і ну!

### САМ САБЕ САМАЛЁТ

**Былы швейцарскі вайсковец, лётчык Верб Росі здзейсніў першы публічны палёт над Альпамі на самаробных крылах з рэактыўнымі рухавікамі.**

На вышыні прыкладна 2300 метраў Росі, на якім былі надзетыя два крылы размахам да двух з паловай метраў, скочыў з борта самалёта і, перайшоўшы з вольнага падзення ў рэжым планіравання, уключыў чатыры рэактыўныя турбіны. Максімальная хуткасць яго палёту склала 300 кіламетраў у гадзіну. Росі да апошняга моманту не ведаў, ці адбудзецца палёт, бо інжынеры ніяк не маглі замацаваць адзін з чатырох рухавікоў. У якасці паліва ён выкарыстоўвае авіяцыйную газу.

Кожны з рухавікоў развівае нагрузку да 90 кілаграмаў, і гэтага хапае для таго, каб падняць у паветра вынаходніка і яго 55-кілаграмовы лятальны гарнітур. Эксперыментальны палёт доўжыўся пяць хвілін. Росі плануе здзейсніць 35-кіламетровы пералёт паміж двума паветранымі шарамі, а пазней пераляцець Ла-Манш.

### А ВЫ ПРАДАЛІ Б ЖОНКУ ЗА $1 000 000?

**44-гадовы брытанец Пол Осбарн з горада Блетчлі ў графстве Бэкінгемшыр выгнаў з хаты сваю жонку Шэран, падазраючы яе ў здрадзе, і ў адплату выставіў яе на Інтэрнэт-аўкцыён.**

«Хлуслівую падманшчыцу і здрадніцу-жонку» Осбарн прапаноўваў аддаць таму, хто за яе больш заплаціць. У выніку прапанаваная сума пераваліла за 500 тыс. фунтаў (каля мільёна долараў). Аднак сама 43-гадовая Шэран факт здрады адмаўляла і паскардзілася на мужа ў паліцыю. Гісторыя пачалася пасля таго, як у сакавіку да Пола дайшоў слых, што ў Шэран, з якой ён пражыў 24 гады і з якой у яго двое дзяцей, быццам бы быў раман з калегам па працы.

### «ЛІФЧЫК» ДЛЯ ПЯТАЙ КРОПКІ



**У ЗША вынайшлі «ліфчык» для ягадзіц. Патэнт на вынаходства пад назвай Biniki зарэгістравала амерыканскі псіхолаг Карын Харт.**

Арыгінальнае бра, па абяцаннях Харт, верне «бойкасць і запал адвісламу заду». Новы выгляд «бюстгальтара» тонкімі шлейкамі апаясвае стан і мацуецца пад ягадзіцамі, прыўздымаючы іх і ствараючы ілюзію спартыўнай, падцягнутай постаці. Харт выйшла на рынак з новым прадуктам пасля таго, як заўважыла, што яе ўласны азадак стаў значна менш пругкім і прывабным, чым у ранейшыя гады. Цяпер дадаць тонусу саслабелым мышцам можа любы ахвотнік. «Ліфчыкі» для зада прадаюцца праз амерыканскую кампанію Харт. Дамы зробяць прывабнай сваю пятую кропку ўсяго за $30, спецыяльная версія бра для мужчын — Maniki — абыдзецца крыху даражэй — у $40.

### 1 ШАУРМА — 1 ШКЛЯНКА ТЛУШЧУ

**Дыетолагі з брытанскага графства Гэмпшыр вызначылі, што адзін кебаб (у нас больш вядомы як шаурма) на адну чвэрць складаецца з тлушча. Ужыванне кебабаў два разы на тыдзень істотна павышае рызыку развіцця сардэчных захворванняў.**

Навукоўцы вывучалі каларыйнасць і склад папулярных у Вялікабрытаніі страў хуткага харчавання: індыйскую і кітайскую ежу, кебабы і «фіш-энд-чыпс» — смажаную рыбу з бульбай-фры. Яны ўстанавілі, што амаль увесь фастфуд утрымлівае дзённую норму тлушчаў, аднак лідарам сярод шкоднай ежы апынуўся кебаб.

Адзін з даследаваных навукоўцамі кебабаў утрымліваў 111 грамаў тлушчу, другі — 140, пры тым, што максімальная дзённая норма спажывання тлушчаў для жанчын складае каля 70 грамаў. Найменш шкодным фастфудам стала кітайская свініна.

### НЯМА ВЯСЕЛЛЯ — ДАВАЙ РАЗВОД!

**Жыхарка Егіпта падала на развод пасля таго, як муж адмовіўся аплаціць раскошную вясельную імпрэзу ў пяцізоркавым гатэлі для яе любімай кошкі.**

Паўгода таму Хадзіджа, студэнтка аднаго з каірскіх універсітэтаў, выйшла замуж за багатага чалавека, які старэйшы за яе на 50 гадоў. Муж выконваў усе жаданні маладой жонкі, аднак калі яна вырашыла заказаць вясельны баль для сваёй кошкі ў адным з самых дарагіх сталічных гатэляў, муж катэгарычна адмовіўся выдзеліць неабходную суму. Хадзіджа падала заяву на развод. У зале суда муж абвясціў, што згодзен на развод, але ў якасці развітальнага падарунка вырашыў... усё ж заказаць вясельную імпрэзу для жончынай кошкі, але ў больш сціплым атэлі, якім кіруе яго сябар. Дзяўчыну гэтае рашэнне мужа змякчыла і яна ўсё ж забрала сваю заяву.

### ЖУКОЎ НЕ ПУСЦІЛІ Ў ЗША

**Мытная служба Пенсільваніі канфіскавала пасылку з 26 жукамі, якая ўстрывожыла супрацоўнікаў пошты мястэчка Монтан.**

Працаўнікі пошты пачулі, як хтосьці скрабецца ў пасылцы, дасланай з Тайваня. На ўпакоўцы значылася, што ўнутры знаходзяцца цацкі і падарункі. Пільныя супрацоўнікі выклікалі мытнікаў, якія знайшлі ў скрынцы 26 жукоў: геркулесаў, насарогаў і галіяфаў. Усе жукі былі буйных памераў, прыкладна з дзіцячую далонь. Сямёра насякомых знаходзіліся ў асобных кантэйнерах, на якіх быў указаны іх пол, што дазваляе выказаць здагадку, што жукоў, якія ў вялікай колькасці могуць прынесці значную шкоду сельскай гаспадарцы, збіраліся разводзіць у ЗША. Перасыланне жывых насякомых у штаты без спецыяльнага дазволу Міністэрства сельскай гаспадаркі з'яўляецца парушэннем закона, таму мытнікі затрымалі жывы груз.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**

Гісторыя ў лёсах

# Якуб Колас і дачка лесніка: гісторыя згубленага здымка

**На сайце Талькаўскай сярэдняй школы ёсць здымак гэтай жанчыны 1936 года. Там яна — 18-гадовая дзяўчына. Здымак змешчаны на старонцы, прысвечанай Якубу Коласу, які пісаў у Тальцы «Міхасёвы прыгоды» і «Дрыгву». Талькаўцы старанна захоўваюць памяць пра абодвух: Якуба Коласа, які ўвекавечыў гэтыя мясціны ў сваіх вершах, і Таццяну Ждановіч, якой тут многія абавязаны жыццём. Кажуць, быў здымак, дзе яны ўдваіх. На жаль, знайсці яго пакуль не ўдалося. Але гэта не перашкода аповеду пра тое, чаму такі здымак сапраўды можа існаваць, і як склалася жыццё дзяўчыны, выява якой павінна быць на ім побач з паэтам.**

Кажуць, яна нейкім дзіўным чынам прыцягвала да сябе людзей. І людзі з ёй былі шчырымі і давяралі самае сваё патаемнае. Напэўна, яна валодала нейкай асаблівай якасцю характару, той, якая потым дазволіла ёй стаць цудоўным урачом. Нездарма сям'я Якуба Коласа, сам паэт, яго жонка і дзеці адразу палюбілі яе. Яны пазнаёміліся, калі Таццяне было гадоў 16. Бацька яе, Аляксандр Яўсейчык, быў памочнікам ляснічага Цэльскага ляснічства Пухавіцкага раёна. Ён аднойчы і прывёз у леснічоўку, дзе жыў летам з сям'ёй, Якуба Коласа.

— Гэта здарылася, — узгадвала Таццяна Аляксандраўна, — калі мы жылі ў лесе, у старожцы. Гэта месца за паўтара кіламетра ад Талькі. Пасярод лесу была сонечная паляна, там стаяў наш дом, пуня. У нас быў свой конік, сабака, невялікі сад, расліе кусты. Месца ўнікальнае, маляўнічае. Тут табе і лес, і луг, і рэчка. Я вучылася недзе ў 9-м класе, калі ўпершыню да нас у «гаёўку» на дачу прыехаў з нейкім знаёмым айцу мастаком сам паэт Якуб Колас. Вельмі быў цікавы чалавек. Такі просты, вясёлы, а галоўнае — аматар пахадзіць па лесе.

Браў толькі баравікі. Потым прыходзім дадому, ён пачынае іх сартаваць: маленькія асобна, сярэднія і старыя, называў іх «барашчавікамі», адкладаў для сушкі на зіму. Грыбы абавязкова палічыць і ў голас скажа: «У мяне, Танечка, 169 грыбоў», другі раз больш за 200. І цешыўся, калі ў мяне было менш: «Вось і я яшчэ на гэту працу здатны».

Такая быццам бы звычайная справа. І вынікам — духмянае, вядомае з дзяцінства:

*Лес і пралескі*
*Разам з хвайнякамі*
*Страх як багаты —*
*Чым? — баравікамі!*
*Шапкі іх чорны,*
*Самі яны крэпкі:*
*Возьмеш у руку —*
*Гіпсавыя злепкі.*

Сведкай нараджэння гэтых строф, натхняльніцай і своеасаблівай памагатай была дачка лесніка. Можа гэта невыпадкова? Бо і яна была незвычайным чалавекам. «Зрэдку бацька нас падвозіў да Загібельцы, там мы рыбачылі. Якуб Колас пісаў «Міхасёвы прыгоды». Потым садзіўся на беразе ракі Таль, глядзеў на ваду, прыслухоўваўся да нашага смеху, размоў, смяяўся, а вочы задумліва-сур'ёзныя. Вершы нараджаліся з-пад пяра. У паэме гэтай успамінаецца пра ўсіх маіх братоў, родных і стрыечных, суседскіх дзяцей...»

*Лёнька тут са стражы,*
*Хлопчык нехлямяжы,*
*Тут і Ванька з будкі,*
*Дасціпны і гнуткі,*
*І Аўсейчык Мішка,*
*Паўлік, Цішка, Грышка,*
*Хоць сабе малыя,*
*Але удалыя.*

Летам 1933 і 1934 гадоў Якуб Колас жыў у Тальцы ў хаце Яўсейчыкаў. Ён прыязджаў разам з жонкай і трыма сынамі — Юркам, Данілам і сямігадовым Міхасём. Апошні прызнаўся потым сыну Таццяны: «Гэта былі лепшыя дні майго жыцця». Напэўна, яны сапраўды моцна пасябравалі з памочнікам ляснічага і яго сям'ёй, бо з 1935 па 1940 год Таццяна, пакуль вучылася ў медыцынскім інстытуце, жыла ў Мінску на кватэры паэта.

Даніла МІЦКЕВІЧ (сын Якуба Коласа, у цэнтры) і Таццяна ЖДАНОВІЧ (ЯЎСЕЙЧЫК) узгадваюць два перадваенныя леты. 1985 год.

***У Тальцы гэту жанчыну памятаюць і любяць дагэтуль. Яе імя звязваюць з адной з самых яскравых старонак гісторыі вёскі.***

У 1940 годзе Таццяну размеркавалі ўрачом ў мінскую паліклініку. Яна выйшла замуж і нарадзіла дзіця. Яе муж Аляксандр Ждановіч абараніў кандыдацкую дысертацыю ў політэхнічным інстытуце летам 1941 года. Яны збіраліся ехаць у Акадэмію навук у Маскву. Але нечакана Аляксандр атрымаў павестку ў ваенкамат. Гэта было 21 чэрвеня 1941 года. Яму было 27 гадоў, яго сыну Яўгену — восем месяцаў.

— Больш маці яго ніколі не бачыла, — расказвае Яўген Ждановіч. — У 1982 годзе я адшукаў стрыечнага брата бацькі Леаніда. Ён расказаў, што летам 1941 года бацька з 12 байцамі адступаў праз сваю родную вёску Зарэчча ў Талачынскім раёне. Кіраўніцтва раёна прапанавала яму застацца і ўзначаліць партызанскі рух. Бацька адмовіўся. Яны пераначавалі. Ногі ягоныя былі разбіты ў кроў. Дзядзька аддаў яму свае боты, паклалі туды гусіны пух, і раніцай атрад рушыў далей. З імі пайшоў Васіль, другі бацькаў стрыечны брат. Пасля вызвалення Беларусі Васіль прыслаў пісьмо, у якім пісаў: «Саша загінуў у мяне на руках, прыеду, раскажу». Але 8 мая 1945 года Васіля ранілі і 10 мая ён памёр. Сваякі ў нейкай публікацыі потым прачыталі пра бой пад Смаленскам, дзе ўзгадвалася імя Аляксандра Ціхановіча Ждановіча, але, на жаль, мне так і не ўдалося знайсці сведчанняў пра месца яго гібелі і пахавання.

Тым часам Таццяна з немаўляткам на руках пешшу ішла з разбомбленага Мінска ў родную Тальку. Дзеля бяспекі яна трымалася палявых дарог і абходных шляхоў. Праз тыдзень, стомленая і схуднелая, але жывая, з жывым і здаровым дзіцем яна ступіла на бацькоўскі падворак. Чатыры гады акупацыі. Таццяна Ждановіч (Яўсейчык) — для насельніцтва адзіны ўрач у акрузе. А для партызан — адзіная магчымасць атрымаць дэзінфіцыруючыя прэпараты і перавязачны матэрыял.

Потым жыхары Талькі расказвалі: «У яе скаліся добрыя адносіны з нямецкім урачом, які быў у захапленні ад таго, што малады спецыяліст настолькі добра лечыць. Быў выпадак, калі маці давялося прасіць у нямецкага ўрача пеніцылін. Той адмовіў. Тады Таццяна Аляксандраўна сказала: «Калі мы не знішчым ачаг інфекцыі, то ўзнікне пагроза і для нямецкага гарнізона». І немец дабіўся, каб з Мінска прыляцеў самалёт і скінуў лекі».

Таццяна (ЯЎСЕЙЧЫК) і Аляксандр ЖДАНОВІЧ. 1940 г.

За ўсё сваё жыццё ўрач Таццяна Ждановіч нікому не адмовіла ў дапамозе. Нават калі пад пагрозай было жыццё яе або яе дзяцей. Падчас акупацыі за ёй прыйшлі ноччу, у камендацкі час, у які пад страхам смерці забаранялася пакідаць свае дамы, і яна пайшла, каб дапамагчы ў складаных родах. На адваротным шляху яе спыніў нямецкі патруль. Тады нейкім цудам ёй удалося ўпэўніць немцаў адпусціць яе.

Вясной 1943 года талькаўскага ўрача арыштавалі за падазрэнне ў сувязі з партызанамі. Таццяна трапіла ў гестапа з двухгадовым сынам.

— Маці казала: «Ты не можаш гэтага памятаць», але я памятаю, — сцвярджае Яўген Аляксандравіч. — Потым, калі навучыўся маляваць, я намаляваў вартоўную вышку, нямецкую форму, кулямёт і браму... Я дагэтуль не разумею, як застаўся жывы, і як маці засталася жывая. Як увогуле ў яе хапіла мужнасці дапамагаць партызанам і быць урачом у такіх абставінах. У яе на руках засталося трое маленькіх дзяцей: я і двое пляменнікаў — усе прыкладна аднаго ўзросту. Яна была ва ўсіх на віду і адзіны, хто мае доступ да медыкаментаў...

Іх арыштавалі траіх: Таццяну Ждановіч, Аляксандра Доўнара і яшчэ аднаго мужчыну. Бабулі Агрыпіне Яўсейчык удалося выкупіць маленькага ўнука. На самым пачатку знявольвання Таццяне пашанцавала перакінуцца кароткай, але важнай фразай з Аляксандрам Доўнарам: «Не сазнаюся». Трэці чалавек расказаў немцам, што атрымліваў лекі і перавязачныя матэрыялы ад урача і перадаваў іх Аляксандру Доўнару, які дастаўляў усё ў партызанскі атрад. Таццяна Ждановіч і Аляксандр Доўнар адмаўлялі, і ўрэшце іх адпусцілі. Таццяна Аляксандраўна расказвала потым дзецям, што гестапавец, які вёў следства, цудоўна размаўляў на рускай мове і рэзка мяняў свае паводзіны, калі на допытах нехта прысутнічаў. «Калі мы былі ўдваіх, ён быў нармальным чалавекам, у іншых выпадках звер зверам». Напрыканцы ён сказаў ёй: «Добра, жыві. Можа і мне хутка давядзецца пабыць у тваёй шкуры».

Яўген Ждановіч таксама памятае пах цёплага хлеба, які перадавалі праз акно іх хаты для параненых пасля вызвалення Талькі. Тады ў хаце лесніка Аляксандра Яўсейчыка наладзілі шпіталь...

Таццяну Ждановіч з любоўю ўзгадваюць у Тальцы і праз 10 гадоў нясуць кветкі на яе магілу. Кажуць, яна была празорлівай. І смелай. Аднойчы ў яе дом прыйшла практыкантка з медыцынскага вучылішча Ніна Конан. Таццяна Аляксандраўна паглядзела на яе і кажа: «Скончыш тэхнікум і прыязджай». Ніна прыехала і была адной з лепшых медсясцёр у раёне. Потым яна выйшла замуж, але з-за пароку сэрца ёй забаранілі нараджаць. Ніна прыйшла тады да сваёй начальніцы і кажа: «Таццяна Аляксандраўна, я хачу мець дзіця». Урач супакоіла яе, пагадзілася весці цяжарнасць. Ніна нарадзіла сына, а потым — дачку.

***Я дагэтуль не разумею, як застаўся жывы, і як маці засталася жывая. Як увогуле ў яе хапіла мужнасці дапамагаць партызанам і быць урачом у такіх абставінах: у яе на руках засталося трое маленькіх дзяцей...***

Таццяне Ждановіч удалося сфарміраваць у вясковай бальніцы надзвычай зладжаны калектыў: зубны ўрач Марыя Конан, медсёстры Ніна Кургановіч і Валянціна Комар, трошкі грэшны на «зялёнага змея», але безадмоўны і вельмі добры прафесіянал фельчар Леанід Мікоша і фельчар Ніна Радкевіч, акушэрка і весялуха Ганна Стрэльская, санітарачкі, кухар, конюх — усе былі як адна сям'я. Нездарма галоўны ўрач раёна Марыя Кандрацьеўна Арэшка, таксама цудоўны чалавек і ўрач, заўсёды ўсе камісіі і праверкі везла ў Тальку. Тут у любы час быў парадак, дысцыпліна, задаволеныя пацыенты, добра арганізаваная прафілактычная работа са школай і дзіцячым домам...

Пра Талькаўскі спецыяльны дзіцячы дом трэба сказаць асобна. Там выхоўваліся дзеці тых, хто загінуў у вайну. У школе было два класы: з вясковых дзяцей і з дзетдомаўскіх. Таццяна Ждановіч свайго сына аддала ў «дзетдомаўскі». Яна лічыла, што Жэнька гэтакі ж, як і яны. Калі працавала ў дзіцячым доме, яна кожны дзень некага з дзяцей прыводзіла дамоў. У пачатку 70-х да яе з Варкуты прыехаў былы выхаванец дзіцячага дома Сяргей Лазаковіч. Ён прыехаў сказаць гэтай жанчыне «дзякуй, мама» і прывёз у падарунак дзіва — унты.

Дарэчы, дзеці заўсёды дазвалялі ёй сябе лячыць, не баяліся ні ўколаў, зробленых яе рукамі, ні іншых працэдур. Талькаўцы ўзгадваюць Таццяну Ждановіч як урача ад Бога. Яна была геніяльным дыягностам. Аляксандра Злобіч расказвае, як Таццяна Аляксандраўна, калі была ўжо на пенсіі, назвала дыягназ як хваробы, які доўга не маглі высветліць урачы раённай бальніцы: «Яна ўважліва слухала мяне, а больш глядзела ў вочы, потым спыніла і кажа: «Заўтра тэрмінова здайце аналізы ў інфекцыйную бальніцу. У вас — сываратачны паратыт...» Падобных выпадкаў безліч. У 1969 годзе Таццяна Ждановіч сама трапіла ў бальніцу з нагоды дабраякаснай пухліны. Пасля аперацыі яна сказала сыну: «Жэня, знайдзі тэрапеўта, бо ў мяне пнеўманія, а мой урач не хоча і слухаць». Яна не памылілася. Як не памылілася і тады, калі сказала дарослай ужо сваёй дачцэ, якая збіралася класціся на аперацыю па выдаленні жоўцевага пухіра, што ніякіх камянёў у яе няма. Потым сваякі выпадкова даведаліся, што аперацыя сапраўды была дарэмнай.

Таццяна Ждановіч была адным з лепшых прадстаўнікоў сельскай інтэлігенцыі. Цудоўныя людзі на працягу дзесяцігоддзяў працавалі разам з ёй у Тальцы. Гэта і дырэктар дзіцячага дома Вольга Карпінская, і выхавальніца ў той жа ўстанове Ніна Шаўчэнка, і дырэктар школы Іван Барысенка, і настаўнікі, выпускнікі Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта Вера і Вячаслаў Бузукі... Гэта дзякуючы ім пасляваенная беларуская вёска дала гораду вучоных, паэтаў, інтэлігенцыю, людзей, якія паднялі краіну, з попелу пераўтварылі яе ў самую квітнеючую і прывабную зямлю на тэрыторыі Саюза. Пра Таццяну Аляксандраўну кажуць яшчэ, што яна была сапраўдным і разам з тым ненавязлівым лідарам. Нязменны дэпутат сельсавета, да меркавання якога заўсёды прыслухоўваліся. Цікавая і характэрная дэталь — нават унукі нядаўна са здзіўленнем даведаліся, што іх усімі любімая і паважаная бабуля ніколі не была ў партыі...

— У канц

Наш культурны асяродак
# Жыранделя
Выпуск № 6 (28)

**Дзяўчынка, якая скончыла школу з медалём, магла марыць пра любую прафесію, і яна рыхтавалася паступаць у тэхналагічны ўніверсітэт. Цяпер салістка беларускай оперы Аксана Волкава з усмешкай успамінае пра гэта. А што калі б іспыты ў кансерваторыю не пачыналіся раней, чым ва ўсіх іншых ВНУ, і калі б яе не адабралі сярод жудаснага конкурсу?.. Не гучала б у нашым оперным тэатры яе меца-сапрана?.. Не было б той гучнай перамогі нашай вакальнай школы на конкурсе ў Расіі — упершыню для Беларусі?.. У свае 27 гадоў спявачка прымусіла гаварыць пра сябе. Высокі жанр яна імкнецца зрабіць больш даступным і зразумелым для людзей, а яны чуйна рэагуюць на яе эксперыменты: сольны канцэрт беларускай опернай спявачкі прайшоў з аншлагам! Яшчэ студэнткай яна стала спяваць у Оперным тэатры, вельмі хутка здолела займець сваіх прыхільнікаў і гэта толькі пачатак кар'еры…**

# ОПЕРА-МАДЭРН АД АКСАНЫ ВОЛКАВАЙ

## Удзелам у тэлепрекце «Дзве зоркі-2» опернай дзіве давялося ахвяраваць... дзеля перамогі на міжнародным вакальным конкурсе імя Глінкі

— Калі я разважала пра тое, ці магу стаць спявачкай, то вырашыла: хачу спяваць менавіта оперу, і ў мяне гэта павінна атрымацца, — успамінае Аксана Волкава. — Я спявала заўсёды, з дзяцінства, яшчэ калі вучылася ў музычнай школе. Вучыцца ў акадэміі музыкі мне вельмі падабалася, нібыта свята было кожны дзень. Я паступіла ў клас Лідзіі Іванаўны Галушкінай. Кожнаму з нас была адведзена пэўная колькасць гадзін. Але яна са мной займалася больш, чым з іншымі, таму што я сядзела і чакала, калі выкладчыца вызваліцца і зможа пазаймацца са мной яшчэ, і яна мяне брала на дадатковыя заняткі. Голас — таксама інструмент. Асвоіць тэхніку валодання ім — самае галоўнае ў нашай прафесіі. Як толькі пачынаеш вучыцца, важна, каб табе далі правільную ўстаноўку: дзе фарміруецца гук, як гэта адбываецца, як голас павінен гучаць і якія мышцы пры гэтым працуюць. Мне пашчасціла, таму што адразу я знайшла менавіта свайго педагога.

***— Раней у артыстаў былі магчымасці стажыравацца за мяжой. У вас іх не ўзнікала?***

— Любы міжнародны конкурс такія магчымасці адкрывае. Звычайна там бываюць прадстаўнікі розных краін. Як правіла, яны ўсе педагогі, кагосьці праглядаюць і нешта потым прапаноўваюць. Я ездзіла на конкурсы за мяжу, і ў больш блізкую для нас Расію. І ведаеце, ніводзін чалавек мне не сказаў, што я спяваю няправільна. Былі заўвагі ў асноўным па тэксце, наконт замежных моў, на якіх даводзілася спяваць оперныя партыі, — італьянскай, французскай, нямецкай. У нас проста няма спецыялістаў, з якімі можна займацца менавіта вакальным вымаўленнем. Таму што размаўляць на мове і спяваць на ёй — розныя рэчы. Я лічу, што да цяперашняга часу ў мяне ёсць такія праблемы. І не толькі ў мяне. Таму што калі мы выязджаем на гастролі за мяжу, дзе нас выдатна прымаюць, заўвагі атрымліваем у асноўным з-за вымаўлення. Але я думаю, калі той жа італьянец ці француз стане спяваць на нашай мове, будзе тое ж самае.

***— Вы загартаваны конкурсны баец. Але, напэўна, страшнавата, калі цябе ацэньваюць…***

— Калі я ездзіла на конкурсы ў студэнцкія гады, то гэта было адно адчуванне: жудасная канкурэнцыя, каленкі трэсліся... Але цяпер ужо вопытны чалавек: у мяне кожны месяц па восем-дзесяць спектакляў у тэатры, канцэрты, іншыя мерапрыемствы. Чаго мне перажываць? Але калі я была на міжнародным конкурсе імя Глінкі, то нейкі мандраж на мяне найшоў. Раптам злавіла сябе на адчуванні, што стаю і трасуся... Паглядзела на хлопцаў і дзяўчат, якія такога ж узросту, як я, але яшчэ нідзе стала не працавалі, не спявалі ў тэатры, яны толькі спрабуюць сябе. Аказалася, што я самая вопытная салістка. Думаю: чаго я дрыжу? За мной тэатр, які даў мне вялікі вопыт выступленняў. Столькі дырыжораў, рэжысёраў, канцэртмайстраў са мной працуюць. Чаго баяцца? Ведаеце, калі я толькі выходжу на сцэну — ўсё гэта прападае.

***— Вы першая прадстаўніца Беларусі, якую так высока ацанілі на конкурсе імя Глінкі, які лічыцца адным з самых прэстыжных — усё-такі савецкая оперная зорка Ірына Архіпава за ім стаіць…***

— Калі я ехала туды, былі пэўныя апасенні. Але я была перакананая, што здолею паказаць сябе з добрага боку. У мяне заўсёды ёсць толькі адзіны галоўны страх, куды б я ні ехала: не захварэць. Не пераспяваць, каб захаваць голас. Таму што розныя кліматычныя ўмовы могуць адбіцца, яшчэ і хваляванне сваю справу можа зрабіць, аслабіць арганізм. Але я была моцнай. Напэўна, усе гэта адчулі. Самымі важнымі для мяне былі словы Ірыны Архіпавай. Пасля конкурсу я да яе падышла пагаварыць, і яна сказала: «Ты падобная на мяне. Нібыта я сама...» Мне было вельмі прыемна. Было шмат удзельніц з такім жа тыпам голасу, як у мяне. Вядома ж, я параўноўвала і зразумела: я адрозніваюся ад іншых манерай, школай, тэхналогіяй. Самі канкурсанты адзначалі, што адчуваецца больш еўрапейская школа. Гэта для мяне быў вялікі камплімент. Хоць па прыродзе галасоў Расія вельмі багатая краіна. Мы бяром за кошт школы, музычнасці і іншай манеры выканання.

***— Ваша прафесійная кар'ера адразу стала складвацца паспяхова. Не кожнай студэнтцы даверацца спяваць партыі ў оперных спектаклях. Акрамя таго, вы былі стыпендыятам Спецыяльнага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі. Якую адказнасць нясе чалавек за поспех, які напраткаў яго ў маладыя гады?***

— Магчыма, нейкі лёс мяне вядзе, ёсць шанцаванне... Я нічога спецыяльна для гэтага не рабіла. Не хадзіла, не стукалася ва ўсе дзверы: маўляў, паглядзіце, якая таленавітая!. Нічога нікому не даказвала. Усё адбывалася натуральна. І я ставілася да гэтага спакойна. Атрымалася — малайчына, не атрымалася — недзе недапрацавала.

***— У апошнія гады ў оперную трупу тэатра прыйшло шмат маладых артыстаў. З'яўляецца больш сучасных пастановак. Што вас больш вабіць: класіка ці эксперыментальныя спектаклі?***

— Класіка заўсёды цікавая і актуальная. У нас вялікая колькасць моладзі, мы прыйшлі амаль у адзін час, і з-за сваёй маладосці яшчэ не можам спяваць увесь рэпертуар, які прапаноўвае тэатр. Чайкоўскага можна праспяваць у маладым узросце, Расіні, Бізэ. Але каб асіліць партыі Вердзі, (яго ў нас у тэатры шмат), не толькі вопыт патрэбны, але яшчэ і каласальнае здароўе, адпаведны маштаб голасу. Таму ўзнікаюць пастаноўкі, якія маглі б заняць маладых, і пры гэтым не ламаць іх галасы. Безумоўна, з'яўленне «малых формаў» прадыктаванае яшчэ і нашым рамонтам.

***— У сольным канцэрце вы «запальвалі» як Кармэн, і ў той жа час выконвалі больш сучасную музыку. А ці ёсць у вас любімы жаночы вобраз?***

— Дагэтуль мне найбольш падабалася спяваць Кармэн. Яшчэ хачу праспяваць Амнерыс з «Аіды», але ўсё не хапае часу вывучыць партыю. Вельмі шмат цікавых вобразаў і засяроджвацца на адным мне асабіста сумнавата. Таму ўзнік праект «Опера-мадэрн». Вельмі многа ў нас класічных канцэртаў, якія падобныя адзін на другі. Мне захацелася нечага іншага.

***— У жыцці вы на каго з гераінь больш падобныя: на Кармэн ці на Папялушку?***

— Ні на Кармэн і ні на Папялушку. Напэўна, ні на адну сваю гераіню, а можа нават і ні на якую ўвогуле. У жыцці я звычайны чалавек, дастаткова сціплы. Не імкнуся дома гуляць у тэатр, мае оперныя замашкі застаюцца на працы. Дома я жонка, маці, каханая жанчына, але не оперная дзіва. Звычайна ўстаю рана, займаюся дзіцем, гатую, раблю тое, што робіць любая жанчына. Спяваю дома мала, таму што ўжо не хапае сілаў на гэта — да вечара я нават гаварыць ужо не магу. Таму дачка не слухае мае калыханкі. Ёй тры з паловай гады, яна не любіць, калі я спяваю. Наадварот, просіць: «Мама, не спявай!. Будзе канцэрт — будзеш спяваць».

***— Ці ёсць нейкі час, які вы пакідаеце на тое, каб заняцца сабой, падумаць, што трэба выглядаць зоркай?***

— Гэта залежыць ад таго, у колькі я ўстану: а палове шостай, ці а палове сёмай. Асабісты час у мяне ёсць, пакуль усе яшчэ спяць — магу нетаропка выпіць кубачак кавы, падумаць пра тое, які будзе дзень і што я магу палепшыць у ім і ў сабе.

***— Пра што можа марыць дзяўчына, якая ўжо стала салісткай?***

— Мне б хацелася, каб стаўленне да оперы ў нашай краіне змянілася. Таму што ёсць толькі адзін оперны тэатр. Гэта мастацтва высокае, якое вызначае твар любой дзяржавы. Павінна быць адпаведная ўвага і да тэатра, і да артыстаў, як некалі гэта было ў савецкія часы, калі клапаціліся нават пра тое, каб артысту было зручна і недалёка прыходзіць у тэатр. Салісткі мелі магчымасць больш даглядаць сябе, песціць голас, маглі трымаць хатніх памочніц і нянек для дзяцей. Мы гэтага не можам сабе дазволіць. Сапраўды, спевакоў высокага ўзроўню трэба берагчы і песціць. У нашай прафесіі вельмі складана трымаць сябе на належным узроўні. Гэта датычыцца і знешняга выгляду, і здароўя, здольнасці захаваць голас. Павінна быць адпаведная аплата працы. Таму што гэта адна з тых прафесій, якія вельмі высока аплачваюцца ва ўсім свеце.

***— Калі браць да ўвагі ганарары Алены Нятрэбкі…***

— Спевакоў узроўню Нятрэбкі не так многа. Каб стаць сусветнай опернай зоркай, патрэбна знешняя прывабнасць, прыгожы голас, пластыка і акцёрскае майстэрства, і іншыя складовыя. У ёй гэтыя якасці спалучаюцца. Я кажу пра свае ўражанні.

Сёння оперны спявак павінен быць артыстам, а не толькі валодаць голасам. Мы з тэатрам часта выязджаем на гастролі. Як правіла, там удзельнічаюць і нашы салісты, і замежныя. Я неаднойчы была сведкай пераўзыходжання нашых спевакоў.

Хачу сказаць з гонарам, што да нас летась прыязджаў дырэктар вакальнага конкурсу «Belvederte». Гэта адзін з самых вядомых і складаных конкурсаў у свеце. Удзельнікаў адбіраюць на праслухоўваннях у розных краінах. Летась праслухоўванне было зроблена для нас, удзельнічала адзінаццаць чалавек. З іх шэсць чалавек ён запрасіў на гэты конкурс. А дагэтуль ён быў у Расіі і сказаў, што з 50 запрасіў толькі пяць. Пры іх маштабах, колькасці навучальных устаноў... Ён сказаў, што ў нас больш еўрапейская падача, больш еўрапейскае гучанне. На жаль, я не змагла туды паехаць, хоць і прайшла адбор. Удзельнічаць у конкурсе заўсёды хочацца. Але ў нас элементарна няма на гэта сродкаў. Ездзіць у Аўстрыю за свой кошт, аплачваць пражыванне, працу канцэртмайстара — дарагое задавальненне.

Каб спеваку зрабіць міжнародную кар'еру, трэба ўкласці вялікія грошы, знайсці агента, прыкласці вялікія намаганні. А ў нас няма базы, дзе можна элементарна зрабіць якасны запіс. Я займаюся гэтым некалькі гадоў, імкнуся запісваць сябе, у мяне ёсць нейкая колькасць аркестровых фанаграм. Але звычайны «дэма» матэрыял, які я магла б некуды прапанаваць, запісаць нерэальна. Няма спецыяльнай студыі, дзе запісваюць оперны голас — «запірае» ўсю апаратуру і ідуць скажэнні. Адзіная магчымасць — запісваць канцэрты ў філармоніі, спектаклі, але якасць гуку атрымліваецца не лепшая, калі сядзіць поўная зала. У нас знікла практыка планавых запісаў на радыё. Ёсць запісы выканаўцаў мінулых гадоў, якія вельмі даўно зробленыя. Праўда, цяпер нашы канцэрты сталі пісаць на тэлебачанне, іх паказваюць. Але яны вельмі традыцыйныя. Асабіста мне падабаецца быць у пошуку — прапаноўваць нешта новае. Таму ў сваім сольным канцэрце я пастаралася зрабіць тое, што ў нас яшчэ ніхто не рабіў — опернае шоў. Дзякуй дырэктарам нашага тэатра, што яны дапамаглі ў гэтым.

***— Сукенкі вы таксама спецыяльна для сольнага канцэрта падбіралі? Раскошу пераапрануцца за канцэрт пяць разоў можа дазволіць сабе не любы папулярны артыст.***

— Усе сукенкі, якія вы бачылі, — мае ўласныя. Сама іх мадэлявала. Я займаюся вышыўкай шклярусам, і ўсё што на тканінах блішчэла, было зроблена маімі ўласнымі рукамі. З палёгкай думаю: як пашчасціла, што мне гэта яшчэ і падабаецца! З задавальненнем расшываю свае канцэртныя сукенкі. Увогуле люблю мадэляваць адзенне. Мне пастаянна нешта патрэбна, не магу выходзіць на сцэну ў адной сукенцы. Я ведаю, дзе заказаць, каб было не надта дорага. Ведаю, якая тканіна шыкоўна глядзіцца са сцэны — яна можа быць і не дарагая, але эфектная.

***— Хто вашы самыя патрабавальныя слухачы?***

— Напэўна, родныя. Бацькі, безумоўна, ганарацца, але яны людзі сціплыя, каб гэта дэманстраваць. Напрыклад, мама пасля канцэрта звярнула маю ўвагу і на тое, і на гэтае. І спытала, чаму я спявала толькі на замежных мовах?.. Муж таксама пра гэта гаварыў. Ён гэты канцэрт фактычна арганізаваў, прыдумаў, вынасіў. Займаўся гукам, манціроўкамі сцэны. Без падтрымкі мужа я не справілася б. Ён сам музыкант, але з добрымі арганізацыйнымі здольнасцямі. Заўсёды радуецца за мяне і штурхае ў шыю: едзь на конкурс, рабі...

***— Вы сваю будучыню звязваеце з беларускім опернym тэатрам, ці калі ўзнікнуць цікавыя прапановы, вы гатовыя паехаць і паспрабаваць сябе недзе яшчэ?***

— Я па прыродзе сваёй не люблю перамены. Прапановы былі. Але калі падумаю пра тое, што трэба будзе змяніць месца жыхарства, у мяне адразу паніка пачынаецца. Я добра стаўлюся да гастроляў — паехаў, праспяваў, вярнуўся. Але пераязджаць нікуды не хочацца. У мяне тут бацькі, сям'я, сябры. Я не з тых людзей, якія могуць усё прамяняць на нейкія будучыя надзеі. Яны могуць спраўдзіцца, а могуць і не спраўдзіцца. Я ўвогуле не люблю з нуля пачынаць, хоць яшчэ і маладая. Але ўжо маю пэўныя дасягненні тут. Добра стаўлюся да майстар-класаў, калі можна ўзяць нешта для сябе. Але рушыць усё жыццё — не... Праца ў нашым тэатры мяне задавальняе. Я ведаю, што тут змагу расці, праяўляць сябе.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**



***Сёлета ў Беларусі і ў шмат якіх яшчэ краінах-суседках святкуюць 400-годдзе памяці дабравернага князя Канстанціна (у святым хрышчэнні — Васілія) Астрожскага — славутага асветніка і абаронцы праваслаўя.***

# Вяртанне князя Астрожскага

Усё вяртаецца на свае кругі. Гэту спрадвечную праўду сцвярджаюць зоркі, якія праходзяць свой спрадвечны шлях на небе, рэкі, якія праз шмат гадоў ізноў вяртаюцца ў свае рэчышчы, людзі, імёны якіх зноў далучаюцца да сённяшняй грамады.

**Сваіх папярэднікаў мы нярэдка памінаем ва ўспамінах пра мінулае. Князь Астрожскі — з тых, каго сучаснік называе дзеля надзеі на будучае.**

Род Астрожскіх — у пераліку найбольш багатых і знатных родаў былога Вялікага княства Літоўскага. Ад бацькі князю Канстанціну перайшоў абавязак апекі над Праваслаўнай Царквой і яе паствай — у сваіх уладаннях ён заснаваў больш чым 600 цэркваў і 20 манастыроў. Князь не ўзвышаў сябе над простымі людзьмі — трымаўся строгага і пабожнага ладу жыцця, у Вялікі пост апранаўся ў бедную вопратку і аддаляўся ў манастыр, дзе дні і ночы праводзіў у малітвах і роздумах.

Чым жа сучасны славуты наш зямляк для тых, хто жыве ў XXI стагоддзі?

Адказваючы на гэта пытанне, працытую аднаго з галоўных выступоўцаў міжнароднай навукова-багаслоўскай канферэнцыі, якая гэтымі днямі з нагоды 400-годдзя прайшла ў Тураве і Брэсце. Вось як зазначыў прафесар, загадчык кафедры славістыкі Белдзяржуніверсітэта Іван Чарота: «Нават калі князь Астрожскі праявіў бы сябе толькі як абаронца Праваслаўнай Царквы — то і праз гэты ўклад застаўся б назаўжды ў Гісторыі».

Акрамя праваслаўнага падзвіжніцтва, Астрожскі праявіў сябе ў заснаванні школ у Тураве, Слуцку, Львове, Уладзіміры-Валынскім. Заснаваная каля 1576 г. у яго родавым памесці Астрожская школа мела ў сваёй праграме граматыку, рыторыку, дыялектыку, арыфметыку, геаметрыю, астраномію, музыку, філасофію, багаслоўе, грэчаскую і царкоўнаславянскую мовы…

Друкарня, створаная ім у Астрогу, выпускала падручнікі, набажэнцкую літаратуру. У Астрог часта наведваліся вядомыя вучоныя, царкоўныя дзеячы, пісьменнікі.

Астрожская Біблія, якая рыхтавалася і рэдагавалася з удзелам князя Астрожскага, стала першым друкаваным выданнем поўнага біблейскага зводу на тэрыторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Яна былы афіцыйна прызнана Маскоўскім Патрыярхатам і служыла літургічным патрэбам праваслаўнага славянства на працягу многіх стагоддзяў. Пры тыражы каля 1500 экзэмпляраў да нас дайшло больш за 260 асобнікаў Астрожскай Біблії — яны ў залатых фондах бібліятэк многіх краін Еўропы.

Пра ўсё гэта гаварылася на згаданай вышэй міжнароднай канферэнцыі. Удзел у ёй прыняў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Навукоўцы і царкоўныя дзеячы з розных краін абменьваліся ведамі пра асобу дабравернага князя, яго дзейнасць дзеля адзінства Царквы, яго духоўную спадчыну і ўклад ва ўмацаванне дзяржавы.

Гэтымі прыгожымі майскімі днямі мне таксама пашчасціла ўзяць удзел у канферэнцыі — бачыць і слухаць слынных вучоных, якія прысвяцілі сваю дзейнасць вывучэнню жыцця нашага земляка, які з'явіўся на свет у Тураве ў пачатку другой чвэрці XVI стагоддзя.

Своеасаблівым маленькім унёскам у багаты вянок памяці дабравернаму князю стаў вось гэты мой верш, які я прачытаў з трыбуны канферэнцыі падчас падвядзення яе вынікаў.

*Ён вярнуўся у Тураў апоўнач, калі*
*Дваццаць першае спала стагоддзе,*
*Калі Прыпяццю ў цемру*
*ўспаміны плылі,*
*Як чаўны з ціхай плынню у згодзе...*
*Постаць князя*
*у сонечным ззянні была —*
*Ззянні тым, што не гасне спрадвеку —*
*Ёсць Сусветны закон захавання святла*
*Бессмяротнай душой чалавека.*
*А яшчэ ёсць закон — скрозь агонь,*
*скрозь ільды,*
*Для святых і для грэшных адзіны —*
*Адусюль, ад усіх павяртацца туды,*
*Дзе заўсёдна чакае Радзіма...*
*... па-над ім Млечны Шлях, як палескі*
*абрус*
*Успамінам пра роднае цешыць,*
*За табой, светлы княжа,*
*ляжыць Беларусь,*
*Прад табой, Святы княжа, — Вечнасць.*
*Між далёкіх галактык няма рэчкі той,*
*Дзе у хвалі глядзіцца шыпшына...*
*...ўвесь сусвет для цябе стаў*
*адзінай Царквой,*
*Алтаром засталася Айчына.*

# Прывіды музеяў, альбо Самая доўгая ноч з мастацтвам

**Хадзіць у музеі позна вечарам, амаль што ноччу, стала модна. Варта было аднойчы далучыцца да агульнаеўрапейскай акцыі, як цяпер яе штогод чакаюць у нас напярэдадні Міжнароднага дня музеяў.**

У гэты дзень беларускія музеі будуць адкрытыя для наведвальнікаў у самым літаральным сэнсе. 18 мая ў музей можна будзе схадзіць бясплатна. Але свята пачнецца ўжо напярэдадні, запэўніў намеснік міністра культуры Віктар Кураш, калі пачнецца чароўная «Ноч музеяў». Кожны беларускі музей імкнецца зрабіць яе асаблівай. Вось самыя незвычайныя з іх.

У **Нацыянальным мастацкім музеі** да свята з'явіўся новы ўваходны білет, ён будзе надрукаваны тыражом у 80 тысяч экзэмпляраў і стане творам «на вынас» з музея для кожнага наведвальніка. Свой мільён рублёў за яго атрымала Святлана Заскевіч, дызайнер Нацыянальнага банка Беларусі. Яна перамагла ў конкурсе на распрацоўку ўваходнага білета ўжо другі раз — Святлана зрабіла дызайн самага першага білета. Яна ўжо здолела стаць любімым дызайнерам дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Уладзіміра Пракапцова. І калі зыходзіць з думкі, што білет — гэта твор мастацтва, то яна ўжо стварыла дзіптых. Хто ведае, можа, калі-небудзь выстава яе білетаў таксама стане нечаканасцю ў ноч музеяў.

Але сёлета Нацыянальны мастацкі музей наведае прывід... Пабла Пікаса. Ён сам у Беларусі не быў, затое ў калекцыі галоўнага музея краіны ёсць яго творы. 17 мая а палове на восьмую гадзіну вечара адкрыецца выстава **«Кераміка Пабла Пікаса»**. У зборы музея знаходзяцца 38 твораў Пікаса, якія былі створаны ў 1948—1960-я гады: блюды, талеркі, вазы, збаны. Гэта сапраўдныя аўтарскія адбіткі, асобныя прадметы пазначаныя сваім нумарам у тыражы. Ёсць у нас вельмі цікавы твор Пікаса — дэкаратыўнае пано «Жаклін у профіль», дзе адлюстравана апошняя каханая майстра.

Тое, што Беларусь мае гэтыя творы — ужо цуд. Ён адбыўся пры дапамозе вядомай французскай мастачкі Надзі Лежэ, якая сябравала з Пабла Пікаса. У 1967 годзе яна асабіста перадала беларускаму музею 30 твораў Пікаса, а ў 1971-м яшчэ 8. Такая павага да Беларусі тлумачыцца проста: калісьці дзяўчынка Надзея Хадасевіч пакінула сваю радзіму, каб вучыцца мастацтву ў Францыі, стала жонкай вядомага майстра Фернана Лежэ. Але хто яна і адкуль, не забывала ніколі...

У нас свае **«Таямніцы старажытных майстроў»** — сцвярджаюць супрацоўнікі **Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі**. Ноч у іх музеі будзе хіба не самай інтрыгуючай і з 19 гадзін будзе праходзіць па некалькіх этапах. Старажытная кераміка можа натхніць на тое, каб самім паспрабаваць што-небудзь зрабіць. І майстар-керамік дапаможа гэтую мару ажыццявіць. А ва ўнутраным двары музея можна будзе падсілкавацца стравамі старалітоўскага стала. Сіла будзе патрэбна: яшчэ адзін майстар пакажа, як правільна плесці кальчугу — яе нават можна будзе прымераць. Прыгожыя, але вельмі цяжкія кальчугі носяць сапраўдныя рыцары, нашы сучаснікі, якія прыбудуць на турнір.

Яшчэ можна будзе паспрабаваць карыстацца касцяной іголкай, зрабіць копію бранзалета XII стагоддзя, падрыхтаваць батлеечны паказ. Паслухаць музыку старажытнасці і сучасных беларускіх гуртоў і выканаўцаў, якія яе аднаўляюць.

Але, напэўна, больш за ўсё наведвальнікаў чакаецца ў зале № 12. Толькі ў гэты вечар і толькі з 20 да 21 гадзіны можна будзе ўбачыць рарытэт са збору музея, які ніколі і нідзе не дэманстраваўся.

**Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны** аб'ядноўся з **Дзяржаўным літаратурным музеем імя Янкі Купалы і Дзяржаўным музеем гісторыі тэатральнай і музычнай культуры** ў «Ноч музеяў».

На вялікім экране на фасадзе музея Вялікай Айчыннай вайны будзе паказаны відэафільм «Песні Перамогі», акрамя таго, можна будзе пазнаёміцца з калекцыяй рукапісных часопісаў, газет, зброі. У гэты вечар будуць выступаць салісты Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сілаў Беларусі, іншыя калектывы. На пляцоўцы баявой тэхнікі і цяжкай зброі ваеннага часу адбудзецца тэатралізаваны паказ. Госці змогуць нават сфатаграфавацца ў ваеннай форме часоў Вялікай Айчыннай і пакаштаваць салдацкай кашы.

**Культпаход**

**Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры** ў суботу а 18-й гадзіне прапануе пачаць святкаванне 75-годдзя Нацыянальнага вялікага тэатра оперы. У залах музея размесціцца выстава матэрыялаў з фондаў музея і тэатра. Прыйдуць зоркі беларускай оперы — яны рыхтуюць канцэрт з твораў сусветнай класікі.

Кінааматараў чакае **Музей гісторыі беларускага кіно**. У 18.30 і ў 20.20 гадзін тут будзе паказана экранізацыя навелы Гастона Леруа «Прывід оперы» 1943-га і 2004 гадоў. Як жа ноччу без прывідаў?..

Відавочна, што сумаваць у музеях нашай краіны не давядзецца. У Міністэрстве культуры абяцаюць, што да 2010 года 53 музеі перажывуць капітальны рамонт. Яшчэ тры музеі адкрыюцца — у Жабінцы, Жодзіне, Петрыкаве. Акрамя таго, будуць створаны 24 новыя філіялы. Вось тады будзе ноч...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**На здымках:** з нагоды 400-годдзя памяці дабравернага князя Астрожскага ў Тураве адбылося набажэнства, якое прайшло на фундаменце храма XII стагоддзя. У далёкія стагоддзі будынак гэтага храма быў разбураны землятрусам. Міжнародная навукова-багаслоўская канферэнцыя пазнаёміла між сабой навукоўцаў з многіх краін (на фота кандыдат эканамічных навук Уладзімір Кісялёў з Мінска і прафесар Кіеўскай Духоўнай Акадэміі ігумен Нестар). У залах канферэнцыі працавала выстава старажытнага іканапісу з фондаў Брэсцкага музея выратаваных каштоўнасцяў.

Удзельнікі святкавання памяці дабравернага князя па ініцыятыве Брацтва ў гонар святых Віленскіх мучанікаў наведалі ўкраінскі горад Астрог і некалькі старажытных манастыроў. Гэтыя мясціны звязаны з дзейнасцю князя Канстанціна (Васілія). Адначасова ў Мінску праходзіла мастацкая выстава, дзе майстры пазнаёмілі гледачоў са сваім бачаннем асобы дабравернага князя і яго паплечнікаў.

Астрожская Біблія — сведка даўніны, калі духоўным подзвігам князя Астрожскага ўмацоўвалася праваслаўная вера і дзяржава.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

Минский городской центр недвижимости

# Извещение о проведении 29 мая 2008 года

## 73-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет*) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска

| № лота | Адрес, тип помещения, целевое назначение | Арендуемая площадь, кв. м | Начальная цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|
| | **КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска» тел. 285-56-02** | | |
| 1 | ул. Народная, 52, подвал (защитное сооружение) (под непроизводственное – офис) | 35,4 | 590 |
| 2 | ул. Корицкого, 6-4а, подвал (под непроизводственное – офис) | 15,76 | 270 |
| | **КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска» тел. 223-35-03** | | |
| 3 | ул. К. Маркса, 11, ком. 7, помещение в цокольном этаже, имеется естественное освещение, электроосвещение, отопление, санузел совместного пользования, вход совместно с другими арендаторами (под непроизводственное – офис) | 14,42 | 720 |
| 4 | ул. Красноармейская, 32, подвал, требуется ремонт, отсутствуют естественное освещение, отопление, вода, вход через подъезд (под непроизводственное – офис) | 40,14 | 670 |
| 5 | ул. Кирова, 9, убежище, вход через подъезд жилого дома, требуется ремонт помещения с подключением отопительных приборов (под склад) | 136,46 | 2270 |
| 6 | ул. Плеханова, 72, помещение на 2 этаже, требуется ремонт, отсутствует отопление, санузел совместного пользования, вход совместно с другими арендаторами (под магазин непродовольственной группы товаров) | 19,68 | 1000 |
| 7 | ул. Судмалиса, 26, помещение на 1 этаже, требуется ремонт, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, вход через подвал (под непроизводственное – офис) | 19,35 | 320 |
| 8 | ул. Фабричная, 26, помещение на 1 этаже, требуется ремонт, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, вход совместно с другими арендаторами (под непроизводственное – офис) | 25,6 | 430 |
| | **КУП «ЖРЭО Московского района г. Минска» тел. 252-80-63, 207-10-89** | | |
| 9 | ул. Куприянова, 15, нежилое помещение на 1 этаже жилого дома (под склад промышленной группы товаров, кроме товаров бытовой химии и парфюмерно – косметических товаров) | 403,96 | 6700 |
| 10 | ул. Р. Люксембург, 106, защитное сооружение в подвале жилого дома (под склад промышленной группы товаров, кроме товаров бытовой химии и парфюмерно – косметических товаров) | 94,71 | 1580 |
| 11 | пр. газеты «Правда», 20, часть нежилого помещения на 2 этаже отдельно стоящего здания ТОЦ (под оказание таможенных услуг) | 21,13 | 350 |
| | **КУП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» тел. 213-29-60, 224-53-76** | | |
| 12 | ул. Короткевича, 11, помещение на 1 этаже жилого дома (под непроизводственное – офис) | 42,21 | 700 |
| 13 | ул. Короткевича, 11, помещение на 1 этаже жилого дома (под непроизводственное – офис) | 38,35 | 640 |
| | **КУП «ЖРЭО Партизанского района» тел. 294-01-11** | | |
| 14 | ул. Грицевца, 1, помещение на 1 этаже (под непроизводственное – офис, при условии выполнения требований МЧС) | 106,43 | 1770 |
| 15 | ул. Долгобродская, 6, корп. 1, подвальное помещение (под склад, при условии выполнения требований МЧС) | 121,2 | 2020 |
| 16 | ул. Козлова, 14, подвальное помещение (целевое назначение в соответствии с требованиями РУЧС, ЦГиЭ) | 121,7 | 2020 |
| 17 | ул. Первомайская, 18, подвальное помещение (под склад, при условии выполнения требований МЧС) | 37,58 | 630 |
| 18 | ул. Солтыса, 189, место в вестибюле 1 этажа (под пункт подключения сотовой связи при условии выполнения требований МЧС) | 16,0 | 1600 |
| 19 | ул. Холмогорская, 51, в помещении временно хранится арестованное имущество, договор аренды может быть заключен только с даты фактического освобождения от арестованного имущества (под аптеку, склад при условии выполнения требований МЧС) | 307,6 | 5110 |
| | **УП «ЖРЭО Первомайского района» тел. 285-72-92** | | |
| 20 | ул. Козлова, 15, помещение 2Н в проходном подъезде (под торговый объект по реализации непродовольственной группы товаров на одно рабочее место с оборудованием санитарного узла для персонала) | 10,6 | 2000 |
| 21 | ул. Руссиянова, 8, помещение на 2 этаже (под непроизводственное – офис) | 16,77 | 850 |
| | **УП «ЖРЭО Советского района» тел. 292-74-31** | | |
| 22 | ул. Богдановича, 78, отдельно стоящее здание бывшего приемного пункта стеклотары (под непроизводственное – офис, под услуги по ремонту бытовой техники, ФОК) | 91,27 | 1520 |
| 23 | ул. Куйбышева, 75, помещение на 1 этаже жилого дома, вход совместно с жильцами со двора (под непроизводственное – офис) | 27,45 | 460 |
| 24 | пр. Независимости, 44, гараж отдельно стоящий во дворе (под гараж) | 13,6 | 230 |
| | **КУП «ЖРЭО № 1 Фрунзенского района г. Минска» тел. 204-30-46** | | |
| 25 | ул. Дунина-Марцинкевича, 4, кор. 2, помещение на 1 этаже жилого дома, с удобствами (под непроизводственное – офис) | 73,8 | 1230 |
| 26 | ул. Бурдейного, 19, комната в цокольном этаже жилого дома, со всеми удобствами, общий вход и совместный тамбур с жильцами (под непроизводственное – офис) | 15,7 | 780 |
| 27 | ул. Харьковская, 86а, помещение на 1 этаже жилого дома, с удобствами (под непроизводственное – офис) | 118,6 | 1970 |
| 28 | ул. Берута, 14, 1 этаж жилого дома, две комнаты с удобствами, в одной из которых щитовая, общий вход с жильцами (под непроизводственное – офис) | 33,8 | 570 |
| | **КУП «ЖРЭО № 2 Фрунзенского района г. Минска» тел. 253-03-26** | | |
| 29 | ул. Матусевича, 19, две комнаты в подвале жилого дома, общий вход с бытовым помещением производственного участка ЖРЭО (под непроизводственное – офис) | 27,45 | 460 |
| | **КУП «ЖРЭО Центрального района г. Минска» тел. 203-79-43, 203-34-46** | | |
| 30 | ул. Нововиленская, 23, подвал, общий вход с жильцами (под непроизводственное – офис) | 11,26 | 190 |
| | **КУП «Минская спадчина» тел. 226-53-04** | | |
| 31 | пл. Свободы, 2, одна комната в мансарде (под непроизводственное – офис) | 31,73 | 530 |
| | **Главное управление потребительского рынка Мингорисполкома тел. 220-51-34, 219-00-78** | | |
| 32 | ул. Логойский тракт, 34, помещение под объект общественного питания | 665,9 | 11055 |
| 33 | ОТЦ «Столица», площадь Независимости, помещение № 218 (под склад) | 252,3 | 4190 |
| 34 | ОТЦ «Столица», площадь Независимости, помещение № 304 (под парикмахерскую, розничную торговлю непродовольственными товарами) | 190,35 | 3160 |
| 35 | ОТЦ «Столица», площадь Независимости, помещение № 312 (под объект общественного питания) | 1097,85 | 18320 |
| 36 | ОТЦ «Столица», площадь Независимости, часть помещения № 408 (под розничную торговлю непродовольственными товарами) | 181,77 | 3020 |
| | **УП «Минский оптовый рынок» тел. 279-40-79, 279-41-79** | | |
| 37 | 2-й Измайловский пер, 22, помещение склада № 1 (под склад) | 38,5 | 640 |
| 38 | Минский район, р-н дер. Таборы, часть помещения в здании торгового павильона (для размещения торгового автомата по продаже горячих напитков) | 2,0 | 400 |
| 39 | Минский район, р-н дер. Таборы, торговый блок неохлаждаемого складского помещения в здании торгового павильона (для хранения продовольственных товаров и осуществления оптовой торговли) | 117,6 | 2000 |
| 40 | Минский район, р-н дер. Таборы, помещение с естественным освещением в здании склада № 3 (непроизводственное – офис) | 26,88 | 450 |
| | **КУП «БытЭкс» тел. 203-79-66** | | |
| 41 | ул. Ташкентская, 7, помещение на 4 этаже без естественного освещения (под склад) | 8,5 | 150 |
| 42 | ул. Московская, 20, три помещения без естественного освещения: одно помещение в цокольном этаже – 9,8 кв.м, два смежных помещения на втором этаже (под объект общественного питания) | 24,8 | 420 |
| 43 | ул. К. Либкнехта, 102, четыре смешанных помещения с естественным освещением и два помещения без естественного освещения на 1 этаже (под непроизводственное – офис, бытовые услуги по согласованию с балансодержателем) | 33,2 | 560 |
| | **УП «Минскжкоммунтеплосеть» тел. 267-64-02** | | |
| 44 | ул. Захарова, 50, помещения (6 кабинетов) на 2 этаже административного здания, высота потолков более 3 метров (под непроизводственное – офис) | 133,64 | 2220 |
| | **ЖЭУ КУП «УДМС и Б» Мингорисполкома» тел. 200-26-10** | | |
| 45 | ул. Короля, 9, комната № 111 (под непроизводственное – офис) | 21,38 | 1100 |
| 46 | ул. Короля, 9, комната № 116 (под непроизводственное – офис) | 20,81 | 1050 |
| 47 | ул. Короля, 9, комната № 142 (под непроизводственное – офис) | 21,44 | 1100 |
| | **ЖЭФ ОАО «Минскремстрой» тел. 293-05-19, 293-08-31** | | |
| 48 | ул. Андреевская, 4, кабинет № 15 в цокольном этаже общежития № 4 (под непроизводственное – офис) | 27,14 | 1300 |
| | **ОАО «Стройтрест № 1» тел. 294-21-35** | | |
| 49 | ул. Пугачевская, 1, комната № 75 на 2 этаже, телефон не предоставляется (под непроизводственное — офис) | 29,25 | 1400 |
| 50 | ул. Пугачевская, 3, комната № 37 на 3 этаже, телефон не предоставляется (под непроизводственное — офис) | 24,84 | 1250 |
| | **КУП «Минская овощная фабрика» тел. 344-36-82** | | |
| 51 | Минский р-н, п/о Тростенец, открытая площадка (под производственные цели) | 13100 | 217450 |
| 52 | Минский р-н, восточная окраина д. Б. Тростенец, открытая площадка (под производственные цели) | 3000 | 49800 |
| | **Охранно-эксплуатационное КУП «Гаражи, автостоянки и парковки» тел. 252-06-14** | | |
| 53 | ОТЦ «Столица», площадь Независимости, торговый объект № 66 (под торговлю непродовольственными товарами) | 94,5 | 1570 |
| | **УП «Механизированнанная уборка города» тел. 207-20 -59** | | |
| 54 | пер. 2-й Прилукский, 8, нежилое помещение площадью 153,12 кв.м и подсобное помещение площадью 9,46 кв. м в производственном корпусе, требуется ремонт, обязательно участие в благоустройстве прилегающей территории, режим работы: с 8.00 до 17.00, выходные дни: суббота, воскресенье (под склад) | 162,58 | 2700 |
| 55 | пер. 2-й Прилукский, 8, каб. 309, помещение на 3 этаже административно-бытового корпуса (под офис) | 53,55 | 890 |
| | **УП «Минскреклама» тел. 252-87-31** | | |
| 56 | ул. Захарова, 76, специфическое строение (производственное) | 56,0 | 930 |
| 57 | ул. Захарова, 76, столярное отделение № 9а (производственное) | 57,3 | 960 |
| 58 | ул. Захарова, 76, 3-й этаж производственного корпуса (производственное) | 21,5 | 360 |
| 59 | ул. Захарова, 76, подвал административно-производственного корпуса (производственное) | 42,85 | 720 |
| 60 | ул. Захарова, 76, подвальное помещение административно-производственного корпуса к. № 175 (производственное) | 44,5 | 740 |
| | **Не завершенные строительством помещения в составе бизнес-центра (2-я очередь строительства) в «Центре коммерческих связей с гостиничным комплексом» после передачи объекта в хозяйственное ведение КУП «Бизнес-центр «Столица»** | | |
| 61 | пр. Победителей, 59, 9-й этаж (помещения для размещения казино)** | 1690,37 | 28060 |

**В отдельных случаях договор аренды может быть заключен на срок 11 месяцев. При этом Мингорисполком гарантирует победителю аукциона продление заключенного договора аренды в течение пяти лет.*

***Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке после передачи объекта в хозяйственное ведение КУП «Бизнес-центр «Столица»*

**Организатор аукциона (продавец) — КУП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.**

Участник аукциона до начала его проведения должен выяснить у балансодержателя возможность использования помещения под планируемые виды деятельности, в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на расчетный счет 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень и порядок подачи документов определены условиями проведения аукциона, которые **предоставляет участникам торгов организатор аукциона** после публикации извещения в газете «Звязда».

Условия и сроки оплаты: разовый платеж в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке в 30-дневный срок с даты принятия решения Мингорисполкома.

**Аукцион состоится 29 мая 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Документы на участие принимаются по 28 мая 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок (017) 227-40-22, 227-48-36. Интернет: www.mgcn.by.**

*Целевое назначение помещений* определяется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и предусматривает:

- *«непроизводственное целевое использование»* — использование помещений для размещения руководителей, органов управления и контроля юридических лиц и их структурных подразделений, а также специалистов по снабжению и сбыту, финансово-экономических служб, бухгалтерий;
- *«смешанное целевое использование»* — использование помещения одновременно в производственных и непроизводственных целях;
- *«производственное целевое использование»* — использование помещения непосредственно для выпуска продукции, выполнения работ и оказания услуг с размещением на арендуемых площадях рабочих и специалистов, а также для складирования продукции, товаров. К помещениям производственного целевого использования относятся также помещения актовых, спортивных, выставочных залов, подсобные помещения, предназначенные для обслуживания деятельности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (кладовые, раздевалки, умывальники, комнаты для приема пищи), др.

*Порядок определения размеров арендной платы* при сдаче в аренду зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, установлен Указами Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и от 4 августа 2006 г. № 498 «О некоторых вопросах аренды государственного имущества».

*Арендуемая площадь* – площадь, сдаваемая в аренду, размер которой определяется умножением нормируемой площади на коэффициент перевода.

УНП 190398583

Забытае? Новае? Вечнае!

# ЧАМУ ДРУГОМУ НЕ ЗАЎСЁДЫ ШАНЦУЕ

**А. Шых з Навагрудскага раёна задала нам адно надзвычай цікавае пытанне: «Ці можна спраўляць вяселле ў дзень нараджэння маладога ці маладой?»**

Здавалася б, ну што тут такога, калі адно сямейнае свята (вяселле) будзе прымеркавана да другога статуснага раўназначнага сямейнага свята — дня нараджэння чалавека? Святкуй і радуйся — ды і толькі. Але каб адказ на гэта пытанне быў пераканаўчым і карэктным, звернемся да аналізу такіх супадзенняў у народным і хрысціянскім календарах. А перад гэтым удакладнім часавую паслядоўнасць узнікнення святаў, пра якія пытаецца чытачка. Звычайная жыццёвая логіка падказвае: **першым** быў дзень нараджэння чалавека, а ўжо праз нейкі час ладзілася вяселле, адпаведна яно — **другое**.

Мы ўжо неаднаразова звярталіся да пытання надзвычайнага сацыякультурнага статусу **першага** ў нашай традыцыі, пры гэтым пастаянна акцэнтавалі ўвагу на тым, што яно (першае) **прадвызначала, мадэлявала, праграмавала, праецыравала развіццё будучых падзей** па прынцыпе «падобнае выклікае падобнае». Асаблівая ўвага сімволіцы **першага** надаецца ў абрадавай практыцы або ў кантэксце асабліва важных для жыцця чалавека падзей, якія часта ўжо самі па сабе надзяляюцца статусам рытуалу. Прывядзём некалькі прыкладаў. Сярод нашага люду існавала перакананне: **пол будучага дзіцяці прадказвае першае народжанае дзіця. Калі першае слова, якое яно скажа, будзе «мама», то наступнай (другой) народзіцца дзяўчынка, калі ж «тата», то хлопчык. Валасы першага пастрыгу дзіцяці захоўвалі ўсё жыццё, а калі хлопец ішоў у войска або мужчына — на вайну, то на парозе хаты ў яго выстрыгалі пасмачку валасоў і клалі да валасоў першага пастрыгу і, наадварот, пасмачку валасоў першага пастрыгу давалі з сабой — каб чалавек вярнуўся жывым і здаровым і палажыў валасы назад за абраз.**

Як на пачатку жыцця чалавека асабліва важнымі — лёсавызначальнымі — былі першае кармленне, першы зуб, які прарэзаўся з дзясны, першы самастойны крок, першае слова, так і на пачатку навалецця — веснавога сегмента календара — людзі прымяркоўвалі пэўныя рытуальныя дзеянні да першага грому, першай сустрэчы з буслам, першага дажджу, першага кування зязюлі, першай расы, якой пакрывалася зямля, першага выгану хатняй жывёлы на пашу.

Вялікае значэнне надавалася сімволіцы пачатку (першага) і ў шэрагу іншых сямейна-родавых абрадах. У першы дзень будаўніцтва хаты цесляры вязалі толькі першы вянок, пры гэтым першае бервяно клалі туды, дзе будзе чырвоны кут. Важнае значэнне надавалася таму, хто павінен правесці першую ноч у завершанай новабудоўлі, і таму, як сям'я першы раз павінна пераступіць парог роднай хаты.

У навуцы, якая вывучае раннія этапы фарміравання культуры, пашырана думка аб тым, што першае, пачатковае, вылучаецца сярод наступных паўтарэнняў гэтага дзеяння таму, што каля вытокаў — пачатку стварэння свету стаяў Бог або багі, якія адказвалі за тую ці іншую сферу жыццядзейнасці грамадства або існавання навакольля. А павага да продкаў грунтуецца на тым, што якраз яны і былі сведкамі тварэння багоў, таму людзі так моцна трымаліся сваіх традыцый — спадчыны багоў. Адсюль: парушэнне традыцыі прыводзіла да таго, што былі могуць пакараць таго, хто яе не шануе.

Такім чынам дзень нараджэння надзяляўся статусам **першага** ў жыцці чалавека свята.

А цяпер тое, што тычыцца сімволікі **другога**, або *паўтарэння першага*. Давайце ўзгадаем яшчэ адну памежную (будзённа-рытуалізаваную) сітуацыю. Мы з вамі збіраемся ў далёкую дарогу — звычайная побытавая сітуацыя для многіх людзей, якія часта пакідаюць свой дом і адпраўляюцца ў дарогу, напрыклад, тыя ж вадзіцелі шматтонных фургонаў. Аднак для ўсіх нас момант развітання з домам — сітуацыя надзвычай рытуалізаваная. Мы прыселі «на дарожку», закрылі засланку ў печы, форткі, стварылі сферу цэласнасці, замкнёнасці, «абгарадзілі» сябе пры дапамозе спецыяльнай замовы, нарэшце, рушылі ў дарогу. І раптам нехта са спадарожнікаў (ці сам вадзіцель) успомніў — нешта забыўся дома. Трэба абавязкова вяртацца. І тады ў галаву палезуць розныя думкі: хоць бы што ў дарозе не здарылася. Значыць, **другі** ў адрозненне ад першага надзелены негатыўнай характарыстыкай.

Пацвярджэнне гэтаму знаходзім у традыцыях і культурах розных народаў свету. Напрыклад, біблейскія сюжэты сведчаць аб тым, што першым на свеце з'явіўся Адам — бацька ўсяго чалавецтва. Затым ужо з рабрыны Адама была створана Ева. Менавіта яна — другая — стала сімвалам увасаблення зла, грахоўнасці, змееподобнай багіняй.

Аднак біблейская гісторыя сведчыць пра тое, што на гэтым жыццёвыя праблемы Адама толькі пачаліся. Пасля таго, як ён спакусіўся пакаштаваць яблык з Дрэва Пазнання, у іх (першых людзей свету) нарадзіліся два сыны. Старэйшым, або першым, быў Каін, а другім — Авель. Стары Запавет сведчыць, што Авель стаў пастырам авечак, а Каін — земляробам. Праз нейкі час браты прынеслі ахвяру Богу: Каін — у падарунак плады зямлі, а Авель — з першароднага статку свайго. Бог прыняў ахвяру Авеля. Разгневаўся Каін і забіў свайго малодшага брата. Зямное існаванне другога брата аказалася недаўгавечным.

Зразумела, што гэта старазапаветная легенда абапіралася на архаічныя (самыя старажытныя) міфы, у аснове якіх ляжаў культ блізнят. Міфы сцвярджаюць, што адзін з братоў стаў увасабленнем святла, жыцця, моцы, шчасця, а другі, наадварот, — сімвалам зла, бяды, няшчасцяў і хваробаў.

На падставе гэтых міфаў і легендаў у беларусаў сфарміравалася ўяўленне аб тым, што пры нараджэнні блізнят той, хто з'явіўся на свет першым, будзе шчаслівым і здаровым, а другі — нешчаслівым і недаўгавечным. Таму і склалася традыцыя **ні ў якім разе не хрысціць блізнят у адзін дзень і не спраўляць ім вяселлі не тое што ў адзін дзень, але нават у той жа год.** У такім разе першае дзіця хрысцілі на сараковы дзень пасля народзінаў, а другое — у перыяд самых працяглых дзён ад Вялікадня і да Купалля на расту чай фазе Месяца. Пры гэтым нават лічылася: калі ў вёсцы народзяцца блізняты, то гэту вёску абавязкова ў бліжэйшы час напаткае бяда.

Усе тыя факты культуры, пра якія гаворка вялася вышэй, сфарміравалі цэлую сістэму ўяўленняў, якая захоплівае і паўсядзённа-побытавыя, і святочна-абрадавыя аспекты жыццядзейнасці соцыума. Так, лічылася, што **першы прыплод (цяля, жарабя, авечак) ніколі не прадавалі, бо не будзе шчасціць гаспадарцы. Ніколі не пазычайце насенне або расаду гароднінных культур суседзям да таго часу, пакуль самі не пасеялі гэтыя культуры. Не пазычайце грошы ў панядзелак — увесь тыдзень будзеце без грошай, адпаведна, у першы дзень года і на маладзіку.** Затое сярод тых, хто займаецца прыватным бізнэсам існуе правіла (якое зноў-такі абапіраецца на старажытныя ўяўленні і вераванні): **першаму пакупніку трэба зрабіць скідку, тады ўвесь дзень будзе шанцаваць**.

Такім чынам, з усіх нашых разважанняў вынікае простае і зразумелае правіла народнай культуры: **вяселле зусім непажадана прымяркоўваюць да дня нараджэння.** Яно будзе **другім па статусе** і жыццёвай паслядоўнасці святам. А калі так, то шлюб можа аказацца недаўгавечным і нешчаслівым. Можа, таму і нарадзілася прыказка «Дзён у Бога многа», каб людзі прыслухоўваліся да вопыту папярэднікаў і прымалі правільнае рашэнне.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Спорт-тайм

### Без Жаўнова, Кутузава, Калачова...

Галоўны трэнер зборнай Беларусі Бернд Штанге назваў імёны 26 футбалістаў, якія будуць рыхтавацца да таварыскага матча са зборнай Германіі 27 мая ў Кайзерслаўтэрне. Зборная Беларусі збярэцца ў Мінску 19 мая, а на наступны дзень накіруецца ў нямецкі Руйт, дзе цэлы тыдзень і будзе рыхтавацца да спарынгу. На вучэбна-трэніровачны збор выкліканы: варатары — Антон Амельчанка («Масква», Расія), Васіль Хамутоўскі («Карл Цэйс», Германія), Сяргей Верамко (БАТЭ, Барысаў); палявыя ігракі — Ігар Шытаў («Тарпеда», Жодзіна), Ягор Філіпенка («Спартак», Расія), Раман Кірэнкін («Тарпеда», Жодзіна), Кірыл Паўлючак («Дынама», Мінск), Арцём Радзькоў, («Хімкі», Расія), Аляксандр Глеб («Арсенал», Англія), Павел Пласконны («Паніоніс», Грэцыя), Антон Пуціла («Гамбург», Германія), Дзмітрый Лянцэвіч («Багемянс», Прага), Аляксандр Кульчы, Сяргей Амельянчук (абодва — «Растоў», Расія), Арцём Чэлядзінскі, Мікалай Кашэўскі (абодва — «Металург», Украіна), Уладзімір Карыцька («Чарнаморац», Украіна), Максім Рамашчанка («Бурсаспор», Турцыя), Аляксандр Паўлаў («Днепр», Магілёў), Вячаслаў Глеб, Арцём Канцавы (абодвы — МТЗ-РІПА, Мінск), Віталь Булыга («Луч-Энергія», Расія), Андрэй Чухлей («Дынама», Мінск), Сяргей Карніленка («Днепр», Украіна), Віталь Радзівонаў (БАТЭ, Барысаў). Першапачаткова ў спісе было прозвішча Цімафея Калачова, праўда, на наступны дзень з фармуліроўкай «з-за праблем са здароўем» яно знікла. Няма сярод выкліканых на збор Юрыя Жаўнова і Віталя Кутузава, якія зараз траўмаваныя. Сёлета зборная Беларусі правядзе яшчэ некалькі спарынгаў: 2 чэрвеня — у гасцях з Фінляндыяй, 20 жніўня прыме ў Мінску каманду Аргенціны, а 19 лістапада сустрэнецца на выездзе з футбалістамі Кіпра.

### «Барселона» рыхтуецца купіць Кака

Прэзідэнт «Барселоны» Лапорта і савет дырэктараў клуба рыхтуюцца здзейсніць самую гучную здзелку з моманту прыходу Лапорты ў клуб, калі «Барса» перахапіла ў «Манчэстар Юнайтэд» паўабаронцу Раналдзіньё. Пакуль «Мілан» вядзе перамовы з «Барселонай» па пераездзе ў Італію Раналдзіньё і Дзамброты, Лапорта мае намер перакануаць «расанеры» развітацца з бразільскай зоркай Кака. Лапорта гатовы ў абмен на Кака развітацца з Раналдзіньё, Дзамбротай і Дэкай і дваццаццю мільёнамі еўра. У гэтым выпадку бразілец можа стаць самым дарагім іграком у гісторыі футбола.

### За Аршавіна прапануюць 20 мільёнаў

Пасля перамогі расійскага футбольнага клуба «Зеніт» у фінальным розыгрышы Кубка УЕФА трэнер піцерскай каманды Дзік Адвакаат прызнаў, што летам каманду пакіне яе лідар Андрэй Аршавін. Як стала вядома, англійскі клуб «Манчэстар Сіці» гатовы выкласці за Аршавіна 10 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў (каля 20 мільёнаў долараў).

### Шаўчэнка пераходзіць у «Фенербахчэ»

Турэцкая газета «Фотамач» паведаміла аб тым, што стамбульскі футбольны клуб «Фенербахчэ» дамовіўся аб пераходзе ў каманду форварда англійскага «Чэлсі» Андрэя Шаўчэнкі.

# ШАХМАТЫ

***Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА***

**ТВОРЫ ЧЫТАЧОЎ**

Васіль ТУПІК (Брэст)



a b c d e f g h

Выйгрыш. (5+5).

Валерый РАЗІНКІН (Мінск)



a b c d e f g h

Мат за 4 хады. (5+4).

Чакаем вашых адказаў.

**ЧЭМПІЁН — АЛЯКСЕЙ ФЁДАРАЎ**

У пачатку года ў Мінску праходзіў 74-ы чэмпіянат Беларусі па шахматах. Паспяхова выступіў у ім магіляўчанін Аляксей Фёдараў. Набраўшы 9,5 ачка з 13 магчымых, ён стаў чэмпіёнам рэспублікі ў чацвёрты раз. На другім месцы малады гросмайстар з Мінска Сяргей Жыгалка, які адстаў ад чэмпіёна толькі на паўачка. Трэцяе месца дасталася мінчаніну Юрыю Ціханаву — 8,5 ачка. Далей месцы размеркаваліся наступным чынам: К. Ступак — 7,5, С. Азараў — 7,5, Я. Падольчанка — 7, В. Цецераў — 7, П. Ламака — 6,5, В. Раманенка — 6,5, С. Міхайлоўскі — 6,5, А. Жыгалка — 6, І. Люцко — 4, Ю. Барсук — 3, В. Смірноў — 2.

Прыводзім дзве партыі з гэтага чэмпіянату. Трэба адзначыць, што ўдзельнічалі ў ім сем гросмайстраў (!) і амаль усе маладыя шахматысты.

А. Фёдараў — К. Ступак

1. e4 e6 2. d4 d5 3. Kc3 Kc6 4. e5 f6 5. Cb5 Cd7 6. Kf3 a6 7. C:c6 C:c6 8. 0-0 f5? 9. Kg5 Cd7 10. b3 Kh6 11. a4 Kf7 12. Kh3 a5 13. Kf4 g6 14. Kce2 Ch6 15. Ca3 Ld8 16. Cd3 b6 17. Лfd1 Cb7 18. h4 Cf8 19. C:f8 Kp:f8 20. Лac1 c6 21. c4 Ca6 22. Фc3 Kpe7 23. Фd2 Kh6 24. Лc3 Лb8 25. Фc1 Лbc8 26. K:e6 і чорныя здаліся.

С. Жыгалка — Ю. Ціханаў

1. e4 c5 2. Kf3 d6 3. d4 cd 4. K:d4 Kf6 5. Kc3 a6 6. Ce3 e5 7. Kb3 Ce6 8. Фd2 Kbd7 9. 0-0-0 Ce7 10. f4 Лc8 11. f5 Cc4 12. h3 b5 13. g4 b4 14. Kd5 K:e4 15. Фg2 C:d5 16. Л:d5 Kef6 17. Лd1 h6 18. C:a6 Лb8 19. h4 h5 20. g5 Kg4 21. Cg1 Лa8 22. Cb7 Лa2 23. Kpb1 Лa5 24. Фc6 e4 25. K:a5 Ф:a5 26. Лd5 Фd8 27. Cc8 e3 28. Ch2 e2 29. Cf4 0-0 30. C:d7 Фb8 31. Фa6 Фc7 32. Ca4 і чорныя здаліся.

**Вясновыя світанні**

# ХВАРОБЫ, КАХАННЕ І ЗДРАДЫ: СЕЗОННАЕ АБВАСТРЭННЕ

**Цяжка даецца сёлетняя вясна з яе тэмпературнымі перападамі і іншымі выкрунтасамі надвор'я. З усіх бакоў чуваць, як пакутуюць людзі ад галаўнога болю, як скача ціск, рэагуюць суставы і нервовыя канчаткі. Але ёсць яшчэ такая немач, якую цяпер прынята называць «дах паехаў». І ніяк не дае яна аб сабе забыць пры наведванні адной са старонак папулярнай інтэрнэтнай плыні «Ж Ж» — жывога журнала.**

Дык вось на гэтай старонцы, можна сказаць, аб'ядналіся жонкі і палюбоўніцы. Дзяўчаты нібы спаборнічаюць у адкрытасці, непасрэднасці і бессаромнасці, выносячы на свет самыя інтымныя падрабязнасці адносінаў. Агульнага партнёра ідэнтыфікуюць не толькі па нумары тэлефона, марцы машыны, але і па вельмі індывідуальных асаблівасцях, якія праяўляюцца ў спецыфічны момант. Кветачкамі выглядаюць паведамленні палюбоўніц аб тым, у якім рэстаране вячэралі і колькі тая вячэра каштавала. Ва ўдзячнасць за праўдзівую інфармацыю пра расходы сямейных фінансаў жонка папярэджвае сяброўку: «Будзьце асцярожныя, дзяўчына, у яго недалечаныя...» Далей ідзе пералік інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам.

Як тут не падумаеш, што свет з'язджае з глузду? А можа, гэта ўжо нармальная забаўлянка, а мы, пакаленне крыху старэйшае, безнадзейна адстаём? Але ж не. Наведвальнікі блога мужчынскага полу пакідаюць не вельмі прыемныя водгукі. Лідзіруе, мусіць, слова «дурніцы». З мужчынскай салідарнасці, відаць. Але ці варта спачуваць героям тых сюжэтаў, калі ў іх такія жонкі і, тым больш, сяброўкі? Так ім, відаць, і трэба. Мусіць, дарэмна ідэалізавалі сваіх суайчыннікаў каму толькі не лянота — ад аўтараў маналогаў вядомых гумарыстаў да супрацоўнікаў сур'ёзных газет, калі разгарэўся скандал вакол асобы Біла Клінтана з-за Манікі Лявінскі? На ўсіх прасторах былой супердзяржавы насмешліва шкадавалі чужога лідара: вось якія бабы ў іх, не тое што нашы дзяўчаты: ні на допыце, ні пад катаваннямі не выдалі б. Паспяшаліся з высновамі, панове. Аўтаркі электронных дзённікаў, пра якіх гаварылася вышэй, і Моніку маглі б пераплюнуць. Невядома, што тут пераважае: ці недахоп розуму ўсвядоміць адрозненне паміж асабістым сшыткам паненкі і радком у павуціне, які з'яўляецца свайго роду сродкам масавай інфармацыі, ці прага вядомасці, славы для сваёй болей чым сціплай асобы. Хуткасць за ўсё, і адно, і другое. Не ўлічваюць, што гэтыя, на першы погляд, нявінныя нататкі могуць адпомсціць іх стваральнікам.

Як здарылася гэта з рускамоўнай ваеннаслужачай амерыканскай арміі, якая знаходзілася ў Іраку. Дзяўчына забаўлялася вельмі шчырымі разважаннямі пра кампанію, сваіх начальнікаў і абарыгенаў. Яна не шкадавала ні эпітэтаў, ні метафар для старшых па званні. А калі вытрымкі з дзённіка апублікавала газета «Известия», у салдата пачаліся вялікія праблемы. Былая суайчынніца вельмі крыўдавала на расійскае выданне, гаварыла, што яе нататкі асабістыя, яна была ўпэўненая, што саслужыўцы не прачытаюць па-руску. Але крыўдаваць тут няма на што. Як толькі патаемнае і асабістае выносіш у сусветнае павуцінне, значыць, Джына выпускаеш з бутэлькі. Далей ён табе не падпарадкоўваецца. Калі разважанні не прачытаюць начальнікі на тваім асабістым блогу, то інфармацыя з чужой уплывавай газеты хутка стане даступнай начальнікам начальнікаў. У рэшце рэшт разведчыкі ўсяго свету 80 працэнтаў інфармацыі чэрпаюць з адкрытых крыніц.

Дарэчы, аб разведчыках. Адзін з камандзіраў падраздзялення савецкай разведкі ў еўрапейскай краіне жыве цяпер у самым заходнім горадзе нашай рэспублікі. Аднойчы вясной з ім здарылася такая аператыўна-рамантычная гісторыя. Пачалося ўсё яшчэ задоўга да вясны, калі афіцэр прыгледзеў сімпатычную даму з уплывовых колаў і вырашыў яе завербаваць. Яе муж займаў вельмі высокую пасаду, у доме збіраліся важныя людзі, словам, тое, што трэба. І так, і гэтак абходжваў малады аператыўнік жанчыну, а яна ніяк... не дае згоду супрацоўнічаць з разведкай чужой краіны.

У разведчыкаў не прынята пакідаць такія факты без увагі. І многія абыходзяцца вельмі жорстка са сваімі «ахвярамі». Дастаткова ж закінуць куды трэба «дэзу», што ён супрацоўнічае, і ў чалавека кар'ера, калі не жыццё, зламана назаўсёды. Але наш герой быў рамантыкам. І хоць ён у тым не прызнаваўся, відавочна, што жанчына яму падабалася. І ён вырашыў пакараць яе асаблівым чынам. У той дзень, як у доме праходзіў штогадовы вясновы прыём з нагоды дня народзінаў гаспадыні, няўдалы вярбоўшчык купіў аграмадны букет раскошных ружаў. Затым знайшоў самага бруднага і недарэчнага бамжа, даў яму долар і накіраваў па адрасе. А потым уяўляў, як ўвайшоў бамж у ліфт, як ліфт спыніўся на паверсе, дзе праходзіць кактэйль, які канфуз яно зробіць словамі: «Вам букецік, мадам».

Ён і цяпер

# СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.

Праліў паміж Даніяй і Швецыяй

Мяжа паміж гранямі куба

Самы імклівы звер

Святочны феерверк

Пакой у атэлі, гасцініцы

Доўгая (да 30 см) яшчарка

Музычны кіраўнік хору, аркестра

На фотаздымку — народны артыст Беларусі Міхаіл ДРЫНЕЎСКІ.

Вынік працы млынара

Манета ў Старажытнай Грэцыі

Агававая дрэва-расліна

Масавы від мастацтва

Вялікая рака ў Польшчы

Горад на востраве Хонсю ў Японіі

Французскі аўтамабіль

Прадаўцы купля тавараў партыямі

Усхваляваны страсны пафас

Арол і *** — два бакі манеты

Імя-назва паселішча «ад роду»

Жытло вавёркі ці дзятла

Пакаёвая мэбля для адпачынку

Аптэчны работнік

Апарат для насычэння вады $CO_2$

«Джэн ***» — раман Ш. Брантэ

Рака, прыток Ангары

Гармонія ў спалучэнні музычных гукаў

Залатая дзірка

Гара паблізу Сочы

Замкнёная выпуклая крывая лінія

Стрыжань з намаганымі ніткамі

Заключны раздзел музычнага твора

У Стараж. Грэцыі — багіня перамогі

Ласасёвая рыба — заматар быстрай вады

Жоўта-чырвоная фарба для валасоў

Газ, асноўная частка паветра

Нямецкі мастак XV—XVI стст.

Сын Тараса Бульбы (па Гогалю)

Распіна-паразіт з нашых мясцін

Дэпо, стаянка для трамваяў

Даўней: дзяржава вандроўнікаў

Чатырохструнны музычны інструмент

Краіна на Аравійскім паўвостраве

Вечназялёнае кіпарысавае дрэва

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | | | 1 | | | | 2 | | 4 |
| | | | | | | 2 | | 4 | | 1 | |
| | | | | | | 3 | | | 1 | | 3 |
| 3 | | | 4 | | 4 | | | 3 | | 2 | |

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | 4 | | | 5 | | | | 6 | 4 | | 2 |
| 3 | | 1 | | | 4 | 4 | | 2 | | 3 | |
| 4 | 2 | | 6 | 1 | 5 | 1 | | | 6 | 2 | 3 |
| | | | 4 | | | 6 | | | 1 | | |
| | 6 | | 1 | 4 | 3 | | 6 | 5 | | | 1 |
| 1 | 3 | | | | | 3 | | | 2 | | 5 |

**СУДОКУ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ.** Сёння, адгукнуўшыся на пісьмы некаторых чытачоў, мы прапануем некалькі невялікіх галаваломак для дзяцей. Складзены яны па тых жа правілах, што і традыцыйныя (9 на 9) судоку. У адных выкарыстаны лічбы ад 1 да 4 (для малодшых школьнікаў), у іншых – ад 1 да 6 (для крыху старэйшых).

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

## У Шаляў палепшыцца настрой, а Цяльцы заслужаць павагу начальства

**ВАЕН**. У панядзелак новыя знаёмыя могуць занадта актыўна ўмешвацца ў ваша асабістае жыццё — старайцеся трымацца падалей ад такіх людзей. У сераду не згубіце цудоўны шанц умацаваць сваё становішча на кар'ернай лесвіцы. А то і зрабіць пару крокаў уверх.

**ЦЯЛЕЦ**. Пастарайцеся сваё ўменне ісці да мэты спалучаць з назіральнасцю і гібкасцю. Пачатак важнай справы лепш перанесці на сераду. У чацвер можна прыслухацца да парад навакольных. У пятніцу на працы дасягняце цудоўных вынікаў і заслужыце павагу калег і начальства.

**БЛІЗНЯТЫ**. Зможаце станоўча зарэкамендаваць сябе ў сацыуме, праявіцца ярка і арыгінальна. Пры гэтым улічвайце інтарэсы калектыву, у якім працуеце. У гэты перыяд нават дробязь можа аказацца істотнай для вас. У сераду пастарайцеся пазбягаць паспешлівых рашэнняў як у дзелавых пытаннях, так і ў праблемах асабістага характару.

**РАК**. Тыдзень абяцае быць эмацыянальна насычаным і багатым на падзеі. Вашы жаданні будуць мець падтрымку з боку знаёмых і сяброў. Неабходна скарыстацца момантам, каб прадэманстраваць свае таленты. Пастарайцеся быць больш мудрымі, умейце прамаўчаць, хоць гэта і цяжка. Неасцярожнае слова, якое сказана ў пятніцу, можа мець не зусім прыемныя наступствы. Фартуна ўсміхнецца ў самы нечаканы момант.

**ЛЕЎ**. Ваш унутраны свет патрабуе да сябе беражлівых і клапатлівых адносінаў. Узбагаціце яго новымі ўражаннямі і адчуваннямі. Прыслухайцеся да сваёй інтуіцыі і займайцеся толькі тымі праблемамі, на неабходнасць вырашэння якіх яна падкажа. Пастарайцеся не даводзіць да спрэчак адносіны з блізкімі.

**ДЗЕВА**. Колькі свету, поспехаў і цяпла прыняце наступны тыдзень — зоркі не могуць сказаць дакладна, але ведаюць, што вельмі многа. Зарыентавацца ў паўсядзённых клопатах вам дапаможа своечасовая інфармацыя. Пятніца — адзін з самых цудоўных дзён тыдня. Ён тоіць у сабе шмат прыемных сюрпрызаў, выкананне запаветных жаданняў. Але дзеля гэтага давядзецца даведацца пра жаданні блізкіх і рэалізаваць іх.

**ШАЛІ**. Шмат сустрэч, навінаў, паездак па справах. Рэзка палепшыцца настрой, паднімецца тонус, стане значна больш сілаў, якія будуць патрабаваць выхаду. З'явіцца мноства планаў і ідэй. Добры перыяд для пачатку новых спраў: засяродзьцеся на чымсьці адным — і вы не згубіце ўдачу, якая сама ідзе ў рукі.

**СКАРПІЁН**. Каб не згубіць узятага тэмпу, пастарайцеся крытычна аналізаваць прапановы і інфармацыю, якія паступаюць. Будзеце схільныя крыўдзіцца на навакольных, прычым практычна на пустым месцы. У сераду пастарайцеся быць больш пільнымі і не прымаць адказных рашэнняў.

**СТРАЛЕЦ**. Пастарайцеся запланаваць справы так, каб паспець справіцца з усім і нічога не адкладваць на потым. Ва ўсім будзьце больш уважлівыя і практычныя. Пажадана не заключаць рызыкоўных здзелак — шанц на поспех практычна роўны нулю. У суботу чакайце прыемных навінаў.

**КАЗЯРОГ**. Будзе многа работы, таму лепш не распыляцца на дробязі. Вазьміцеся за адну справу і зрабіце яе якасна. Удачу могуць прынесці новыя ідэі і кантакты. Пастарайцеся пазбягаць непатрэбных, пустых сустрэч. Пажадана быць як мага больш незаўважанымі і сціплымі ў вачах начальства, асабліва ў першай палове тыдня.

**ВАДАЛЕЙ**. Тыдзень багатых магчымасцяў і натхняючых перспектыў. Верагодна атрыманне шматабяцальных прапаноў, якія датычацца дзелавога жыцця. Падумайце пра дадатковую крыніцу даходу. На рабоце вашы прапановы адзначыць начальства.

**РЫБЫ**. Усе сітуацыі неабходна ацэньваць максімальна рэалістычна. Старайцеся адэкватна разлічваць сілы, беражыце сябе, бо ў канцы тыдня магчымыя стрэсы і недамаганні. Для дасягнення жаданых мэтаў неабходныя сабранасць і бачнасць сітуацыі ў цэлым.

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

## Яліта

***У чырвоным полі тры скрыжаваныя залатыя дзіды, сярэдняя вастрыём уніз, бакавыя дагары наўкос.***

Гербам ЯЛІТА карысталіся: Барзабагаты, Бельскі, Бяляўскі, Вайцяхоўскі, Васькевіч, Вількашэўскі, Віткоўскі, Вольскі, Вярэйскі, Гарлеўскі, Дабрынскі, Дамбоўскі/Дубоўскі, Драздоўскі, Дуброўскі, Жаромскі, Жураўскі, Завіша, Закрэўскі, Залескі, Зялінскі, Камоцкі, Карытка, Касоўскі, Кахлеўскі, Кафман, Козел, Красоўскі, Літвінскі, Лукоўскі, Макоўскі, Малецкі, Маразевіч, Масальскі, Місевіч, Міхалоўскі, Мнінскі, Мокрскі, Мысліцкі, Нерановіч, Падарэўскі, Паеўскі, Папроцкі, Пячкоўскі, Пячлевіч, Рафальскі, Ромер, Садоўскі, Свярбінскі, Скакоўскі, Славінскі, Слівіцкі, Слупскі, Снітко, Тарлікоўскі, Тарноўскі, Тулоўскі, Франк, Цеканоўскі, Чапскі, Шчарбінскі, Яворскі, Якавіцкі, Яніцкі, Янкевіч, Ясінскі.

## Яніна

***У чырвоным полі блакітны тарк (шчыт).***

Гербам ЯНІНА карысталіся: Антаневіч, Баброўскі, Белабоцкі, Бялецкі, Вайткевіч, Валіцкі, Властоўскі, Вярнікоўскі, Галубіцкі, Галубовіч, Губарэвіч, Губарэвіч-Ратабыльскі, Завадскі, Калачкоўскі, Кашэўскі, Кялчэўскі, Лабецкі, Ленскі, Ліпніцкі, Мацяеўскі, Патоцкі, Пясецкі, Рэчыцкі, Свянціцкі, Сухадольскі, Сяніцкі, Сянкевіч, Тарнаўскі, Турскі, Яворскі, Яноўскі, Ярашэўскі.

## Ясеньчык

***У блакітным полі залаты ключ колцам уніз, а бародкаю дагары.***

Гербам ЯСЕНЬЧЫК карысталіся: Абуховіч, Абухоўскі, Анісовіч, Асавецкі, Багурскі, Бельскі, Бурскі, Варпяхоўскі, Вітоўскі, Жаброўскі, Ждан, Збароўскі, Зброжак, Камёнкак, Карчэўскі, Клімовіч, Клучынскі, Клюкоўскі, Ключэўскі, Краеўскі, Красоўскі, Малькевіч, Міхалоўскі, Міхайлоўскі, Паўловіч, Рудскі, Слухоцкі, Стоцкі, Сускі, Цабрынскі, Яблонскі, Ясінскі.

## Ястрабец

***У блакітным полі залатая падкова гакамі дагары, у ёй залаты крыж кавалерскі.***

Гербам ЯСТРАБЕЦ карысталіся: Абніскі, Абрамовіч, Абрамоўскі, Адамскі, Аліфіровіч, Арлоўскі, Асецкі, Баброўскі, Багдашэўскі, Багуслаўскі, Бараноўскі, Бароўскі, Барташэвіч, Барташэўскі, Барткевіч, Барэйка, Бернатовіч, Богуш, Брадоўскі, Бржазоўскі/Бераозоўскі, Бржастоўскі/Берастоўскі, Бржэскі/Брэскі, Будкевіч, Будны, Будрэвіч, Буйко, Букоўскі, Бурскі, Буткевіч, Бышэўскі, Бялеўскі, Важынскі, Вайцяхоўскі, Вашкоўскі, Венцкі, Віктароўскі, Вітоўскі, Вольскі, Враблеўскі/Ураблеўскі, Врублеўскі/Урублеўскі, Выкоўскі, Вырыкоўскі, Высоцкі, Вышкоўскі, Вянцкевіч, Вяржбіцкі/Вярбіцкі, Гамлікевіч, Гамолка, Гарэцкі, Гілевіч, Глінскі, Грабоўскі, Градзецкі, Гранастайскі, Грудніцкі, Гусоўскі, Гялевіч, Дабравольскі, Дабрасельскі, Дабрынскі, Дамарацкі, Дамашэўскі, Дамбоўскі/Дубоўскі, Дамброўскі/Дуброўскі, Дзенгялеўскі, Дзеражынскі, Дзеружынскі, Драздовіч, Драздоўскі, Дрангоўскі, Ендраеўскі, Жаброўскі, Жагнеўскі, Жалязоўскі, Жарскі, Жывіца, Жылкевіч, Жыткевіч, Завістоўскі, Завітневіч, Завадскі, Загорскі, Зайкоўскі, Закрэўскі, Залескі, Зан, Збарашэўскі, Збароўскі, Здановіч, Зуб, Зубовіч, Зялёнка, Зялінскі, Зяновіч, Кабылінскі, Кавалеўскі, Казлоўскі, Казноўскі, Каменскі, Канарскі, Капярніцкі, Карачэўскі, Карскі, Касцюкевіч, Качынскі, Кваткоўскі, Кібарт, Клімашэўскі, Клішэўскі, Кміта, Козік, Красоўскі, Крашэўскі, Крыжаноўскі, Крэпскі, Кузьміцкі, Кукоўскі, Кулеша, Кухарскі, Кучук, Лабаноўскі, Лабоцкі, Лагяўніцкі, Лазіцкі, Ліхадзіеўскі, Лукомскі, Лукоўскі, Ляўданскі, Ляшчынскі, Мазуркевіч, Маеўскі, Макоўскі, Малевіч, Малеўскі, Манькоўскі, Машукевіч, Мацкевіч, Мацяёўскі, Мілеўскі, Мінакоўскі, Міржынскі, Мітрашэўскі, Міхневіч, Мышкоўскі, Мяжынскі, Навамейскі, Нагорскі, Некрашэвіч, Неміровіч, Несялоўскі, Няміра, Нямыскі, Палубінскі, Паплаўскі, Папроцкі, Парчынскі, Паўлоўскі, Пашкевіч, Пашковіч, Пратасевіч, Прэйс, Пятроўскі, Рагоўскі, Радзецкі, Ражноўскі, Раткевіч, Рачынскі, Руткоўскі, Рудніцкі, Руцкі, Савіцкі, Сакалінскі, Санцэвіч, Сасін, Сахацкі, Свянціцкі, Серафімовіч, Серафіновіч, Скржалускі, Скродскі, Славецкі, Слугоцкі, Смольскі, Стракоўскі, Сумоўскі, Сухорскі, Сяклюцкі, Тажэўскі, Тржцінскі/Траціскі, Фаленскі, Хадаровіч, Хадкевіч, Хаецкі, Харошча, Хілінскі, Чайка, Чайкоўскі, Чамкоўскі, Часлаўскі, Чахоўскі, Чачот, Чэскі, Шакальскі, Шантыр, Шумскі, Шчансновіч, Шчаткоўскі, Шчыт, Юркоўскі, Яворскі, Язерскі, Якубоўскі, Янішэўскі, Янкоўскі, Яноўскі, Ясенскі, Ясінскі, Ястрэмбскі.

**Рубрыку вядзе Ўладзімір КРУКОЎСКІ**

Шык-шок

## Шэдэўральныя пазногці

**Пад эгідай Асацыяцыі цырульнікаў і касметолагаў Беларусі ў Мінску прайшоў І Міжнародны фестываль прыгажосці «Ружа вятроў — NAILS 2008».**

У прафесійным конкурсе нэйл-дызайнераў узялі ўдзел каля 90 намінантаў з Беларусі, Малдовы, Латвіі і Арменіі. Пераможцы былі вызначаны ў такіх намінацыях, як «Мадэляванне пазногцяў па акрылавай тэхналогіі», «Мадэляванне пазногцяў па гелевай тэхналогіі», «Трохмерны дызайн пазногцяў», «Плоскасны дызайн пазногцяў», «Салонны манікюр» і інш. Паводле слоў трэнера зборнай Малдовы Святланы Тамазлыкар, цэнтральнай падзеяй фестывалю стала дэфіле мадэляў мастацкіх конкурсаў з прадстаўленнем вобразу на сцэне: «Гэта было захапляльнае відовішча, якое пакінула незабыўнае ўражанне».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Усміхнёмся!

**— Дарагі, я ўчора да доктара хадзіла, ён сказаў, што ў мяне будзе дзіця. Я вось што думаю: калі я да аўтамеханіка схаджу, у мяне будзе машына?**

Наведвальнік — бармэну:

— Ваша гарэлка проста выдатна разведзеная вадой! Я абавязкова парэкамендую вас знаёмым кілерам...

**— Як можна хлопца вярнуць?**

**— А ў цябе чэк захаваўся?**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПРЫРОДНАЯ АПТЭКА

## Бэзавае лякарства

**Цяжка ўявіць сабе май без квітнеючых кустоў бэзу. Яны ёсць амаль у кожным садзе і палісадніку, скверы і парку. На жаль, цвіце бэз нядоўга, таму спяшайцеся палюбавацца гэтай дзівоснай прыгажосцю, падыхаць п'янлівым водарам, а заадно і запасціся карысным і духмяным лякарствам.**

**Лекавы пластыр**

Даўно вядома, што калі да раны, якая доўга не загойваецца, прыкласці свежае лісце бэзу, то яна хутка пачне зацягвацца і загойвацца. Нават гнайнікі, нарывы і язвы паддаюцца такому простаму лячэнню. А прычына ў тым, што лісце бэзу (ды і ўся расліна) змяшчае вялікую колькасць фітанцыдаў — антымікробных рэчываў, якія здольныя забіваць і затрымліваць развіццё хваробатворных мікраарганізмаў. Вось яны і аказваюць на рану моцнае бактэрыцыднае ўздзеянне. Лісце бэзу дапамагае і пры варыкозным расшырэнні вен, пры трафічных пашкоджаннях скуры. Перад тым як налажыць павязку, лісце трэба крыху памяць.

**Расціркі ад болю**

Калі паспытаць кветкі бэзу на смак, то адчуваецца, што яны горкія. Горкі смак надае ім сірэнгін (разнавіднасць гліказіду). Гэта горыч валодае процізапаленчым і абязбольвальным дзеяннем, дзякуючы чаму бэз выкарыстоўваецца для лячэння артрыту, рэўматызму, адкладаў соляў, неўралгіі. Усе, хто пакутуе ад названых хвароб, ведаюць, што пазбавіцца ад іх няпроста. І каб жыць без пастаяннага моцнага болю, трэба бесперапынна падтрымліваць свой арганізм, у тым ліку і народнымі сродкамі. Вось бэз і з'яўляецца такім выпрабаваным лякарствам ад гэтых хвароб. Кветкі і пупышкі бэзу, настоеныя на гарэлцы, п'юць пры рэўматызме і выкарыстоўваюць для ўціранняў. Мазі, прыгатаваныя з густога адвару пупышак і свінога сала, уціраюць у балючыя месцы пры неўралгіі.

**Прагоніць прастуду**

З суквецця бэзу атрымліваецца выдатная лекавая гарбата. Яна добрая пры любой прастудзе, бранхітах, сухотах. Гарбата з бэзу аказвае патагоннае і проціліханкавае дзеянне, асабліва, калі яе спалучыць, напрыклад, з веткамі ліпы.

**Увага! Прымяняючы лякарствы з бэзу, будзьце асцярожнымі. Як любое моцнадзейнае лякарства, бэз ядавіты. Таму строга прытрымлівайцеся дазіроўкі і абавязкова парайцеся з лекарам.**

**Карысныя рэцэпты**

● Пры бранхітах, катары верхніх дыхальных шляхоў прыгатуйце настой: 1 ст. лыжку кветак бэзу заліце 200 мл кіпеню. Настойвайце 1 гадзіну, працадзіце, прымайце па 30—50 мл 3—4 разы на дзень.

● Пры адкладах соляў у суставах і пятачных шпорах вазьміце 1 шк. бэзавых кветак, заліце 500 мл гарэлкі, настойвайце 10 дзён. Настойку выкарыстоўвайце для кампрэсаў, у тым ліку пры рэўматызме.

● Пры рэўматызме дапамагае і такая мазь: 2 ст. лыжкі кветак бэзу разатрыце з 2 ст. лыжкамі сметанковага масла ці вазеліну. Уцірайце ў балючыя месцы.

● Пры галаўным болі, мігрэні прыкладвайце свежае лісце бэзу да галавы.

● Пры захворваннях вачэй кветкі бэзу заварыце як чай, дайце настояцца 20 хвілін, працадзіце. Намачыце марлевыя тампоны і прыкладзіце да вачэй на 3—5 хвілін. Такія прымочкі добра дапамагаюць пры стомленасці вачэй.

**-2500-**

ПАДКАЗКІ БЫВАЛЫХ

## Падоўжым жыццё кветкам

**Апынуўшыся ў агульнай вазе, адны кветкі лёгка пераносяць вымушанае суседства, іншыя вянуць раней тэрміну.**

Так, напрыклад, ландыш не ладзіць амаль з усімі, аднак некалькі галінак ясноткі падаўжае яго жыццё. Дзякуючы галінцы кіпарысу букет цюльпанаў будзе даўжэй радавацца вока. Мімоза, ружы, лілеі, нарцысы і гваздзікі стаяць намнога даўжэй у адзіноце. Старайцеся не ставіць букет побач з яблыкамі ці грушамі: яны выдзяляюць этылен, які згубна дзейнічае на зрэзаныя кветкі.

ДА ВАШАГА СТАЛА

## Гатуем шчаўе

**Лісце шчаўя, асабліва маладога, мае прыемны кіславаты смак. Яго можна нарыхтаваць у запас у кансерваваным ці высушаным выглядзе, а таксама прыгатаваць многа разнастайных смачных страў — салатаў, баршчу, пюрэ, запяканак. Прапануем некалькі папулярных рэцэптаў.**

**Бацвінне**

*Тры бульбіны, галоўка цыбулі, морква, 100 г шчаўя, некалькі галінак пятрушкі, 5 гарошын чорнага перцу.*

У прыгатаваны загадзя курыны булён пакладзіце бульбу і перац, гатуйце 15 хвілін. Абсмажце дробна парэзаную цыбулю і надзёртую моркву, пакладзіце ў булён, дадайце пятрушку, шчаўе і пагатуйце яшчэ 3—5 хвілін на невялікім агні. Падавайце са смятанай і палавінкамі адвараная яйка.

**Салата «Дачная»**

Нарэжце ў роўнай колькасці шчаўе, лісце зялёнай салаты, зялёную цыбулю, радыску, зеляніну кропу, адвараныя ўкрутую яйкі. Заліце алеем, дадайце чайную лыжку лімоннага соку, соль на смак, перамяшайце.

**Фаршыраваныя яйкі**

Адварыце яйкі ўкрутую, разрэжце на дзве палавінкі ўздоўж. Жаўток разатрыце з прыпушчаным шчаўем, дадайце соль, перац, маянэз ці смятану. Добра перамяшайце і напоўніце палавінкі яек.

ВЫ ПРАСІЛІ РАСКАЗАЦЬ

## Вейкі: максімальны аб'ём

**Доўгія і пушыстыя вейкі робяць наш позірк больш выразным. Як дабіцца такога эфекту пры дапамозе сродкаў сучаснай касметыкі?**

Каб вейкі выглядалі максімальна аб'ёмнымі, перш за ўсё трэба выбраць правільную туш — аб'ёмную, падаўжальную ці тую, якая падкручвае вейкі. Наносіць яе лепш з сярэдзіны павека, пачынаючы ад самых каранёў. Звычайна жанчыны карыстаюцца тушшу толькі з аднаго боку вейкаў, унутранага. А трэба — з абодвух. Таму хвілінку дайце тушы падсохнуць, а затым нанясіце другі слой — дробнымі зігзападобнымі рухамі. Такі спосаб нанясення не дазваляе вейкам зліпацца. Пакуль яны канчаткова не высахлі, расчашыце іх спецыяльнай шчоткачкай. Лепш металічнай, таму што пластмасавая не расчэсвае, а толькі знімае туш.

**-2501-**

# ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

**Падзарадзім мазгі**

Сёння нам дапаможа гэта зрабіць заданне № 6 бліцконкурсу-37 — камбінацыйная праблема Пятра Шклудава (сааўтар М. Грушэўскі):

БЕЛЫЯ: b6, c7, d6, e5, e7, f6, g5, h6 (8). ЧОРНЫЯ: a5, c3, d4, e3, f2, f4, g3, h2, h4 (9). Выйгрыш.

Па-за конкурсам разгледзьце яшчэ некалькі іх сумесных задумак:

№ 1. БЕЛЫЯ: d4, d6, e3, e5, f6, g5, g7, h6 (8). ЧОРНЫЯ: a3, b2, b6, c3, f8, h4 (6).

1. de7 2. gf8 3. fb4 h:f6A 4. h:f8 5. f:a5x. A3... a:c5 4. h:e3 5. e:a7x.

№ 2. БЕЛЫЯ: b6, c5, d4, e3, e5, f6, g5, g7, h6 (9).ЧОРНЫЯ: a3, b2, b4, c3, c7, d8, g3, h4, h8 (9).

1. ba7 2. gf8 3. fb4 h:f6 4. h:f8 5. f8:a3:h2 cd6/de7 6. h:b8 dc7/ed6 7. b:g7 8. ab8x.

№ 3. БЕЛЫЯ: a1, d4, d6, e3, e5, f6, g5, g7, h6 (9). ЧОРНЫЯ: a3, b2, b4, b6, c3, d8, f8, g3, h4 (9).

1. de7 2. gf8 3. a:c7 d:b6A 4. fb4 h:f6B 5. h:f8 6. f:a5x. B4... a:c5 5. h:e1 6. e:a5x. A3... h:f6 4. fb4 a:c5 VP1 5. h:e7x. VP1 4... d:b6 5. h:f8 6. f:a5x.

Пераможцу конкурсу чакае сюрпрыз ад нашага шчодрага чытача Іосіфа Апалінаравіча БУЯКА (в. Бацяны Воранаўскага раёна). Свае адказы накіроўвайце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

**З сшыткаў чытачоў-звяздоўцаў**

А цяпер пазнаёмцеся з кампазіцыямі на 64-клетачнай дошцы і іншых нашых аўтараў:

№ 1 (Барыс і Ілья Вальтэры, Самарканд). БЕЛЫЯ: d2, e5, e7, f4, g3, g5, h2, дамка h4 (8). ЧОРНЫЯ: c5, c7, e3, h6 (4). Замкнуць просцю: gf6 (g5A) g7, e3#. A(c1) fg5, g7, f4, d4/g1, f2 (f4B) hg3, g1#. B(h4) hg3#.

№ 2 (Міхаіл Стэфановіч, Гродна). БЕЛЫЯ: b4, d6, f2, f4, f6, g7, h6 (7). ЧОРНЫЯ: b2, b8, c7, d2, d4, h2, h4 (7). 1. fg5 2. gf8 3. ba5 4. fg3 5. fc5! 6.a:c7 7. h:e7/d8x.



№ 3 (Дзмітрый Камчыцкі, Магілёў). БЕЛЫЯ: d2, e1, e3, f2, f6, g5, g7, h6 (8). ЧОРНЫЯ: b6, c5, d6, f4, g3, h2, h4 (7).

На дошцы — у белых два геаметрычныя квадраты, якія і прыносяць ім поспех. Пераканайцеся ў гэтым самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

**Рашэнні, адказы**

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»- 4: № 12 (М. Грушэўскі). f8 (g7) cd6! (d2A) c7 (b6B) b4 (f6C) f8, a5x. C (c5) e3, a7x. B (f6) b4 (c5 VP1) e7x. VP1 (b6) f8, a5x. A (f6) e7, de7, b4, c1x.

ЗАРАДЗІМ МАЗГІ (бліц-37): № 4 (У. Бандарык). g5, c5 (g1) b6, d8, e7, b4, b2, c3x; № 5 (М. Грушэўскі). f8, b4 (f6 A) f8, a5x. A (c5) e3, a7x.

АЎТАР З УКРАІНЫ: № 1 (У. Рычка). 12-26 (7 A) 40, 24, 23 (48 B) 10-37, 27, 11, 26-21#. B (42) 48, 11, 47, 26, 31, 10-41#. A (12) 35, 11, 49-44, 17, 8, 14-9, 37-10, 20, 36-22, 35, 40, 50#.

АМАТАРАМ СТАКЛЕТАК: № 2 (Л. Вітошкін). 9, 3, 48 (42) 25, 36x.

Папярэднія заданні рашылі: Аляксандра Камінская і А. Рогач (Вілейка), А. Перавознікаў з Рагачова («Пагода ў доме»-4/10 і бліц-37/2), В. Голас (Любань), А. Кіслы (Узда), В. Краўчук і С. Нячаеў (Баранавічы), І. Працук (Паставы), У. Сямашка (Брэст), П. Акуліч, Г. Найдовіч і У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), А. Еўсееў (Бялынічы), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), В. Жукоўскі (г. Барань Аршанскага раёна), І. Козел (в. Махнавічы Мазырскага раёна), настаўнік А. Т. Янчук і яго вучні Віктар Сіўругін і Андрэй Раманюк (Камянец), Марыя Лічко (в. Возера Уздзенскага раёна), А. Камінская («Пагода ў доме»-4/11 і бліц-37/3), У. Сапяжынскі (Рагачоў), М. Трухан (п/а Пагост Салігорскага раёна), В. Ціханенка з Гомеля (бліц-37/3) і інш.

# Чытайце ў наступным нумары

## «Церам-рэстаран» Мікалая Капусты

**Былы шэф-кухар, які асабіста гатаваў Барысу Ельцыну і патрыярху Алексію II, абуладкоўвае ў Беразіно «Церам-рэстаран».**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.03 | 21.10 | 16.07 |
| Віцебск — | 4.47 | 21.06 | 16.19 |
| Магілёў — | 4.53 | 21.00 | 16.07 |
| Гомель — | 4.57 | 20.49 | 15.52 |
| Гродна — | 5.20 | 21.24 | 16.04 |
| Брэст — | 5.28 | 21.17 | 15.49 |

**Месяц**

***Першая квадра.***

***Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

**Імяніны**

***Пр.*** *УЗНЯСЕННЕ ГАСПОДНЯЕ, Пелагеі, Ісака, Кірылы, Мікіты.*

***К.*** *УНЕБАЎШЭСЦЕ ПАНСКАЕ, Веранікі, Веры, Віктара, Славаміра, Фелікса*

## НАДВОР'Е на заўтра




**...у суседзяў**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +19..+21°С | КІЕЎ | +23..+25°С | РЫГА | +10..+12°С |
| ВІЛЬНЮС | +18..+20°С | МАСКВА | +23..+25°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ | +10..+12°С |

Дзве даты

## 17 мая

**1350 год** — нарадзіўся Вітаўт, вялікі князь ВКЛ, князь гродзенскі і трокскі. Увайшоў у гісторыю як адзін з найвыдатнейшых дзеячаў старажытнай беларускай дзяржавы. Праводзіў палітыку цэнтралізацыі і ўмацавання асабістай улады. Вёў актыўную знешнюю палітыку. За час свайго кіравання значна пашырыў тэрыторыю дзяржавы. У Грунвальдскай бітве 1410 года ўзначальваў войска ВКЛ — асноўную сілу ў разгроме крыжакоў. Пры Вітаўце Вялікае княства Літоўскае дасягнула сваёй найбольшай магутнасці.

**1792 год** — на Уол-стрыце ў парку, пад дрэвамі, 24 брокеры заключылі здзелку («Платанавы пакт»), якая паклала пачатак славутай нью-йоркскай біржы.

Цытата дня:

***«Двое мужчын, ашуканыя адной і той жа жанчынай, — крыху сваякі».***

**Альфрэд Капю (1858—1922), французскі пісьменнік.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by; www.zvyazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсцiруецца*)

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.840 Індэкс 63850. Зак. № 2568. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 